Пролетар[illegible], злучайцеся!

Зьвязда

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністы[illegible] Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 302 (3900)
СУБОТА, 27 СЬНЕЖНЯ 1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем чацьвярговай

Москва, Б-ка ВСНХ СССР
янв.-дек. Зьв.-1

Государ[illegible] Библиотека В.С.Н.Х.

Насустрач другой бальшавіцкай вясьне

Веснавая пасеўная кампанія трэцяга году пяцігодкі будзе праводзіцца ў абставінах тых вялізарных сацыяльных і эканамічных зрухаў, якія адбыліся ва ўсёй краіне пралетарскай дыктатуры. Пройдзены этап сацыялістычнага будаўніцтва прывёў да тых вялізарных посьпехаў сусьветнага гістарычнага значэньня, з якімі партыя і рабочая кляса разам з асноўнымі бядняцка-сераднякімі масамі сялянства ўступаюць у пэрыяд завяршэньня пяцігодкі — гэтага грандыёзнага пляну работ па будаўніцтве сацыялізму.

На аснове ажыцьцяўленьня высокіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі, якая здыгрывае вядучую ролю ў разьвіцьці ўсяе народнае гаспадаркі, адбыўся рашаючы паварот асноўных мас працоўнага сялянства да сацыялізму. ПАРТЫЯ ЗА ПЕРШЫЯ ДВА ГАДЫ ПЯЦІГОДКІ ЎСЮ ПЯЦІГАДОВУЮ ПРАГРАМУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПЕРАВЫСІЛА Ў ДВА РАЗЫ. На 1 сьнежня бягучага году, калі лічыць усе раёны СССР і ўсе галіны сельскай гаспадаркі, калгасамі аб'яднана звыш 6,15 мільёнаў сялянскіх гаспадарак, г. зн. 24,1 проц. Процант калектывізацыі ў асноўных збожжавых раёнах дасягае 49,3. Пасеўная плошча калгасаў, што засеяна вясною і ўвосень па ўсходах складала 43,4 млн. гэктараў супроць 20,6 млн. гэктараў, запраектаваных для апошняга году пяцігодкі.

На аснове суцэльнай калектывізацыі з посьпехам ажыцьцяўляецца палітыка ліквідацыі кулацтва, як класы.

Гэтых вялічэзных посьпехаў партыя дабілася толькі дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню сваёй ленінскай генэральнай лініі, у бязьлітасным змаганьні супроць ухілаў ад генэральнай лініі партыі, у першую чаргу супроць права апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць апартуністычных «левакоў» і прымірэнцтва да ўхілаў ад бальшавізму.

Усе гэтыя посьпехі ствараюць моцны грунт для таго, каб у трэцім годзе пяцігодкі яшчэ больш шпаркімі тэмпамі разьвіваць работу па будаўніцтве сацыялізму. Кантрольныя лічбы на 1931 год, прынятыя сьнежаньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), выразна вызначаюць бальшавіцкі план сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Згодна народна-гаспадарчага пляну, на працягу 1931 году на Украіне, Паўночным Каўказе, ніжняй Волзе, Сярэдняй Волзе павінна быць ахоплена калектыўнымі формамі вытворчасьці ня менш 80% бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Для іншых збожжавых раёнаў устаноўлены ахоп калектывізацыі ў 50%, а для спажываючай паласы ў 20-25%. У сярэднім па Савецкім Саюзе па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі ў 1931 ГОДЗЕ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ АХОП КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НЯ МЕНШ 50% УСІХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Ажыцьцяўленьне пляну калектывізацыі, які вызначан на 1931 год, дае абсалютную перавагу сацыялістычным элемэнтаў на вёсцы, што будзе зьяўляцца завяршэньнем перабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім Саюзе.

СЯЎБА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ ЗЬЯВІЦЦА АДНЫМ З ВАЖНЕЙШЫХ І РАШАЮЧЫХ ФАКТАРАЎ У ЗМАГАНЬНІ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ НАМЕЧАНАГА ПЛЯНУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. Таму ў агульнай сыстэме задач, што паўстаюць перад партыйнымі арганізацыямі вёскі ў пэрыяд разгортваньня падрыхтоўкі да сяўбы, галоўнейшай задачай зьяўляецца ўзьняць на яшчэ вышэйшы ўзровень хвалю калгаснага прыліву, мабілізаваць актыўнасьць бядняцка-сераднякіх мас і накіраваць яе на арганізацыю новых калгасаў.

Работа на правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі будзе адбывацца ў абставінах абвостранага клясавага змаганьня пры шалёным супраціўленьні кулацтва сацыялістычнаму наступленьню. Гэта патрабуе бальшавіцкай пільнасьці, яе ўзмоцненага павышэньня з боку кожнай партыйчэйкі, кожнага камуніста. Згуртоўваючы вакол палітычных задач партыі батрацтва, калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў, узьнімаючы іх клясавую сьвядомасьць, партыйныя ячэйкі павінны арганізоўваць іх на ўзмацненьне наступленьня на кулацтва да поўнай яго ліквідацыі як класы на базе суцэльнай калектывізацыі. Нікага паслабленьня ў націску на кулака быць не павінна! Партыя бязьлітасна ў змаганьні з клясавымі ворагамі і з усёй рашучасьцю праводзіць ліквідацыю кулацтва як класы, апошняга аплоту капіталістычных інтэрвэнтаў унутры савецкай краіны. Разам з гэтым, партыя ня раз папярэджвала, папярэджвае і зараз ад якога-б там ні было перанясеньня мер, накіраваных супроць кулака, на серадняка. Па тых, хто дапускаў гэтыя АНТЫСЕРАДНЯЦКІЯ ПЕРАГІБЫ, бальшавіцкая партыя біла і будзе біць самым жорсткім парадкам, бо яны, гэтыя антысерадняцкія, «лявацкія» перагібы граюць на руку кулацтву і яго агентуры ўнутры партыі — правым апартуністам.

Правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў партыі па забесьпячэньні пасьпяховасьці сяўбы будзе суправаджацца нарастаньнем новага калгаснага прыліву. Стаць на чале гэтага прыліву, узьняць яго на яшчэ больш высокую ступень—галоўная задача кожнай парт'ячэйкі. Выкараняючы правы апартуністычный практыкі, даючы адпор ўсякім «самацёчным» настроям, абылякасным і нячуным адносінам да запатрабаваньняў і імкненьняў мас, ячэйкам трэба праз разгортваньне масавай работы і ўмелы паказ калектыўнай працы старых калгасаў вербаваць у рады калгасьнікаў новыя сотні і тысячы беднякоў і сераднякоў. Цалкам і поўнасьцю захоўваючы ленінскі прынцып добраахвотнасьці — усе сілы партарганізацый накіраваць на ажыцьцяўленьне пёзунгу суцэльнай калектывізацыі! Рознага колеру апартуністы імкнуцца гэты баявы пёзунг партыі падмяняць іншымі апартуністычнымі пёзунгамі і ўстаноўкамі. Усякім спробам «падправіць» гэты пёзунг трэба даваць самы бязьлітасны адпор.

Гіганцкі размах тых палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў, якія вызначаны ўрадам БССР *), патрабуе ад усіх мясцовых і адпаведных цэнтральных арганізацый і ўстаноў НЕАДКЛАДНАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ ПАДРЫХТОЎКІ да веснавой сяўбы. Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што на сёньняшні дзень большасьць раённых партарганізацый яшчэ да гэтай работы не прыступіла, яшчэ ня вышла насустрач другой бальшавіцкай вясьне. Сёньня можна паказаць толькі 3-5 партарганізацый, якія ўжо ставілі на абмеркаваньне пытаньні падрыхтоўкі да веснавой с.-г. кампаніі. Ёсьць узоры сапраўды баявой падрыхтоўкі. У Магілеўскім раёне УСЕ КАЛГАСЫ РАФАЛКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ гэтымі днямі абмяркоўвалі пытаньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Усе калгасы гэтага сельсавету (сельсавет калектывізаваны на 31,7%) заключылі паміж сабою сацдагаворы на яе лепшае правядзеньне, узяўшы на сябе рад абавязацельстваў, ажыцьцяўленьне якіх забясьпечыць сапраўды пасьпховае выкананьне намечаных пляноў.

У пастанове СНК БССР у якасьці першачарговага мерапрыемства вызначана давесьці плян пасеўных плошчаў да кожнай савецкай і калектыўнай гаспадарні, паселішча і сялянскага двара не пазьней як да 1 студзеня 1931 году. Аднак, у большасьці партарганізацый раёнаў, у большасьці савецкіх установаў гэта работа амаль зусім не пачата. Гэта патрабуе з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне аб давядзеньні пляноў да мас, аб складаньні пасеўных пляноў калгасаў, сельсаветаў і паселішч.

Адкуль з першачэрговых задач надыходзячай вясны зьяўляецца пашырэньне пасеўнай плошчы яравых культур на 17,4% па рэспубліцы з тым, каб адносная вага пасеўных плошчаў сацыялістычнага сэктару была давядзена да 37% параўнальна з 18% мінулага году. Вакол гэтай канкрэтнай задачы неабходна згуртаваць самыя шырокія масы калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, беднякоў і сераднякоў адзінаасобнікаў. За кошт мэліяраваных плошчаў, раскарчовак, заворкі цаліны і г. д. гэты процант пашырэньня пасеўнай плошчы павінен быць дасягнуты ва што-б там ні стала.

Ссылка насенных фондаў, рамонт с.-г. машын і правільнае разьмеркаваньне тых, якія завозяцца ў БССР, пытаньні правядзеньня аграмінімуму з тым, каб поўнасьцю забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці, пашырэньне плошчы тэхнічных культур — вось вузлавыя пытаньні, якія павінны стаць у парадак дня кожнай партыйнай ячэйкі, у калгасе, саўгасе, у вёсцы. Асобна трэба паказаць на ролю калгасных і саўгасных парт'ячэйкі ў падрыхтоўцы да сяўбы. Калгас і саўгас павінны быць ператвораны ў апорныя пункты партработы на вёсцы і зьяўляюцца тымі асяродкамі, вакол якіх павінна разгортвацца работа па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Калгас і саўгас — прыкладныя ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы. Яны павінны аказаць дапамогу бядняцкім гаспадаркам у часе веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі. Усё гэта накладае на партыйную ячэйку саўгасу і калгасу адказнейшыя палітычныя задачы. Ячэйка толькі тады справіцца з гэтымі задачамі, калі перабудуе сваю работу і стане сапраўдным баявым штабам па разгортваньні калектывізацыі.

Толькі баявыя тэмпы работы парт'ячэек забясьпечаць посьпех у правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі, толькі пры ўмове іх бязьлітаснага змаганьня супроць апартуністычнай практыкі, супроць правага апартунізму, галоўнага на даным этапе, супроць «левакоў» будуць забясьпечаны посьпехі ў падрыхтоўцы да сяўбы. Не марудзячы ні аднаго дня, кожная ячэйка павінна абмяркаваць свае задачы, якія вынікаюць з агульна-палітычных задач партыі. Вышэй бальшавіцкі энтузіязм мас! Шчыльней згуртаваць вакол генэральнай лініі партыі масы батрацтва, беднаты, калгасьнікаў і сераднякоў. Вышэй бальшавіцкую пільнасьць ў змаганьні за генэральную лінію партыі. Разгортваючы баявую бальшавіцкую работу партыйныя арганізацыі, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, выканаюць наказ правадыра партыі тав. Сталіна аб тым, што «ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ СССР ПАВІННА БЫЦЬ У АСНОЎНЫМ ЗАКОНЧАНА».

*) Пастанова СНК БССР аб веснавой пасеўнай кампаніі ад 3 сьнежня апублікавана ў друку ў першай палове сьнежня б. г.

НОВЫ СКЛАД СПА

Пастанова Савету Народных Камісараў СССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

Зацьвердзіць наступны склад Савету Працы і Абароны:

Старшыня тав. В. М. Молатаў (Скрабін).

Намесьнікі старшыні: т. т. В. В. Куйбышаў, А. А. Андрэеў, Я. Э. Рудзутак.

Члены: т. т. І. В. Сталін, Г. К. Арджанікідзе, К. Е. Варашылаў, Я. А. Якаўлеў, Г. Ф. Грынько, А. І. Мікаян, М. І. Калмановіч.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (Скрабін).
Кіраўнік справамі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Савету Працы і Абароны Н. ГАРБУНОЎ.
24 сьнежня 1930 г.
Масква, Крэмль.

ДЗЕНЬНІК

першай менскай агульна-гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі

Вячэрняе пасяджэньне канфэрэнцыі пачалося са спрачэньня па дакладу тав. Гея.

У спрэчках выступаюць наступныя т. т.: Лінц, Гікзбург, Саевіч, Гапаскон, Хаскін, Дзяціна, Шаўкавец, Маклок, Кароль, Кункес.

***

Канфэрэнцыю віталі шматлікія делегацыі рабочых ад менскіх прадпрыемстваў, асьветнікаў і VIII зьезду камунальнікаў.

Тав. Лугоўскі ад імя 2.000 рабочых чырвонасьцяжнай фабрыкі «Кастрычнік» рапартаваў канфэрэнцыі аб барацьбе рабочага калектыву пад кіраўніцтвам партарганізацыі фабрыкі за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ударнага кварталу. Тав. Лугоўскі паведаміў канфэрэнцыю, што прамфінплян асобнага кварталу фабрыка «Кастрычнік» выканала на 5 дзён раней тэрміну. Вялікарныя посьпехі па выкананьні прамфінпляну дасягнуты толькі дзякуючы магутнаму ўздыму актыўнасьці і творчага энтузіязму рабочых, які выліўся ў шырока разгорнутыя вытворчыя мапёўры і прывёў калектыў фабрыкі да новай бліскучай перамогі.

Дэлегацыя камсамольскай і піянэрскай арганізацый фабрыкі «Кастрычнік» запэўніла дэлегатаў партканфэрэнцыі, што камсамол і піянэры, пад кіраўніцтвам партыі, і надалей будуць упарта змагацца за бальшавіцкія тэмпы на выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Потым канфэрэнцыю вітаў тав. Азаркевіч ад чырвонасьцяжнага заводу «Энэргія». Тав. Азаркевіч сваю прамову закончыў наступнымі словамі:

— Завод датэрмінова выканаў заданьне партыі і ўраду, даў краіне прадукцыі на 1.200 тысяч рублёў у асобным квартале. Мы закончылі з прарывам. Рабочым па-бальшавіцку ўзялі мятлу і выпалі з заводзкага апарату апартуністычную погань, якая не давала маладзьвіцці рабочаму калектыву як належыць змагацца за прамфінпляны—апартуністы глушылі рабочую ініцыятыву. Апартуністаў, бюракратаў і людзей, якія баяцца высокіх бальшавіцкіх тэмпаў, мы замянілі рабочымі ад варштату і, пад іх кіраўніцтвам, прыйшлі да новай вялікай перамогі.

Пасьля гэтага канфэрэнцыя заслухала прывітаньні дэлегацый ад друкарні імя Сталіна, ад Беларзяржбуду, ад штотачнай фабрыкі імя Крупскай, ад VIII усебеларускага зьезду камунальнікаў і ад работнікаў асьветы гораду Менску. Выступаўшыя дэлегацыі рапартавалі канфэрэнцыі аб сваіх посьпехах у барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, аб бальшавіцкай падрыхтоўцы да выкананьня плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

З адказным словам ад партканфэрэнцыі па прывітаньні дэлегацый выступіў адказны рэдактар ЦО КП(б)Б газэты «Зьвязда» тав. Будзінскі.

***

Канфэрэнцыя сваю работу будзе праводзіць сёньня з 10 гадзін раніцы з працягам спрэчак па дакладу тав. Гея.

АДПУСКІ—КРУГЛЫ ГОД

Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР

МАСКВА. Рабочыя брыгады пад кіраўніцтвам ЦКК НК РСІ праверылі сыстэму прадастаўленьня водпускаў і ўстанавілі поўную бесплянавасьць у гэтым. Водпускі даваліся бяз уліку неабходнасьці бесьперабойнай працы апарату. Каб упікнуць у будучым падобных зьявішч, прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК РСІ СССР пастанаўляе: водпускі павінны давацца на працягу ўсяго году, з такім разьлікам, каб пачынаючы з 1-га студзеня 1931 году кожны месяц знаходзіўся ў водпуску ў сярэднім 8 проц. усяго складу работнікаў установаў. Адступіць ад гэтага правіла могуць толькі ўстановы зьвязаныя з абслугоўваньнем сэзонных работ. Апрача таго, з прычыны напоўнай падрыхтаванасьці курортаў і дамоў адпачынку да работы на працягу круглага году, водпускі ў летнія месяцы 1931 году могуць давацца кожны месяц 12-15 проц. супрацоўнікаў.

Забараняецца прадаўжэньне водпускаў за кошт нескарыстаньня выхадных дзён; забараняецца і прадастаўленьне водпускаў без захаваньня зарплаты. Адыходзячыя ў водпуск, як правіла, не павінны перадаваць іншым супрацоўнікам незакончаную работу. Кіраўнікі ўстаноў, вінаватых у невыкананьні гэтай пастановы, павінны неадкладна прыцягваць да адказнасьці.

У лютым 1931 году будзе арганізавана масавая праверка плянаў прадастаўленьня водпускаў і фактычнага іх выкананьня. НК РСІ СССР, УССР і БССР даручана на працягу бліжэйшага месяцу зацслухаць даклады адпаведных наркаматаў аховы здароўя аб падрыхтоўцы курортаў і дамоў адпачынку для работы круглы год.

Выказалі з перавышэньнем

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.). Плешчаніцкае раённае спажывецкае таварыства выканала да тэрміну заданьне асобнага кварталу па паянакапленьні на 110 проц., а па ўкладах — на 215 проц.

РАСЬЦЕ

ГАСПАДАРЧЫ РАЗВАЛ У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

„ЛОДЗЬ ПАД ЗНАКАМ КРЫЗІСУ І БЕСПРАЦОЎЯ

Звыш 20 тысяч рабочых павялічылі кадры беспрацоўных

СЕНЬНЯ СПЫНЯЮЦЦА УСЕ ФАБРЫКІ

Новыя звальненьні рабочых у гутах Верхняй Сілезіі"

Вось якімі загалоўкамі стракацяць сёньня старонкі буржуазнай прэсы фашысцкае Польшчы.

Гаспадарчы развал фашысцкае Польшчы пагыбляецца. Беспрацоўе расьце з надзвычайнай хуткасьцю. Кожны дзень закрываюцца ўсё новыя фабрыкі і заводы. Дзесяткі тысяч рабочых амаль кожны дзень выкідваюцца на вуліцу. Нават фашысцкі ўрад ня можа далей утаіць гаспадарчага крызісу, які ўсё больш пагыбляецца. Так, у сваёй праграмнай прамове, сказанай у сойме, міністар фінансаў Матушэўскі прызнае надзвычай цяжкае гаспадарчае становішча фашысцкае Польшчы.

«Газэта Варшэвска» ад 21 сьнежня піша: «Лодзь у гэтым годзе будзе мець вельмі невясёлае сьвята. Калі ў мінулыя гады работнікі мелі два дні сьвята і адзін дзень на новы год, дык зараз будуць «сьвяткаваць» па 2-3 тыдні бесьперапынна. Найвялікшыя фабрыкі Лодзі як Шайблера, Громана закрыліся на тры тыдні, Пазнанскага з 22 сьнежня на 7 студзеня, М. Зільбэрштэйна—ад 22 сьнежня да 3 студзеня, фірма Буле—ад 18 да 7, Данцыгер і спулка — на 7 дзён, фірма Бэніх — на 7 дзён, фірма Гофрыхтэр на неакрэсьлены час, фірма Маркус Кон — на два тыдні, фірма Ляндаў і Вайль — на 7 дзён, фірма Пруськ — на 7 дзён, фірма Стайнэрт — на два тыдні, фірма Эйсэрт — на неакрэсьлены час.

Найвялікшая фабрыка па вырабе ваўняных тканін Швайкерт спыніла працу на неакрэсьлены час.

Спыненьне фабрык выклікана адсутнасьцю рынкаў збыту для тэкстыльных вырабаў. Адна трэцяя частка ўсіх рабочых Лодзі выкінута на вуліцу.

Беспрацоўе расьце ня толькі ў тэкстыльнай прамысловасьці. Сацыял-фашысцкі «Роботнік» падае, што ў найвялікшай фабрыцы чорнавых вырабаў на Памэрыі ў Грудзёндзы, у якой працуе калі 4.000 рабочых, з 20-га сьнежня звольнены ўсе рабочыя. Гэта ўжо трэці выпадак ў Грудзёндзы масавага звальненьня рабочых пасьля выбараў у сойм.

Паводле вестак, рабочыя будуць прымацца зноў на работу, калі фабрыка пагул будзе працаваць, прычым на зусім новых умовах, зарплата будзе зьніжана на 20 проц.

У Верхняй Сілезіі, з прычыны адсутнасьці заказаў, з каляд да 15 студзеня будзе спынена праца ў гуце Пакою, Бісмарка і гуце Фальва. Тысячы рабочых і служачых выкідваюцца на вуліцу.

Орган польскіх сацыял фашыстаў «Роботнік», характарызуючы сучаснае гаспадарчае становішча краіны, піша: «Гаспадарчае становішча пагаршаецца з кожным днём. У тэкстыльнай прамысловасьці ўсё больш рабочых выкідваецца на вуліцу. Пасьля каляд прадбачыцца далейшае звальненьне рабочых у Дамброўскім басэйне і Верхняй Сілезіі. Апрацоўчая прамысловасьць (асабліва мэталёвая) усё больш абмяжоўвае сваю прадукцыю. Вугальная прамысловасьць, якая да гэтага часу сяк-так трымалася, мае зараз тэндэнцыю да зьніжэньня прадукцыі, а не да яе павялічэньня». Далей «Роботнік» усклікае: «Да якіх разьмераў дойдзе беспрацоўе на працягу зімы — ніхто сёньня акрэсьліць ня можа».

Так-ж «Газэта Варшавска» падае, што лічбы беспрацоўных на 13-га сьнежня паводле афіцыйных, значыць праўменшаных, даных дасягнула 246.891 чал. або амаль чвэрці мільёну. Рост беспрацоўя на працягу месяца дасягнуў нязвычайнай вышыні, — звыш 66 тыс.

Характэрнай асаблівасьцю сучаснага росту беспрацоўя зьяўляецца тое, што найбольшы рост яго назіраецца ў чыста прамысловых акругах, як Верхняя Сілезія, Лодзь і інш».

У сувязі з цяжкім эканамічным крызісам і вялізарным ростам беспрацоўя становішча рабочае класы ў фашысцкай Польшчы надзвычай цяжкое. Падаткі-ж на прадметы штодзённага ўжытку, якія ўсё больш і больш павялічваюцца, яшчэ больш пагаршаюць становішча рабочае клясы, галечу працоўных мас. Фашысцкаму ўраду для падрыхтоўкі вайны супроць СССР патрэбны грошы, грошы і грошы. Пры цяперашнім унутраным становішчы калі няма ўпэўненасьці ў заўтрашнім дні заможныя капіталісты не даюць пазыкі Польшчы. Таму фашысцкі ўрад патрэбныя сумы на далейшыя ўзбраеньні выціскае з галадаючых працоўных мас шляхам падатковае шрубы. На працягу толькі апошняга тыдню павялічан акцыз на каробачку запалак на 3½ грошы, праезд на трамваі павялічан да 30 грошай у дзень і да 60 грошай ноччу, павялічана аўтабусная такса, ва ўгоду дамаўласьнікам павялічана таксама кватэрная плата і г. д. І гэта ў той момант, калі мільённыя працоўныя масы паміраюць з голаду, калі кожны тыдзень дзесяткі тысяч рабочых выкідваюцца на вуліцу.

У тым-жа 361 нумары «Газэта Варшавска» скардзіцца на вялізарнае зьмяншэньне спажываньня мяса ў краі. Эндэцкі орган піша далей: «Ня гледзячы на тое, што пролетарыяты колаяльных, [illegible] мяса. Поруч продуктами колаяльнымі, мясо цяжэйшае [illegible] тецкім największym powodzeniem. [illegible] czasem, jak nas informują, w [illegible] nie poczyniono zgoła za[illegible] mięsa. Wszystkie fabryki będą nieczynne począwszy od dnia dzisiejszego, aż do 7. stycznia n. r. Niektó[illegible] gować część swych urzędników, którzy pomogą urzędnikom F. B. zarejestrować wszystkich robotników we właściwym czasie. Wszystkie fabryki będą nieczynne [illegible] 18 dni. Zgodnie z zapowiedzią wszystkie fabryki dały swym robotnikom wy[illegible] mówienia na okres dwóch tygodni. Po[illegible] nieważ wypłata zarobków odbywa się [illegible] Stańczewska [illegible] dzy solowemi nume[illegible] pełnią funkcje [illegible] Nagle około godz. 5 nad ranem [illegible] Nie ma to zgoła żad[illegible] konsekwencji Łódź [illegible] pełnie na święta [illegible] — Rzeźnia jest [illegible] tem sytuacji — [illegible] Mięso wszak jest a[illegible] spożywane jest prz[illegible]

чы на блізкасьць калят — на мясным рынку панує застой. Няма таго навыпнанага эзнатрабаваньня, якое зьвычайна наглядалася ў мінулыя гады перад наступленьнем калядных сьвят.

Далей газэта зазначае, што калі такое вялізарнае зьмяншэньне спажываньня мяса наглядаецца ў Варшаве, дык у іншых гарадох яно зьяўляецца яшчэ больш большым.

Гэта-ж ўсё сьведчыць аб страшэнным зьбядненьні працоўных мас фашысцкай Польшчы.

Трэба адзначыць, што лічба 246.891 беспрацоўных, паданая ўрадавымі статыстычнымі органамі, у сапраўднасьці значна большая, бо ня ўсе беспрацоўныя бяруцца на вучот бюро пасярэдніцтва працы.

І вось зараз «Роботнік» орган сацыял-фашыстоўскай сволачы — ППС патэтычна ўсклікае: «Калі да паданай лічбы беспрацоўных у 246.891 дадаць тысячы беспрацоўных, якія зусім незарэгістраваны і калі ўзяць пад увагу сем'і беспрацоўных, — дык можна сьцьвердзіць, што яшчэ ніколі да гэтага часу ў самыя трудныя для краю пэрыяды ў Польшчы не галадала столькі мільёнаў людзей, як зараз».

Лепшай характарыстыкі сучаснага гаспадарчага развалу фашысцкай Польшчы і ня прыдумаеш. Але орган сацыял-фашыстаў усё гэта піша не для таго, што сапраўды яму блізкі інтарэсы пралетарыяту, што ён сапраўды хоча дапамагчы галадаючым працоўным масам. Апошнае выкрыцьцё міністра фашысцкага ўраду пана Матушэўскага, што ППС для падтрыманьня свайго «прэстыжу» сярод мас рабіла націск на ўрад, каб той адмовіў у асыгнаваньнях на дапамогу беспрацоўным, — выдае з галавою гэтых верных пёсьў буржуазіі, агентаў фашызму.

Яны крычаць аб беспрацоўі, аб голадзе мільённых мас пралетараў, бо бяцуць тэй рэвалюцыйнай хвалі, якая ўзьнімаецца ў фашысцкай Польшчы вышэй і вышэй і падмывае падставы фашысцкай дыктатуры. Вось паслухаем, што кажа адносна гэтага той-жа «Роботнік»: «Наогул у цэлай Польшчы ва ўсіх галінах прамысловасьці і гандлю мільёны бяз працы, бяз харчу, бяз апалу, бяз жадкай надзеі на заўтрашні дзень. Да чаго-ж усё гэта можа давесьці? Што могуць зрабіць галодныя масы, страціўшыя надзею ў заўтрашні дзень?».

Для нас адказ ясны. І перад гэтым—«да чаго можа давесьці мільённыя масы голаду»—і дрыжыць ППС.

С. Ж.

УВЯЗАЦЬ

У АТАКУ ЗА ЛЕН

ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ З ПЕРАВЫБАРАМІ САВЕТАЎ

РАШУЧАЯ БАРАЦЬБА З КУЛАЦТВАМ, З „ЛЕВЫМІ" І ПРАВЫМІ АПАРТУНІСТАМІ—ЗАРУКА ПОСЬПЕХУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

„Лён прапаў, кулакоў у сельсаветах няма"

Загатоўкі ільнавалакна па сыстэме спажывецкай кааперацыі праходзіць нездавальняюча. На 20 сьнежня гадавое заданьне выканана па ільнавалакне на 15,7 проц., а па ільняным семі —на 45,1 проц.

Нізавыя загатоўчыя арганізацыі яшчэ да гэтага часу не пераключыліся на баявое выкананьне пляну. У радзе раёнаў пляны не даведзены да паасобных вёсак, кулацка-заможныя гаспадаркі не атрымалі цьвёрдых заданьняў.

Загатоўшчыкі, асабліва ў раёнах энэргэнсыўнага ільнаводзтва, падыходзяць да загатовак ільну па-гандлярску. Некаторыя кааператары займаюцца разважаньнямі: выгадна ці нявыгадна займацца загатоўкамі ільну ў экстэнсыўных раёнах? Многія раённыя спажыўтаварыствы не вядуць амаль ніякай масавай работы, адсутнічае кантроль над нізоўкай і г. д.

Паасобныя спажыўтаварыствы ня лічаць нават патрэбным даваць весткі аб ходзе загатовак у іх раёнах (Брагін, Парычы, Любань).

Многія райспажыўтаварыствы ідуць па лініі найменшага супраціўленьня. Замест таго, каб узмацняць работу па загатоўках, пішуць акты аб тым, што ў іх раёне ільну няма. Рад сельсаветаў Капінкавіцкага раёну складалі акты, што лён прапаў, што «кулакоў у сельсаветах няма».

На лепш увогуле праходзяць загатоўкі ільнянога семя. У той час, калі ЛЕПЕЛЬСКАЕ РСТ ВЫКАНАЛА ПЛЯН загатовак ільнянога семя НА 116 проц., МЬЦІСЛАЎСКАЕ—на 120 проц., ЧАШНІЦКАЕ—НА 200 проц., КОПЫСКАЕ—НА 100 проц., Круглянскае—на 103 проц.—ёсьць звыш 15 раёнаў, якія на 20 сьнежня ня выканалі і 10 проц. свайго заданьня. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што пляны зусім рэальныя ў тых раёнах, дзе работа па загатоўках пастаўлена сапраўды па-баявому, пляны выканаць нават раней вызначаных тэрмінаў.

Праўленьнем Белкаапсаюзу прыцягнуты да судовай адказнасьці за слабы ход загатовак ільнянога семя праўленьні Чырвона-Слабодзкага, Парыцкага, Стара-Дароскага і Клімавіцкага раённых спажыўтаварыстваў.

Да гэтага часу ўсё яшчэ не ўрэгулявана забесьпячэньне здатчыкаў ільнянога семя прамтаварамі і ільняным маслам. Замест патрэбных 1.000 тон Белхарчтрэст адпусьціў усяго толькі 200 тон.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу нізавыя загатоўчыя арганізацыі аддавалі вельмі мала ўвагі якасьці ільну, які паступіў на склады. Зараз даны дырэктывы аб тым, каб лён прымаўся выключна ў тропаным выглядзе.

Загатоўчыя арганізацыі скардзяцца, што за апошні час у сувязі з правядзеньнем кампаніі па перавыбарах саветаў, увага раённых партыйных і савецкіх арганізацый да загатовак ільну паслабла. Гэты недахоп павінен быць зьнішчаны. Загатоўка ільну павінна быць цесна ўвязана з перавыбарчай кампаніяй.

Ар.

Лён з кулакоў не спагнаны

МАГІЛЕЎ. Плян загатоўкі ільнянога семя па Магілеўскім раёне выкананы на 35 проц. Рад калгасаў за апошні час дабіліся бальшавіцкіх тэмпаў у загатоўках ільнянога семя. Многія з іх выканалі плян на 107 проц. Па-ранейшаму пляцецца ў хвасьце індывідуальны сэктар, які выканаў плян на 31 проц.

Нездавальняюча праходзяць загатоўкі ільнавалакна. Раённы плян выкананы на 11,5 проц. Загатоўчыя арганізацыі ня бедаюць аб ходзе ільназагатовак на мясцох. Сельсаветы безадказна адносяцца да прадстаўленьня вестак.

У шмат якіх мясцох цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак па ільнавалакне яшчэ не спагнаны.

Грамадзкія арганізацыі—у баку

ВУШАЦК. Загатоўка ільнавалакна і семя, а таксама пянькі па Восьвіцкім сельсавеце, Вушацкага раёну, праходзіць недапушчальна марудным тэмпам. Растлумачэньнем работы не вядзецца. Кулацка-заможным гаспадаркам цьвёрдыя заданьні не даны. А калі па справаздачна-перавыбарчым сходзе ў сельсаветчыкаў запыталі: «Чаму», — яны адказалі, «што, і ў іх таксама ільну няма».

Рэзалюцыі на паперы

СТАРОБІНА. Лён, які паступае на загатоўчыя пункты, асабліва ад заможна-кулацкіх гаспадарак, дрэнная якасьці.

Горш за ўсё праходзяць загатоўкі ільну ў кантрактацыі. Былы райпаляводзтаў закантрактаваў 200 гэкт. ільну. Райкаапсаюз лён не спагнане і тлумачыць гэта тым, што кантрактацыйныя дагаворы ім не прапераны.

Па пытаньнях аб ільназагатоўках у раёне праведзены нарады загатоўчых арганізацый. Рэзалюцыі нарад аб узмацненьні тэмпу ільназагатовак пакуль засталіся толькі на паперы.

З 1 студзеня 1931 г. газэта „ЗЬВЯЗДА" будзе выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА ва ўсе дні тыдню
Сьпяшайце здаць падпіску сваячасова

Забясьпечыць Менск дровамі

РАЁНЫ, АБАВЯЗАНЫЯ АДГРУЖАЦЬ ДРОВЫ ДЛЯ МЕНСКУ, НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ДЫРЭКТЫЎ ЦК і ЦКК КП(б)Б

Ня траціць ні аднаго дня

Учора мы паведамлялі, што дырэктыва ЦК і ЦКК КП(б)Б аб узмацненьні адгрузкі дроў для Менску выконваецца марудна. Згодна дырэктывы ЦК і ЦКК з 26 сьнежня МЦРК павінен быў адпускаць рабочым пайшчыкам штодзённа 400 шурак дроў і 60 вагонаў кожны дзень для прамысловасьці, а на справе гэта ня выконваецца.

Замест прывозу 100 вагонаў у дзень, 26 сьнежня атрымана ўсяго 26 вагонаў, з якіх 24 вагоны паступілі са станцыі Піч. Ня г

КРЫВАВЫ ШЛЯХ БЕЛАРУСКІХ

Аўстрыйская манархія, польскі фашызм, белыя расійскія генэралы і крывавы бандыт і прыяцелі беларускіх нацыянал-дэмакратаў—вось сапраўдны твар беларускіх

Дзейнасьць нац.-дэмакратаў раскрыта. Цяпер яны самі прызнаюцца, што рыхтавалі інтэрвэнцыю, а адсюль: рыхтавалі новы разгром гаспадаркі БССР, рыхтавалі шыбеніцы для працоўных, як гэта рабілася імі ў часы грамадзянскай вайны і пазьней.

Друкуемыя газэтай «Зьвязда» матар'ялы і дакуманты аб дзейнасьці Рады г. з. Беларускай Народнай Рэспублікі — БНР — ярка высьвятляюць крывавы шлях, які прайшлі нацыянал-дэмакраты, ярка высьвятляюць і тыя будучыя шляхі, якімі яны зьбіраліся ісьці, падрыхтоўваючы інтэрвэнцыю.

Праглядзім кораценька шлях, які прароблен нацыянал-дэмакратамі, хоць-бы з часу лютаўскай рэвалюцыі, шлях, прыкрываючы нацыянальную маску з нацдэмакратаў і паказваючы іх сапраўдны твар — **твар інтэрвэнта, твар пагромшчыка Булак-Балаховіча.**

Нацдэмы пасьля лютаўскай рэвалюцыі ня кажуць аб «асобнасьці» Беларусі, не патрабуюць аддзяленьня яе ад буржуазнай Расіі. Яны ўскладаюць вялікую надзею на часовы ўрад Расіі. Самая «левая» частка нацыяналістаў, лявізну якіх пажка адрозьніць нават у парэўнаньні з памеркаваньнямі Скірмунтам, які галасамі готых «левых» робіцца старшынём Беларускага Нацыянальнага камітэту, тая «самая «левая» частка нацыяналістаў — Беларуская Гацыялістычная Грамада — на сваёй нарадзе 7 красавіка 1917 году (новы ст.) прыняла рэзалюцыю за падтрыманьне часовага ўраду, як «рэвалюцыйнага ўраду» без якіх-бы там ні было агаворак, выказалася за працяжаньне вайны, як «рэвалюцыйнай вайны супроць нямецкага імпэрыялізму». **Гэта падтрыманьне часовага ўраду было выказана нават без напоміненьня аб Беларусі.**

За працяг вайны... Ці важна для БСГ і ўсіх нацыяналістаў, што ішло руйнаваньне гаспадаркі Беларусі, што паміралі дзеці на руках матак-бежанак, што ў перадмарозных сударагах корчыліся салдаты на палях вайны. Што нац.-дэмакратам да таго, што крывёй і трупамі ўтоплаліся палі, што тапталіся салдаты тысячамі на р. Стаходзе, труціліся газамі, што цягнулися адзін за адным цягнікі з параненымі, з калекамі. Яны клапаціліся аб тым, каб у кішэні капіталістаў плыві тысячы жоўтавых манэтак, каб і далей з крыві і поту пераапрацоўваліся мілярды золата для капіталістаў.

Часовы ўрад добра паказаў свае адносіны да нацыянальнага пытаньня тым, што нават на прыняў пасланую вясной 1917 г. Нацыянальным Камітэтам дэлегацыю да часовага ўраду для перагавораў аб будучыні Беларусі. Няпрыняты ні міністрам-старшынёй, ні міністрам унутраных спраў, дэлегаты зьвярнуліся да Керанскага, які быў у той час міністрам юстыцыі. Але і апошні адмовіў у прыёме і пераслаў праз «чыноўніка асобных даручэньняў», што прымае ня можа, бо гэта падкрэсьлівае-б нібы самастойнасьць, роўнасьць беларускага боку, а што датычыць Беларусі, то гэта функцыя Ўстаноўчага Збору.

Ня гледзячы на гэта, **Цьвікевіч, а за ім і іншыя нацыяналісты,** на зьезьдзе прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый (Менск, 8-10 лістапада) толькі апраўдваюцца, што «сепаратызму ў беларусаў няма, мы хочам толькі **дапамагчы Расіі... каб Расія была моцнаю, патрэбна толькі тэрытарыяльна гас падарчая аўтаномія...»** («Вольная Беларусь» № 10 за 17 г.). Цьвікевіч нават Раду Беларускую лічыць непатрэбнай установай:

«Беларускай Рады быць ня можа, бо мы заўсёды бедны сіламі. З Украінай нас раўняць нельга... нельга захоплівацъ законадаўчых функцыяў». (там-жа).

Калі Расія буржуазная, то нац.-дэмакраты кланяцца, каб «Расія была моцнаю». Яны ведалі, што буржуазны ўрад іх самых не пакрыўдзіць, а аб усёй беларускай нацыі яны не зсаблива турбаваліся.

Толькі рабочая клясе не спадзявалася на часовы ўрад. І калі беларускія нацыяналісты красавік 17 г. адзначаюць, як дату, калі сабраліся яны на ская дружына, 6 Таўрогенскі полк, 48 і асобныя групы, фракцыі і г. д.

свой першы зьезд, то беларускія рабочыя, сумесна з рабочымі іншых нацыянальнасьцяй б. Расіі, адзначаюць гэты месяц, як дату, калі прыехаў у Расію той, хто паказаў сапраўдны, адзіны шлях для пралетарыяту і сялянства, шлях пралетарскай рэвалюцыі — **прыезд У. І. ЛЕНІНА.**

Не спадзявалася на часовы ўрад і рабочая кляса Беларусі. Менскі Савет Рабочых і Салдацкіх дэпутатаў, пад кіраўніцтвам Менскай бальшавіцкай арганізацыі, такіх выдатных бальшавікоў, **як Мясьнікоў, Міхайлаў-Фрунзэ** і інш., робіцца сапраўдным арганізатарам мас Беларусі і Заходняга фронту. Па загаду Менскага савету **ня ідуць** арміі Заходняга фронту выконваць загад Керанскага аб наступленьні ў чэрвені м-цы; па загаду Менскага-ж Савету **ідуць** гэтыя арміі супроць контр-рэвалюцыйнага выступленьня Карнілава. Масы адчувалі, дзе праўда. І хоць бальшавікі пры выбарах ва Ўстаноўчы Збор не абяцалі адначынку, а клікалі на барацьбу, але-ж барацьбу за свае клясавыя інтарэсы, яны атрымалі на менскім выборчым вучастку больш 70 проц. усіх галасоў і на Заходнім фронце амаль столькі-ж.

А нацыяналісты, ня гледзячы на вялікую падрыхтоўчую працу, атрымалі па Менскім вучастку ўсяго **0,3 проц. усіх галасоў,** г. б. супроць 570.087 галасоў, паданых за бальшавікоў, т. зн. «беларускі блёк» атрымаў 2.988 галасоў.

Кастрычнік. Улада ў руках бальшавікоў. Выконваецца тое, што заказвана: зямля сялянам, заводы — рабочым, мір. Выдаецца дэкларацыя аб праве нацый на самавызначэньне і г. д.

Але зусім не «самавызначэньне» патрэбна для нац.-дэмакратаў! Калі Расія зрабілася Савецкай, сучасныя нац.-дэмакраты пачалі патрабаваць поўнага аддзяленьня ад РСФСР для стварэньня буржуазнай Беларусі. Але выбары ва Ўстаноўчы Збор паказалі нацдэмам, што масы ня з імі, а таму патрэбна яшчэ маскіроўка. Вось чаму мы вельмі часта сустракаем, што ў тыя часы нацыяналісты Раду называюць «Беларускім Саветам». Яны перад масамі згадваюцца на Савецкую ўладу, але... на беларускую Савецкую ўладу, што азначала ў той час Саветы замяніць буржуазна-памеркаваньскай Радай.

Пабоч з такой «маскіроўкай» перад масамі, Рада пры дапамозе **Пятлюры,** які ў той час вёў вайну з РСФСР, стварае для барацьбы з бальшавікамі беларускую армію на Румынскім фронце. Беларусізуецца 357 віцебская і 401 Менскі полк, цалкам 4 арм. корпус у складзе 30 і 40 дывізій. Назначаецца «беларускі» генэрал-майор Кажарскі камандзірам «беларускіх часьцей». (Загады №№ 1332, 1336, 1399, 1407 па Румынск. фронце).

У Менску працуе Вайсковая Рада пад кіраўніцтвам ген. Кандратовіча і падпаручыка Езавітава, зробленага адным загадам палкоўнікам. Арганізуецца «1 беларускі полк» у Менску, аказваецца дапамога пры арганізацыі легіянэраў Доўбар-Мусьніцкага.

І побач са злобным шыпеньнем **Лёсіка** ў сваёй газэты **«Вольная Беларусь»** наконт «анархіі, нялоўтаемчасьці» і г. д. бальшавікоў, выпускаецца адозва да сялян, у якой абяцаецца зямля бяз выкупу, вольнасьць, грамадзкія свободы і г. д. Вядома, гэта лёгка было рабіць, бо зямлю селяніны ўсё роўна ўжо забралі!

У процівагу абласным зьездам Рабочых і сялянскіх дэпутатаў, сялянскаму зьезду, які стаў на пункт погляду бальшавікоў, франтавому зьезду салдат Заходняга фронту — у процівагу ім зьбіраецца «Усебеларускі кангрэс», які, па выражэньні т. **Кнорына,** нікога не прадстаўляў, акрамя саміх сябе [1]). А калі

[1]) Трэба разьбіць байкі нац.-дэмакратаў аб нейкіх 1.800 дэлегатах гэтага кангрэсу. У гэты лік залічаны і такія дэлегацыі, які Віцебская, Магілеўская і іншыя, якія па даручэньні губэзьедаў заявіліся на кангрэс, **каб перадаць дэклярацыі аб няпрызнаньні правамоцтва кангрэсу,** і пасьля гэтага пакінулі яго. Гэта пацьвярджаецца заявай Віцебскай дэлегацыі на 3 Усерасійскім зьезьдзе Саветаў. А Віцебская і інш дэлегацыі складалі некалькі соцень чалавек. Пакідалі зьезд

Цалуючы бот Вільгельму і Пілсудзкаму, валяючыся ў нагах фашысцкіх урадаў, нацдэмы ўмалялі інтэрвэнтаў аб дапамозе, каб задушыць маладую Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку

за свой контр-рэвалюцыйны напрамак гэты зьезд быў распушчан 18 сьнежня 1917 г. (ст. стыль) Савецкай уладай, то «дэлегаты зьезду» выпускаюць адозву, у якой пішуць:

«... зьезд быў разогнан пасьля таго, як ухваліў перадаць уладу Радзе Рабочых, Сялянскіх і Салдацкіх дэпутатаў-беларусоў»...
(«Вольная Беларусь»).

Выходзіць, і яны за Савецкую ўладу. Чаго-ж «разагналі» бальшавікі зьезд?

Паглядзім на праект, які рыхтаваўся быць прынятым, як нешта падобнае на канстытуцыю БНР:

Глава 3. Аб складзе Рады.

§ 13. Вемскія самаўпраўленьні пасылаюць па 10 прадстаўнікоў у Раду рэспублікі.

§ 14. Гарадзкія самаўпраўленьні (г. ё. гарадзкія думы А. З.) па 10 прадстаўнікоў.

§ 15. Менскаму праваслаўнаму брацтву даецца права паслаць 10 прадстаўнікоў.

§ 16. Менскай хрысьціянскай дэмакратычнай злучнасьці — 4 прадстаўнікі.

§ 17. Усебеларускі зьезд праваслаўнага духавенства — 4.

§ 18. Рымска-каталіцкія катэдральныя капітулы — кожная па 1.

§ 19. Польская «Рада земі Мінскай» — 5.

§ 20. Яўрэйская абшчына — 7.

§ 21. Гандлёва-прамысловыя арганізацыі — 3.

§ 22. Зямляўласьнікі — 3.

§ 23. Сельска-гаспадарчы зьезд — 3 і г. д.

Гэта ў той час, як «работніцка-прафэсыянальны хаўрус пасылае трох прадстаўнікоў» ды чыгуначнікі — 3.

Вось дык «савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў»: каля 25 напоў і 5-6 рабочых.

Так сучасныя нацдэмы імкнуліся працягнуць над сьцягам «Саветаў» буржуазную раду. Відома, гэта яны праводзілі да таго часу, пакуль не атрымалі палмацаваньне ў выглядзе ўзброенай сілы.

А такая ўзброеная сіла насоўвалася на маладую Савецкую рэспубліку: немцы. Закапашыліся беларускія нацыяналісты, больш проста выступілі беларускія легіёны Доўбар-Мусьніцкага. **Беларускія нацыяналісты ўсімі сродкамі дапамагаюць легіянэрам Доўбар-Мусьніцкага,** ня гледзячы на тое, што апошнія ня лічыліся з Радай.

Ня лічыліся і нямецкія акупанты з Радай. Натрабавалася немцам намяшканьне для музычнай каманды — яны не знайшлі ва ўсім Менску нідзе іншага памяшканьня, а выкінулі «Народны Сакратарыят Вышэйшай Рады БНР» з яго памяшканьня і занялі яго пад каманду; на просьбу рэгуляваць справы мясцовага насельніцтва ў згодзе з Радай, было адказана па-нямецку коратка:

«На аснове згоды, заключанай 18 кастрычніка 1907 году, якая датычыцца законаў і звычаяў сухапутнай вайны, законная ўлада належыць у занятай нямецкім войскам вобласьці нямецкаму вайсковаму камандванню. 19-IV—1918 году **Кельлер».**

Але ці ў гэтым справа? Лепш лізаць боты нямецкаму ці польскаму генэралу, чым адмовіцца ад барацьбы з бальшавікамі. Вось чым тлумачыцца такая паслухмянасьць Беларускай Рады, якой прыходзілася нават камэндант гораду запрашваць: «Просім адказаць, калі можна прыслаць да Вас трэцюю ўстаўную грамату Рады БНР» (архіў БНР, № 232), гэта значыць, тую ўстаўную грамату, у якой абвяшчалася незалежнасьць БНР!

Немцы глядзелі на Украіну, Беларусь і г. д., як на рэзэрвуар, з якога можна было «выпампоўваць» усё неабходнае для далейшай барацьбы супроць французаў, анэльцаў і інш. Калі акупанты і казалі што-небудзь аб аўтаноміі, калі і дазваллялі адкрываць пізавыя школы на беларускай мове і нават самі дапамагалі выпускаць газэту «Гоман», то толькі для таго, каб хоць чым-небудзь замаскаваць адкрытае грабежніцтва. У гэты час немцы на трацілі дарма часу: рэквізавалі хлеб, жывёлу; палілі і расстрэльвалі вёскі; расстрэльвалі, катавалі сялян; вывозілі з фабрык і заводаў усё, што можна было скарыстаць у Нямеччыне, што можна было пераплавіць на патроны і кулі; гналі чыгуначныя вагоны і паравозы на Захад. Што і ня было вывезена, то ні ў якім разе не па віне нямецкай арміі ці Беларускай Рады, а па віне тых рабочых, якія баставалі, спынялі фабрыкі, чыгункі; па віне сялян, якія заганялі коней у лясы, каб ня даць іх скарыстаць. Калі па загаду немцаў і пракладваліся ўсё тымі-ж сялянамі шляхі, дык толькі такія, якія патрэбны былі немцам для вывазу ўсяго награбленага.

Беларускую раду мала цікавіць гэтае грабежніцтва Беларусі. За ўсё гэта яны пасылаюць **Вільгельму прывітальную тэлеграму з падзякай** «за аслабленьне Беларусі ад анархіі бальшавікоў». Не бяз іх удзелу быў выдан загад аб **«вастанаўленьні прыватнай уласнасьці на зямлю».** І, ня гледзячы на свае дэклярацыі пры Савецкай уладзе аб дармовай перадачы зямлі сялянам, мы дарэмна будзем шукаць хоць-бы радка пратэсту супроць гэтага загаду. Мы бачым адваротнае: гэты загад надпісваецца, напрыклад, па Полацку, членам Рады. І зноў фабрыкі і памешчыцкія маёнткі перадаюцца фабрыкантам і памешчыкам.

Рада таксама паказвае свой сапраўдны твар: снідаецца, вядома не перад масамі, усё, што прышлося нацяпуць на сябе пры Савецкай уладзе. **Радаўцы завязваюць зносіны з Украінскай Радай,** куды пасылаецца дэлегацыя і просіцца пазыка хоць у 150 тысяч рублёў; **завязваюцца зносіны з часовым урадам Паўднёва-усходняга саюзу,** з гэтым зборам усіх генэралаў, пачынаючы з Каледзіна і канчаючы Дзянікіным, і тут просіцца пазыка ў 5 мільёнаў рублёў.

Але Ластоўскія, Цьвікевічы і іншыя радаўцы зусім раскрываюць свае дзяржаўныя ідэалы ў мэмарандуме да «Яго Апостальскай Вялікасьці, Імпэратара Аўстра-Вэнгерскай Імпэрыі»:

«... Беларусь заўсёды глядзела і глядзіць на Аўстрыю, як на вялікую Славянскую Манархію, у якой жыцьцё славян выражаецца ў найбольш падыходзячай форме і знаходзіць сваё нацыянальнае прызнаньне...» (Архіў БНР).

Вось ідэал: манархія, як «найбольш падыходзячая форма»! Дарэмна мы лічым Цьвікевічаў і іншых дэмакратамі. **Іх ідэал — манархія!** А гэта пішацца праз паўгода пасьля таго, як радаўцы называлі сябе «Беларускімі Саветамі Рабочых і Сялянскіх Дэпутатаў»!

Ня гледзячы на ўсе патугі, нац.-дэмакраты свой ідэал не змагли ажыцьцявіць: сіла была за тымі, хто ў той час быў у падполлі. Моцны ўдым пралетарыяту Нямеччыны, які скінуў Вільгельма, Чырвоная армія, рэвалюцыйна-забастовачны рух і выступленьні пралетарыяту Беларусі і Літвы, паўстаньні сялянства — усё гэта прымусіла нямецкую армію ачысьціць тэрыторыю Беларусі.

Рада кідаецца на ўсе бакі, каб затрымаць яшчэ і надалей акупацыю. Яна зварачаецца да «Гаспадзіна Імпэрскага Канцлера Нямеччыны» з просьбай прызнаць БНР, бо «няпрызнаньне БНР павінна пацягнуць за сабой вывад нямецкіх войск з Беларусі... заставіць яе зусім бездапаможнай, бясьсільнай прадухіліць анархію, якая насоўваецца з Усходу». І Рада просіць пакінуць яшчэ і надалей нямецкае войска да таго часу, пакуль яна «арганізуе ўзброеную сілу» (Архіў БНР).

Усё-ж немцы эвакуіруюцца. Яшчэ да прыходу Чырвоных войск рабочыя і сяляне, пад кіраўніцтвам падпольнай КПЛіБ, пачынаюць будаваць Савецкую ўладу. Выбіраюцца спачатку падпольна, а пасьля і легальна, Саветы Рабочых Дэпутатаў. Арганізуюцца вайсковыя рэвалюцыйныя камітэты. Шляхам забастовак, шляхам арганізацыі Чырвонай гвардыі ці рабочай міліцыі, арганізацыі паўстанцкіх атрадаў вымушаюць немцаў перадаваць уладу ў рукі Саветаў, а калі немцы не згаджаюцца — самі яе захопліваюць. Абвяшчаюцца Літва, Латвія, Эстонія, Беларусь краінамі савецкімі. Чырвоная армія ўцягвае ў сябе атрады чырвонагвардзейцаў і паўстанцаў і замацоўвае сваёй зброяй дасягненьні мясцовых рабочых і сялян у адбудаваньні Савецкай улады.

У гэты час, калі зрываецца стаўка на працяг нямецкай акупацыі, нац.-дэмакраты пачынаюць шукаць падтрыманьня з боку іншых дзяржаў. Высадка французкага дэсанту ў Адэсе дае магчымасьць ускласьці надзеі **на дапамогу Францыі.** Прадстаўнік БНР у Адэсе **С. Некрашэвіч** (віцэ-прэзыдэнт Беларускага Нацыянальнага Цэнтру) зварачаецца, вядома, не бяз згоды іншых членаў цэнтру, як, напр., — Баліцкага і Адамовіча А., да генэрала Бартэлё (галоўнакамандуючы арміямі «саюзьнікаў» на поўдні Расіі) з прывітаньнем і надзеяй «хуткага звальненьня ад гвалту бальшавікоў». Некрашэвіч паведамляе генэрала, што мэты Беларускага Нацыянальнага Цэнтру, як і добраахвотнай арміі, ёсьць арганізацыя і беларускай арміі для барацьбы з бальшавікамі. Далей, напомніўшы генэралу аб арганізацыі, пры дапамозе Дзянікіна і «высокім загадам французкай арміі», беларускіх узброеных сіл, Некрашэвіч просіць далейшай дапамогі ў арганізацыі і перакідцы войск у Беларусь, дапамогі грашыма, зброяй, арганізацыяй баз. **І, нарэшце, запрашае на Беларусь хоць-бы ў «невялічкім ліку французкае войска..., каб паказаць беларускаму народу сілу нашага аб'яднаньня».** (Адэса, 13 студзеня, 1919 г. Архіў БНР.).

Гэта пісалася ўжо пасьля абвяшчэньня незалежнай БССР (1 студзеня 1919 году), калі рабочыя і сяляне пачалі будаваць сапраўды незалежную Беларускую Савецкую Рэспубліку.

Але асабліва паказальным зьяўляецца наступнае месца ў тым-жа звароце Некрашэвіча да генэрала Бартэлё:

«Ведаючы, што без магутнай дапамогі Францыі, мы ня здолеем ніколі прыйсьці да канца гэтай цяжкай задачы, якая наложана на нас нашымі абавязкамі ў адносінах да будучай адбудаванай Расіі, цяпеража кіруемай незаконнай уладай, і ў адносінах да Беларусі, як яе аўтаномнай часткі...» (Там-жа).

Зноў, у 1919 годзе Некрашэвіч пацьвярджае словы А. Цьвікевіча, сказаныя ім у 1917 годзе: **калі справа дайходзіць да «адбудаванай» францускім генэралам Расіі, то галоўнейшыя абавязкі — гэта Расія, а ў другую чаргу — Беларусь, ЯК АЎТАНОМНАЯ ЧАСТКА РАСІІ. Толькі капі Расія зьяўляецца савецкай, то патрабуецца поўнае аддзяленьне Беларусі.**

Тут мы яшчэ раз бачым, ці дабіваліся нац.-дэмакраты самастойнасьці Беларусі. Не, ім патрэбна была не незалежная Беларусь, а яны кіраваліся мэтай барацьбы з бальшавікамі, ім патрэбен быў моцны кулак, які-б так «паказаў беларускаму народу сілу іх аб'яднаньня» з капіталістамі розных краін, **каб беларускі народ надоўга адмовіўся ад падтрыманьня бальшавікоў!** Вось чаму яны заклікалі сюды ня толькі немцаў, але і французаў і, пазьней, дапамагалі белапольскай акупацыі.

А ў гэты час рабочыя і сяляне прыступілі да будаўніцтва Беларускай Рэспублікі. Яднаюцца Беларуская і Літоўская рэспублікі ў адну рэспубліку Літбел, пачынаецца наладжаньне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, адкрываецца ў Менску народны унівэрсытэт. Перамогі пралетарыяту на франтох і ў будаўніцтве ўстрывожылі капіталістаў Захаду: па Эўропе шагае ўжо ня адзін камунізму, а чуюцца крокі рэальнага бальшавіка. Трэба паставіць сьцяну паміж Эўропай і Расіяй: Ліга Нацый дапамагае буржуазнай рэстаўрацыі ў краінах Прыбалтыкі і дае загад нямецкаму войску перадаваць уладу ў гарадох, якія яны пакідаюць нацыянальнай буржуазіі — радам, тарыбам. Самым «надзейным» зьявіўся Пілсудзкі, бо ён ужо меў сваю арганізаваную ўзброеную сілу.

Загад Фоша: «Прапусьціць легіёны на Вільню і далей на Ўсход для барацьбы з бальшавікамі» выконваецца шэйдэманаўцамі добра: **громяцца Саветы ў Горадні, прапускаюцца легіёны на Вільню.**

Доўга біліся за кожны кавалачак зямлі рабочыя і сяляне Беларусі і Літвы. Чырвоны Менск праводзіў мабілізацыю за мабілізацыяй. Амаль уся партыйная арганізацыя кінута на фронт, рабочы Менск стварыў свой рабочы батальён, сяляне даюць столькі добраахвотнікаў, што Савет Абароны адмаўляецца ад мабілізацыі. Але ўся Савецкая Расія перажывае цяжкае становішча: з усходу наступае Калчак, а поўдня — Дзянікін і інш. Гэта не дае магчымасьці дапамагчы больш Заходняму фронту, і Беларусь перажывае другую акупацыю: **пачаўся разгул белапалякаў.**

Гэта не абыходзіцца **без актыўнага** ўдзелу нац.-дэмакратаў. Ствараецца пад крылкам ужо буржуазнай у той час Эстоніі «Асобны атрад БНР» пад камандаю ген.-майора Булак-Балаховіча, а пасьля забраньня Вільні і контррэвалюцыйнага перавароту ў Літве, такі-ж атрад ствараецца і ў літоўскай арміі. Каб лепш паказаць, як Радай вялася барацьба супроць рабочых і сялян, дамо слова самім радаўцам.

«В апреле 1919 г., когда началось общее наступление на большевиков, белоруссы сражались на большевистском фронте в рядах своих партизанских отрядов в рядах так называемой «Зелёной армии», действовавшей в тылу большевиков, в рядах польской и в рядах литовской армии». (Из Меморандума Рады «Его Высокопревосходительству, г-ну Статссекретарю иностранных дел Северо-Американских Соединенных Штатов).

Калі мы заменім слова «беларусы», якім нацдэмы маскуюцца, сапраўдным імем, то мы ўбачым, **як нац.-дэмакраты дапамагалі белапалякам акупаваць Беларусь.** Не ўдарма нац.-дэмы з такой урачыстасьцю сустракалі ў Менску 18 верасьня 1919 г. «вярхоўнага правадыра польскіх войск і главу дзяржавы польскай» Юзэфа Пілсудзкага. Беларуская газэтка «Звон» захлыпаецца ад здавальненьня пры апісаньні гэтай сустрэчы. Пілсудзкі застаўся задаволеным: ён, праверыўшы на справах беларускіх нац.-дэмакратаў, убачыў у іх асобе добрых памочнікаў. Таму Пілсудзкі дазволіў сабе так многа абяцаць:

«Войска польскае, якім я маю гонар камандаваць, **нясе ўсюды аслабаненьне і сапраўдную волю. Польшча ідзе на акраіны ня дзеля таго, каб навязваць сваю волю. Я выдаў адозву, у якой заявіў, што гэтым землям ніхто і нічога гвалтоўна навязваць ня будзе, яны будуць вольны і само насельніцтва вызначыць формы свайго палітычнага жыцьця...**

Няхай жыве вольная Беларусь паміж вольнымі народамі». («Прамова Пілсудзкага», «Минский Курьер», № 26, ад 20 верасьня 1919 г.).

У адказ на гэта нац.-дэмакраты яшчэ больш распаліліся ў сваім лёкайскім жаданьні ўслужыць пану:

«Пане начальніку Дзяржавы Польскай. Мінае ўжо шосты тыдзень, як мы, тубыльцы гэтага месца — сэрца Беларусі — Менску, **жывем спакойным жыцьцём...** «Цуд» гэты ёсьць дзелам і заслугай гэройскага польскага войска, якога Вы ёсьць начальнік і каторае, не шкадуючы ні сіл, ні афяр, рушыла сюды, пясучы нам братнюю дапамогу».

Але гэтага мала: нацдэмам неабходна, каб белапольскія грабежніцтвы адбыліся і далей на Ўсходзе:

«Вольна і спакойна жывем мы сягоньня ў Менску і маем радасьць бачыць Вас, пане Начальнік. Але, гаворачы словамі Вешчага Баяна нашага, плачуць яшчэ маткі ў Віцебску, стогнуць людзі ў Магілеве, маўчыць, бо забаронены, хаўтурны голас аб'ішэлых званіц Смаленску... Але мы ўпэўнены, што страшная мара разьвеецца і над імі і да гэтага рады і гатовы дзелаўшыць усе свае сілы, аддаць і свае афяры»... (З рэчы Прушынскага — А. Гаруна — **ад імя ўсіх беларускіх арганізацый** пры прывітаньні Пілсудзкага ў Менску. «Беларускае жыцьцё» № 15).

Вядома, тым што былі ў «беларускіх арганізацыях», ад імя якіх гаварыў А. Гарун, жылося надрэнна, бо польскае войска прынесла наступны загад:

«ОБЯЗАТЕЛЬНОЕ ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 16.

Заместителя комиссара Восточных Окраин.

1. Сообщается для всеобщего сведения, что всякие декреты и распоряжения большевистских властей, касающиеся частной собственности, об'являются недействительными. **Право частной собственности восстанавливается в полной мере.**

2. Комитетам, возникшим во время властвования большевиков ведающим хозяйственными и местными делами, с настоящего момента воспрещается вмешиваться в дела частной собственности. Комитеты считаются распущенными. Организации земельных работников могут быть созданы лишь по уставу, утвержденному властью.

3. Всякая частная собственность, будь то захваченная силой, или случайно находящаяся у незаконных владельцев, должна быть немедленно возвращена владельцам.

4. Владельцы имений, или их законные представители, обязаны не позднее 10 сентября вступить во владение своими имениями, которые должны быть переданы им ликвидационной комиссией б. Управления частновладельческих земель (национализированных имений).

Вл. Рачневич — зам. Генерального Комиссара Восточной области для Минского округа.

Делопроизводитель: Мещинский.

Минск, 24 августа 1919 г.»
(«Минский Курьер» № 2, ак 27 жніўня).

А што нац.-дэмакратам да таго, як жывецца селяніну, як жывецца рабочаму! Самі-ж нацдэмы столькі клопату палажылі, каб імённа так жыўся селяніну і рабочаму.

«Калі палякі занялі Пятрыкова, Капаткевічы і інш. мястэчкі Мазырскага павету, была наладжана крывавая лазьня. Хваталі на вуліцы ўсіх без разбору, адпраўлялі на бераг Прыпяці і там распраўлялися... Жанчын гвалтавалі па 10-13 чал., ад чаго яны варэнцелі або канчалі жыцьцё самагубствам. Ідзе грабежніцтва: ад сялян адбіраюць хлеб, сена, жывёлу, вопратку. Дзе сяляне пры савецкай уладзе адбудаваліся, прымушаюць разьбіраць будынкі і везьці бярвёны і цэглу ў маёнткі... Гоняць у далёкі тыл на работу са сваім канём, але бяз усякай аплаты.

На каленях перад нямецкім імпэрыялізмам

Паслана ў 20 числах кастрычніка

Пану Нямецкаму Імпэрскаму Канцлеру

Правамоцны прадстаўнічы орган беларускага народу і ўсяго насельніцтва Беларусі, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, усталяваўшая сваю ўладу ад Усебеларускага Кангрэсу, які адбываўся ў сьнежні 1917 году ў гор. Менску, зьвярнулася да посьбітаў вярхоўнай улады Нямеччыны з просьбай аб абароне беларускай дзяржаўнасьці і аб яе падтрыманьні. На абодвы гэтыя звароты з боку Нямеччыны пасьледваў адказ, які ўказваў, што перашкода да прызнаньня незалежнасьці Беларусі зьяўляецца Берасьцейскі дагавор паміж Нямеччынай і Расійскай Савецкай Фэдэрацыйнай Рэспублікай, якім Нямеччына абавязалася не падтрымліваць новых дзяржаўных стварэньняў на тэрыторыях былой Расіі...

Беларусь, якой за час акупацыі ня было дана ніякай магчымасьці арганізавацца, пасьля магчымага адыходу акупацыйных войск, застанецца зусім бездапаможнай, бясьсільнай папярэдзіць анархію. Калі-ж анархія ахопіць Беларусь, дык гэта бясспрэчна палегчыць ёй магчымасьць перакінуцца далей на захад. З другога боку Берасьцейскі дагавор, які зьвязвае цэнтральныя дзяржавы ў адносінах прызнаньня незалежнасьці Беларусі, у даны момант павінен лічыцца страціўшым моц. Такім чынам, ня кажучы ўжо аб справядлівасьці, якая патрабуе прызнаньня акту самавызначэньня беларускага народу, а таксама і аб маральнай адказнасьці Нямеччыны за далейшы лёс Беларусі, **які знаходзіцца зараз у яе (Нямеччыны) руках,** трэба думаць, што непрызнаная незалежнасьць Беларусі, выйшкам якое павінен зьявіцца неадкладны вывад нямецкіх войск з Беларусі, будзе мець вынікі пяспрыяючыя і для самой Нямеччыны і яе палітыкі на ўсходзе...

Таму дэлегацыя просіць урад Нямецкай Імпэрыі ў асобе Вашага Высокаправаскхадзіцельства афіцыяльна прызнаць незалежнасьць Беларусі і даць магчымасьць Беларускаму Ўраду ажыцьцяўляць прыналежныя яму функцыі дзяржаўнага будаўніцтва і кіраўніцтва, а таксама арганізаваць узброеную сілу ў мэтах самаабароны, неабходнага ў даны момант падтрыманьня ў яго дзяржаўнай арганізацыйнай рабоце. Дэлегацыя спадзяецца, што такія спрыяючыя адносіны з боку Нямеччыны і паслужаць асновай для прыязных адносін абедзьвюх дзяржаў у будучым.

Старшыня дэлегацыі БНР А. ЦЬВІКЕВІЧ.

Умаляюць аб апецы над сабою французкае камандваньне

15-IX-20
№ 434

Мірнай канфэрэнцыі ў Парыжы

Мірныя перагаворы, якія адбываюцца ў цяперашні час паміж Расійскай Савецкай Сацыялістычнай Фэдэрацыйнай Рэспублікай і Польскай Рэспублікай, закранаюць істотныя інтарэсы Беларускай Народнай Рэспублікі, якая служыла на працягу шасьці год тэатрам крывапралітнай вайны і знаходзіцца паміж дзяржавамі, якія вядуць памянёныя перагаворы . . . . . .

Выкладаючы ўсё вышэйпаказанае, Урад Бел. Нар. Рэсп. просіць Мірную Канфэрэнцыю выслухаць благаньні гвалтаванага і падзяляванага паміж суседзямі Беларускага народу і . . . . . .

3) Узяць пад французкае камандваньне або кіраўніцтва як існуючыя ўжо беларускія часьці, так і тыя, якія будуць з'арганізаваны ў будучым.

4) Даць магчымасьць Беларускаму Ўраду сабраць беларускіх ваякаў, якія змагаюцца ў розных арміях, на бацькаўшчыну.

5) Дапамагчы Беларускаму Народу і яго Ўраду ў яго барацьбе з бальшавіцкай акупацыяй.

Ластоўскі — старшыня Рады Народных Міністраў Беларускай Рэспублікі, **Ладноў** — Міністар Замежных Спраў, **Вальковіч** — Міністар Фінансаў, **Езавітаў**—Дзяржаўны Сакратар.

Аўстрыйская манархія—апякун БНР

№ 75

Мы, дэлегаты Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі, зварачаемся да Вас з просьбай давесьці да ведама Ўраду Яго Апостальскай Вялікасьці аб тым, што Беларускі народ абвясьціў сваю краіну самастойнай Рэспублікай, канчатнова аддзяліўся ад Расіі.

. . . . . .

Абвяшчаючы аб адбыўшымся акце свабоднай волі народу і просячы Вас давесьці аб усім гэтым да ведама Вашага Ўраду, мы, дэлегаты Беларускага Ўраду, упаўнаважаны ў той-жа час заявіць, што Беларусь заўсёды глядзела і глядзіць на Аўстрыю ,як на вялікую Славянскую Манархію, у якой жыцьцё славян выяўляецца ў найбольш падыходзячай форме і знаходзіць нацыянальнае прызнаньне, і што таму Беларускі Ўрад і народ можа знайсьці ў Аўстрыі свайго натуральнага саюзьніка і апякуна ў тую трудную мінуту, якую перажывае зараз наша краіна, у пэрыяд адражэньня яе дзяржаўнай самабытнасьці і ў цяжкі пэрыяд ліквідацыі вайны, нам, беларусам, навязанай. Маючы такія пачуцьці да Аўстрыйскай Манархіі, мы зварачаемся да Вас з просьбай давесьці да ведама Вашага Ўраду наступныя нашы просьбы і пажаданьні:

1) Мы прасілі-б аб прызнаньні з боку Аўстрыі самастойнасьці Беларускай Рэспублікі і створанага ў ёй Ўраду ў асобе цяперашняй Рады і яе калёгіяльнага Міністэрства.

2) Разам з тым мы настойліва прасілі-б аб захаваньні Беларусі яе натуральных, гістарычных, этнаграфічных і эканамічных межаў.

Старшыня дэлегацыі Беларускага Ўраду ЦЬВІКЕВІЧ.

10.000.000 эстонскіх марак на ўтрыманьне нацыянальнага атраду Булак-Балаховіча

Надзвычайны Паўнамоцны Прадстаўнік Беларускай Народнай Рэспублікі пры УРАДАХ БАЛЬТЫЦКІХ ДЗЯРЖАЎ
26 лістапада 1919 г
№ 40

г. Рэвель

Пану міністру Замежных спраў Рэспублікі Эстыі

Са згоды Эстонскага Галоўнакамандаваньня і ведама Эстонскага ўраду ўжо працуе пры 2-ой эстонскай дывізіі побач з эстонскай арміяй і Асобны Атрад Беларускай Народнай Рэспублікі пад камандай генэрала Булак-Балаховіча . . . . . .

1. Атрад да выхаду на сваю тэрыторыю падначальваецца Эстонскаму галоўнакамандваньню.

2. Камандны склад атраду зацьвярджаецца Беларускім Вайсковаю Дыпляматычным Прадстаўніцтвам у Эстыі.

3. З прычыны таго, што ў сучасны момант Беларуская Народная Рэспубліка ня мае магчымасьці адразу наладзіць забесьпячэньне атраду з Беларусі і за кошт Беларускага Ўраду

Узьняць палітычную ролю саветаў у правядзеньні лініі партыі

Даклад т. А. Г. ЧАРВЯКОВА аб чарговай справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў

I. Палітычнае значэньне перавыбараў

Таварышы, мы праводзім досыць часта справаздачна-перавыбарчыя кампаніі саветаў. Ня гледзячы на гэта, камбарыя і ўрад кожны раз навакол гэтага выпадзеньня разгортваюць шырокую растлумачальную кампанію.

Дзеля таго, каб уразумець сабе ўсё значэньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі, мы возьмем для прыкладу і адзначэньня нашу перавыбарчую кампанію саветаў і тую кампанію выбараў у сойм, якая гэтымі днямі адбылася ў фашысцкай Польшчы.

Фашысцкі ўрад Польшчы праз выбарчую кампанію дабіваўся таго, каб ён прыладай у руках фашысцкага буржуазнага ўраду і ў той-жа час захоўваў форум—знадворны выгляд парляманту, які мае падтрыманьне з боку шырокіх мас насельніцтва Польшчы. І вось, каб набыць мандаты ад імя шырокіх мас насельніцтва, дзеля таго, каб забясьпечыць фашысцкаму ўраду Польшчы, які вызначаецца прыказчыкам польскай буржуазіі, пастаянную большасьць у сойме, польскі ўрад і правёў кампанію выбараў шляхам тэрору і ўсялякага роду прасьледваньня сапраўдных рэвалюцыйных арганізацый. Шляхам фальсыфікацыі выбараў фашысцкі ўрад дабіўся ўзьнятай большасьці ў сойме, які будзе паслухмянай зброяй у руках польскага ўраду.

Такім чынам, гэтыя выбары патрэбны былі польскаму ўраду, каб фальсыфікаваць волю мас, каб ад імя гэтых мас праводзіць палітыку пануючай буржуазіі ў мэтах забесьпячэньня інтарэсаў пануючых клясаў Польшчы, а таксама для падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

Выбары ў савецкіх краінах, у тым ліку ў Савецкай Беларусі, маюць зусім іншае значэньне. У нас улада апіраецца на большасьць, на працоўную большасьць насельніцтва, і перавыбарчая кампанія мае сваёй мэтай у яшчэ большай меры замацаваць гэту сувязь савецкага ўраду з самымі шырокімі масамі працоўных.

Разам з гэтым значэньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў гэтым годзе павялічваецца з прычыны таго, што перавыбары саветаў будуць адбывацца на фоне абвостранай клясавай барацьбы. Нашы клясавыя ворагі — кулак, нэпман і іншыя антысавецкія контр-рэвалюцыйныя элемэнты ў сваёй барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту і сацыялістычнага будаўніцтва імкнуцца да таго, каб аўладаць саветамі, каб зрабіць саветы сваёй зброяй у барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту, каб дыскрэдытаваць саветы, каб, увёўшы ў саветы сваіх агентаў, паставіць саветы сабе на службу.

Тое, што нашы клясавыя ворагі надаюць вялізарнае значэньне справе аўладаньня саветамі, мы бачылі на працягу мінулага часу ў надзвычайна яркай форме.

Вы можаце, прыкладна, успомніць тое, што яшчэ ў 1921 годзе капіталісты, апіраючыся на кулацкія элемэнты нашай вёскі, вялі барацьбу супроць саветаў, супроць сацыялістычнага будаўніцтва пад лёзунгам: «Саветы без камуністаў».

У сучасны момант замежная і расійская эміграцкая буржуазія, пры дапамозе сацыял-фашыстаў, таксама разгортвае праграму барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту пад лёзунгамі: «Саветы без пяцігодкі». Гэта значыць, — саветы без тэй пралетарска-сацыялістычнай сутнасьці, якою павінна быць напоўнена ўся дзейнасьць і ўся істота саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту.

У апошні час, у сувязі з разгортваньнем перавыбарчай кампаніі, мы маем вылазкі клясавых ворагаў, контр-рэвалюцыйных элемэнтаў у выглядзе распаўсюджаньня ў паасобных нацыянальных саветах адозваў, праклямацый і г. д., у якіх ёсьць заклік выбіраць агульна-нацыянальныя саветы, адмаўляцца ад клясавай барацьбы і г. д.

Адсюль ясна відаць, што ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі Саветаў мы сустрэнемся з надзвычай абвостранай клясавай барацьбой за саветы. Гэта павінна яшчэ больш завастрыць нашу ўвагу на падрыхтоўцы да правядзеньня гэтай кампаніі, каб даць рашучы адпор нашым клясавым ворагам, каб стварыць саветы, як сапраўдныя органы дыктатуры пралетарыяту для барацьбы за сацыялізм.

II. У якіх палітычных умовах праходзіць кампанія

Умовы сучаснага моманту значна адрозьніваюцца ад тых умоў, у якіх мы праводзілі мінулую справаздачна-перавыбарчую кампанію.

Могул кажуны, мы можам прыстасавацца для характарыстыкі гэтых новых умоў тую ацэнку, якая была зроблена таму перыяду тав. Сталіным на XVI партыезьдзе.

Тав. Сталін сказаў, што XIV зьезд партыі зьяўляўся зьездам барацьбы за індустрыялізацыю, XV зьезд быў зьездам барацьбы за калектывізацыю; XVI зьезд—гэта ёсьць зьезд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Мы з посьпехам скончылі першыя два гады пяцігодкі, заканчваем асобны ударны квартал і рыхтуемся да 3-га заканчэньня году пяцігодкі.

За гэтыя гады, на падставе генэральнай лініі партыі, у выніку надзвычайнага ўздыму творчай актыўнасьці рабочае клясы і ўсіх працоўных, у выніку найшырэйшага разгортваньня новых сацыялістычных форм працы — у выглядзе сацсаборніцтва, сустрэчнага рамфінплану, ударных брыгад, — разгортваньня самакрытыкі і г. д., нарэшце, дзякуючы рашучай барацьбе супроць ухілаў ад генэральнай лініі партыі і супроць правага, у першую чаргу, як найбольш небясьпечнага, — мы выканалі ня толькі пацярэдняе мерканаваньні пяцігодкі, але значна іх перавыканалі, на асноўных важнейшых галінах народнай гаспадаркі.

Гэта забясьпечыла бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў далейшым, дзякуючы чаму мы сьмела ўступаем у трэці рашаючы год пяцігодкі.

Разам з гэтым мы павінны адзначыць, што сацыяльная база саветаў за мінулы час надзвычай пашырылася і ўзмацнілася. Колькасьць рабочых на фабрыках і заводах вельмі значна павялічылася.

Мы з гонарам адзначаем, што беспрацоўе ў Савецкім Саюзе, дзякуючы ўцягненню значнай колькасьці працоўных у нашы прадпрыемствы, у асноўным ліквідавана. Вельмі значна павялічылася ўдзельная вага жанчын-работніц на фабрыках і заводах.

У выніку пасьпяховай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі шляхам калектывізацыі ў вёсцы зьявілася новая праслойка ў выглядзе калгаснікаў, якія разам з батрацкай і бядняцкай часткай вёскі становяць асноўную апору савецкай улады. Надзвычайна ўзрасла палітычная актыўнасьць працоўных гораду і вёскі.

Вось гэтае новае, дадатнае ва ўмовах правядзеньня сучаснай справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Пасьпяхова разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце выклікае абвостранае супраціўленьне з боку адыходзячых клясаў, абвастраючы клясавую барацьбу ў СССР, павялічвае загрозу нападу на Савецкі Саюз з боку імпэрыялістычных інтэрвэнтаў.

Нядаўна закончыўся працэс так званай «прамысловай партыі». Гэты працэс а ўсёй выразнасьцю паказаў, што капіталістычны сьвет ні на адну хвіліну не супакойваецца ў сваёй клясавай нянавісьці да Савецкага Саюзу і ўпарта рыхтуецца да барацьбы шляхам інтэрвэнцыі супроць улады саветаў, супроць краіны, якая будзе сацыялізм. Падрыхтоўка да інтэрвэнцыі з боку кіруючых колаў францускай, польскай, румынскай і інш. буржуазіі, якія робяць стаўку на клясава-варожыя, кулацкія, нэпманскія і іншыя контр-рэвалюцыйныя элементы ўнутры Савецкага Саюзу, ідзе нескораным тэмпам.

Такім чынам, пагроза інтэрвэнцыі гэта ёсьць рэальная пагроза, якую мы павінны улічваць у сваёй працы і якая павінна даваць пэўны напрамак раду нашых мерапрыемстваў, каб папярэдзіць інтэрвэнцыю, каб у патрэбнай мерэ падрыхтавацца да сустрэчанага і рашучага адпору імпэрыялістычным інтэрвэнтам.

Гэты працэс таксама паказаў, што клясава-варожыя, кулацкія, нэпманскія і інш. контр-рэвалюцыйныя элементы Саветаў знайшлі сваіх ідэолёгаў, сваіх правадыроў у асобе часткі буржуазных спэцыялістаў, ставшых так званую «прампартыю», рыхтаваўшых у СССР глебу для інтэрвэнцыі ў якасьці платных агентаў сусьветнага капіталу.

Тое ж мы павінны адзначыць і ў адносінах выкрытай контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў у Савецкай Беларусі.

Тав. Галадзед тут падрабязна спыніўся на гэтым пытаньні. У сувязі з гэтым я абмяжуюся радам агульных заўваг.

Сацыяльнай базай контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў зьяўляецца кулак, нэпман і ўсе буржуазна-капіталістычныя, клясава-варожыя нам элемэнты. Яны імкнуцца да аднаўленьня буржуазных узаемаадносін, да зьнішчэньня дыктатуры пралетарыяту.

І яны думаецца, што іменна гэта клясавая сутнасьць дзейнасьці беларускіх нацыянал-дэмакратаў павінна быць усьвядомлена ўсімі працоўнымі БССР а ўсёй выразнасьцю, а ўсёй відавочнасьцю. Беларускія нацыянал-дэмакраты вялі сваю барацьбу, прыкрываючыся маскай «агульна-нацыянальных інтарэсаў, прыкрываючыся лёзунгамі «адраджэньня Беларусі» і г. д. і г. д. Наша задача заключаецца ў тым, каб выявіць сацыяльную базу беларускіх нацыянал-дэмакратаў і паказаць, што за гэтымі «агульна-нацыянальнымі інтарэсамі, за лёзунгам беларускіх нацдэмаў аб «адраджэньні» Беларусі хаваюцца інтарэсы кулака, нэпмана, буржуазіі, што ўся дзейнасьць беларускіх нацдэмаў накіравана супроць інтарэсаў рабочае клясы, супроць інтарэсаў працоўнага селянства.

Беларускія нацыянал-дэмакраты імкнуліся да таго, каб вярнуць памешчыкам маёнткі, капіталістам — фабрыкі і заводы, буржуазіі, — панаваньне і **адзінаёдзь падпяўольнае становішча** рабочых, працоўнага селянства і пасгул усіх працоўных.

Адсюль для нас становіцца зразумелым і той сацыяльна-палітычны ідэал, якім кіраваліся ў сваёй працы беларускія нацыянал-дэмакраты. Ідэалам гэтым у іх было ўтварэньне БНР—Беларускай Народнай Рэспублікі. Яны імкнуліся да таго, каб ператварыць Савецкую Беларусь, Беларусь сацыялістычную, у Беларусь буржуазную, капіталістычную. Такім чынам, беларускія нацдэмы імкнуліся да аднаўленьня дыктатуры буржуазіі, імкнуліся да таго, каб падпарадкаваць, падпяўольць гэтай буржуазнай дыктатуры ўсю вялікую масу працоўных.

Хаўрыснікамі беларускіх нацыянал-дэмакратаў зьяўляюцца, як аб гэтым гаворыць зараз у сваіх паказаньнях арыштаваныя нацыянал-дэмакраты — Лёсік, Ластоўскі, Краскоўскі, Смоліч і інш., нацыянал-фашысты Заходняй Беларусі з Луцкевічам і Астроўскім на чале.

Уся гэта кампанія арыентавалася на буржуазную Польшчу, імкнулася да таго, каб дабіцца ажыцьцяўленьня сваіх мэт праз акупацыю Савецкай Беларусі фашысцкай Польшчай, для чаго беларускія нацыянал-дэмакраты старанна рыхтавалі глебу ў Савецкай Беларусі.

Прадумваючы тую пазыцыю, якую займала гэта група беларускіх нацыянал-дэмакратаў на працягу ўсяго часу свайго праўбываньня і працы ў Савецкай Беларусі, мы павінны з агідпасьцю і абурэньнем адзначыць, што яны нічым не ганьбавалі для таго, каб дасягнуць сваёй мэты.

«Мэта апраўдвае сродкі» — вось тая мараль, якою яны кіраваліся ў сваёй працы. Ашуканства, правакацыя, здрада працоўным і г. д., — усё гэта пускалася ў ход для таго, каб дабіцца сваёй мэты. Гэта група беларускіх нацыянал-дэмакратаў, у адказ на вялікую міласьць, што аказала ім савецкая ўлада, дараваўшы ім шляхам амністыі права на жыцьцё і працу ў Савецкай Беларусі, здрадзіла рабочай клясе і ўсім працоўным Беларусі і вяла варожую дыктатуры пралетарыяту і сацыялістычнаму будаўніцтву работу ў якасьці агентуры польскага фашызму.

Перамежны ход Кастрычніцкай рэвалюцыі разграміў беларускія контр-рэвалюцыйныя цэнтры і арганізацыі, утвораныя ў часе Кастрычніка для барацьбы супроць рэвалюцыі, ліквідаваў іх дзейнасьць на тэрыторыі БССР і самых правадыроў гэтага контр-рэвалюцыйнага руху ў асобе «ўраду» Беларускай Народнай Рэспублікі і беларускай рады абвясьцію па-за законам.

Аднак, савецкі ўрад ніколі ня кіруецца матывамі помсты, а імкнецца да таго, каб выкарыстаць вялы кваліфікаваных людзей для справы сацыялістычнага будаўніцтва. Вось гэта імкненьне савецкай улады і выкарыстаці ў сваіх здраднідзкіх мэтах беларускія нацыянал-дэмакраты. **Атрымаўшы з іх боку** заявы аб тым, што яны жадаюць, шляхам дапамогі сацыялістычнаму будаўніцтву, загладзіць сваю віну перад рабочай клясай, савецкі ўрад іх амніставаў, даў ім магчымасьць жыць і працаваць на тэрыторыі БССР. У адказ на гэту вялікую міласьць працоўных Беларусі, нацдэмы пралезьлі ў наш апарат у контр-рэвалюцыйных мэтах. Як паказвае сьледзтва, яны свае прабываньне на тэрыторыі БССР выкарысталі ў мэтах ператварэньня Беларусі Савецкай у Беларусь буржуазную, у мэтах замены дыктатуры пралетарыяту на дыктатуру буржуазіі шляхам кулацкай контр-рэвалюцыі і капіталістычнай інтэрвэнцыі.

Тав. Галадзед тут падрабязна расказаў аб канкрэтных праявах іх контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці.

Усё гэта разам узятае яснае паказвае, што контр-рэвалюцыянэры — беларускія нацыянал-дэмакраты зьяўляюцца ня толькі ідэолёгамі, але і сапраўднымі агентамі кулацкай контр-рэвалюцыі польскага фашызму.

Савецкі ўрад праз свой баявы орган АДПУ выкрыў гэту беларускую нацыянал-дэмакратычную контр-рэвалюцыйную групу і яе дзейнасьць. Але было-б памылкай сказаць, што мы ўжо ліквідавалі вынікі іх дзейнасьці. Мы сустрэнемся і ў далейшым з праявамі беларускага нацыянал-дэмакратызму, які будзе афармляць і ў далейшым імкненьні кулацка-нэпманскіх элемэнтаў і весьці контр-рэвалюцыйную барацьбу супроць сацыялістычнага будаўніцтва.

Усё гэта разам узятае характарызуе тую новую абстаноўку, ва ўмовах якое нам трэба праводзіць справаздачна-перавыбарчую кампанію.

III. Перабудаваць работу саветаў

Асноўнай палітычнай задачай справаздачна-перавыбарчай кампаніі зьяўляецца **падняцьце палітычнай ролі саветаў у справе правядзеньня ў жыцьцё генэральнай лініі камуністычнае партыі.**

Гэта задача заключае ў сабе наступныя элемэнты:

Па-першае, узьняцьце ролі саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту, як органаў, якія акумулююць, зьбіраюць волю і энэргію рабочае клясы і іншых за рабочай клясай працоўных мас у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Па-другое, роля саветаў павялічваецца не сама па сабе, а дзеля таго, **каб як мага лепш, як мага з большым посьпехам і часьлядоўней праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі.** Другой задачы, другой мэты перад саветам быць ня можа. Савет, як орган дыктатуры пралетарыяту, **свае**, асобнай ад кампартыі, лініі і палітыкі ня мае і ня можа мець. Савет, як орган дыктатуры пралетарыяту, толькі ў тым выпадку выконвае сваю сапраўдную ролю органу дыктатуры пралетарыяту, калі ён пасьлядоўна, пырока і разгорнута праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі.

Калі мы гаворым аб падняцьці ролі саветаў, то нам трэба заўсёды мець на ўвазе даўже небясьпеку. **Першая—гэта недавацэнка ролі саветаў.** Асабліва яркі гэта небясьпека выявілася ў час, калі ў некаторых яясных наглядалася так званае «галавакружэньне ад посьпехаў» калектывізацыі. У той час знайшоўся рад работнікаў, якія гаварылися да таго, што ў выніку сацыяльнай калектывізацыі мы можам стаць на шлях паступовай ліквідацыі саветаў.

Вось што, напрыклад, пісаў тав. Дацэнка ў «Рабочай Москве» 19-IX 29 г.: «Пры сацыяльнай калектывізацыі сяленьняў з поўным абагуленьнем усе функцыі сельсаветаў ажыцьцяўляцца калгасамі. Захаваньне сельсаветаў пры наяўнасьці сацыяльна калектывізаванага сяленьня... будзе лішняй і дарагой адміністрацыйнай надбудовай над калгасамі».

Тав. Рахаў у «Известиях» 11-IX 1929 г. на гэтым пытаньні таксама пісаў: «Калгасы вырашаюць і пачынаюць праводзіць у жыцьцё задачы сельсаветаў, калгасы апераджаюць дзейнасьць сельсаветаў. Ці не зьяўляецца калгас—сяло пачаткам адміраньня асобных зьвеньняў дзяржаўнасьці ў нашым Савецкім Саюзе, які будзе сацыялізм».

Тав. СТАЛІН на XVI зьезьдзе партыі даў ясную ацэнку гэтым імкненьням, сказаўшы наступнае: «мы за отмирание государства и вместе с тем стоим за усиление диктатуры пролетариата, представляющей самую мощную, самую могучую власть из всех существующих до сих пор государственных властей. Высшее развитие государственной власти в целях подготовки условий для отмирания государственной власти—вот марксистская формула».

Тав. КАГАНОВІЧ у арганізацыйнай справаздачы на гэтым-жа XVI зьезьдзе таксама даў рашучы адпор такім імкненьням Рахавых сказаўшы, што «гэта ёсьць адміраньне бальшавіцкай ідэалёгіі ў гэтых тэарэтыкаў. Толькі той, хто страціў маркісцкае разуменьне ролі саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту, можа дагаварыцца да ліквідацыі саветаў. Гэта ёсьць нішто іншае, як адбітак імкненьня кулацкіх элемэнтаў зьшчыць саветы, як органы дыктатуры пралетарыяту».

Вось гэту небясьпеку нам трэба мець на ўвазе ў тых выпадках, калі роля саветаў зьніжаецца, калі наглядаецца неразуменьне, зацьменьне ролі саветаў, калі роля саветаў зводзіцца да ролі тых кінных выканаўцаў. Трэба узьняць рашучую барацьбу супроць контр-рэвалюцыйных спроб ліквідаваць саветы.

Разам з гэтым трэба ўзьняць і **другую небясьпеку**—гэта **імкненьне процістаўіць саветы партыі**, лінію саветаў лініі партыі, палітыку саветаў палітыцы партыі. Мы часта можам чуць на мясцох гутаркі аб тым, што вось усім кіруе ячэйка, што партыйцы камандуюць, не даюць ходу беспартыйным і г. д. і г. д.

Гэты адрыў саветаў ад партыі ёсьць другая небясьпека, якая павінна быць улічана пры правядзеньні перавыбарчай кампаніі. Сацыяльна-клясавая сутнасьць гэтай небясьпекі заключаецца ў імкненьні кулацка-нэпманаўскіх элемэнтаў адарваць саветы ад партыі, падменшыць кіруючую ролю партыі ў саветах, перарадзіць саветы з органаў дыктатуры пралетарыяту ў органы паслугачоў буржуазна-капіталістычных элемэнтаў.

Маючы на ўвазе гэтыя даўже небясьпекі, сацыяльныя карэньні якіх прыводзяць нас да імкненьня кулацка-нэпманаўскіх элемэнтаў узарваць саветы, ліквідаваць саветы, як органы дыктатуры пралетарыяту, мы павінны ясна і выразна паставіць перад сабой і дабіваца ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі ўзьняцьця ролі саветаў у правядзеньні генэральнай лініі партыі.

IV. Правесьці перавыбары пад сьцягам барацьбы за далейшае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце

Важнае значэньне ў справе падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў мае вызначэньне тэй палітычнай платформы, з якою мы ідзем на перавыбарчую кампанію.

Я ўжо раней паказаў, што перавыбары саветаў ня ёсьць толькі тэхнічная работа, а важнейшая вялізарная палітычная кампанія і, як усякая палітычная кампанія, павінна мець пэўную палітычную плятформу.

Палітычная плятформа, з якое мы выходзім на перавыбарчую кампанію саветаў гэтага году,—гэта **барацьба за далейшае шырокае разгортваньне сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, барацьба за генэральную лінію партыі на аснове пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б).**

Такім чынам усе пытаньні генэральнай лініі партыі павінны стаць нашымі лёзунгамі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі, іменна: разгортваньне сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, пяцігодка—за чатыры гады, індустрыялізацыя краіны, суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя на гэтай базе кулацтва, як класы, разгортваньне задач культурнай рэвалюцыі, палепшэньне дабрабыту працоўных, разгортваньне творчай ініцыятывы працоўных у барацьбе за сацыялізм, мабілізацыя сіл для барацьбы супроць шкоднікаў, супроць інтэрвэнцыі шляхам узмацненьня абароназдольнасьці краіны: і баяздольнасьці Чырвонай армії.

Разам з гэтым, вядучы барацьбу за генэральную лінію партыі, мы павінны мабілізаваць сілы ўсёй рабочай клясы, усіх працоўных для барацьбы супроць ухілаў ад генэральнай лініі партыі. Мы павінны разгарнуць пырокую кампанію для барацьбы супроць правага ўхілу, як кулацкай агентуры ўнутры партыі, як найбольш небясьпечнага на даным этапе. Правы ўхіл ёсьць працяг тэй барацьбы ўнутры партыі, якую вядуць у нашай краіне кулацкія, контр-рэвалюцыйныя элементы і якая афармляецца ў выглядзе «прампартыі», «працоўнай сялянскай партыі», беларускай групы контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў. З гэтай прычыны мы павінны ўвесь агонь пралетарскай пяцігодкі накіраваць на барацьбу супроць правага ўхілу, супроць практычных праявы гэтага правага ўхілу як у партыі, так і ў савецкім апараце, супроць «левых» загібаў, супроць бязпрынцыпнага права-«левацкага» блёку і прымірэнчых да іх адносін.

Мы павінны, таварышы, разгарнуць бязьлітасную барацьбу супроць нацыянал-апартуністаў, які зьяўляецца агентурай нацыянал-дэмакратызму ў радох партыі. Нацыянал-апартуністы ў партыі працягваюць тую барацьбу, якую вядуць у нашай краіне нацыянал-дэмакраты. І вось з усёй пралетарскай жорсткасьцю мы павінны выявіць, выкрыць нацыянал-апартуністаў і даць ім руйнуючы адпор.

Трэба разгарнуць пырокую работу на высьвятленьні дасягненьняў і далейшых мерапрыемстваў ленінскай нацыянальнай палітыкі, вядучы рашучую барацьбу супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, супроць польскага, яўрэйскага шавінізму. У той-жа час трэба забясьпечыць правядзеньне праз саветы ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў, якія складаюць практычны зьмест ленінскай нацыянальнай палітыкі. Пасьпяховае праядзеньне ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі ляжа ў большай меры замацуе сувязь працоўных усіх нацыянальнасьцяй БССР, будзе садзейнічаць іх інтэрнацыянальнаму выхаваньню—усё гэта яшчэ больш згуртуе працоўных для таго, каб, даючы рашучы адпор клясава-варожым шавіністычным элемэнтам, з посьпехам разгортваць сацыялістычнае будаўніцтва.

V. Увязаць перавыбары з правядзеньнем чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна быць цесна зьвязана з выкананьнем усіх чарговых палітычна-гаспадарчых задач. Вельмі часта мы чуем разважаньні аб тым, што няма часу праводзіць справаздачна-перавыбарчую кампанію, што рад іншых кампаній, як калектывізацыя, загатоўкі, мабілізацыя сродкаў, вывазка лесу, дарожнае будаўніцтва і г. д., зьяўляюцца неадкладнымі і перашкаджаюць разгортваньню працы па перавыбарах.

Мне нядаўна скардзіўся адзін таварыш, які выяжджаў для падрыхтоўкі справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў раён, што ў раённым выканаўчым камітэце на яго прапанову арганізаваць савецкую эстафэту кіруючы работнік РВК адказаў такім чынам: «Братка, у мяне галава забіта ўсялякага роду кампаніямі, а тут ты яшчэ лезеш з савецкай эстафэтай, няма часу займацца гэтым».

Гэта гаворыць аб тым, што той, хто адказвае такім чынам, не разумее ў чым сутнасьць справаздачна-перавыбарчай кампаніі, не разумее палітычнага значэньня гэтай кампаніі і падыходзіць да не правядзеньня фармальна, па-чыноўніцку.

У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі мы ўзьнімаем актыўнасьць мас на надзвычайную вышыню. Мы мабілізуем самыя шырокія масы навакол важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Мы арганізуем гэту актыўнасьць вакол пэўных практычных мерапрыемстваў, пэўных практычных задач бягучага часу.

Такім чынам перавыбарчая кампанія ня толькі ня можа быць процістаўлена іншым пытаньням, але, наадварот, яна павінна дапамагаць пасьпяховаму правядзеньню гэтых кампаній.

Кожны работнік сельсавету, райвыканкому, цэнтральнай установы пры падрыхтоўцы да справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінен выходзіць з таго, што справаздачна-перавыбарчая кампанія ня толькі не перашкодзіць яму ў выкананьні ўсіх іншых кампаній, але наадварот, дапаможа мабілізаваць масу на іх пасьпяховае выкананьне. Трэба ў часе гэтай кампаніі арганізаваць, накіраваць актыўнасьць мас на выкананьне прамфінплану, на далейшую арганізацыю калгасаў і ліквідацыю кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі, на выкананьне загатовак (загатоўкі збожжа, бульбы, ільну, сена і г. д.), на дапамогу выкананьню задач па ліквідацыі няпісьменнасьці, па вывазцы лесу, на мабілізацыі грашовых рэсурсаў і г. д.

Некаторыя таварышы гаварылі, што перавыбары саветаў папалі ў нявудалую пару, што перавыбары трэба будзе адкласьці для таго, каб закончыць усе іншыя кампаніі. Усе гэтыя гутаркі зьяўляюцца вынікам апартуністычнага неразуменьня палітычнай сутнасьці і значэньня справаздача-перавыбарчай кампаніі, і ім трэба даваць самы рашучы адпор. Справаздачна-перавыбарчая кампанія—гэта ёсьць мабілізацыя сіл для вырашэньня задач саветаў на даным адрэзку часу. У выніку справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсаветы, сельсаветы павінны рашуча павярнуцца тварам і стаць на чале непасрэднага выкананьня ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва рэканструкцыйнага пэрыяду.

Гарадзкія саветы павінны рашуча павярнуцца тварам да вытворчасьці, стаць на чале, быць арганізатарамі мас па выкананьні прамфінплану. Разам з гэтым саветы павінны павялічыць увагу да пастаяннага адвальненьня запатрабаваньняў рабочае клясы.

Сельсаветы, як асноўныя органы пралетарскай дыктатуры, павінны стаць на чале масавай калектывізацыі, павінны ажыцьцявіць кіраўніцтва калектыўным будаўніцтвам, павінны павярнуцца тварам да калгасаў, павінны дапамагчы калгасам зьнішчаць іх недахопы і памылкі.

Павярнуць сельсаветы тварам да выкананьня ўсіх палітычных і гаспадарчых задач, павярнуць сельсаветы тварам да актыўнага культурнага будаўніцтва, уцягнуўшы ў гэтае будаўніцтва калгаснікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў, праводзячы барацьбу супроць правага апартунізму ў саветах,—вось тыя задачы, якія павінны знайсьці практычнае праламленьне ў дачыненні да асобных умоў кожнага савету ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на барацьбу з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу ў сельсаветах.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на тое, каб мабілізаваць увагу працоўных мас да падрыхтоўкі адпору імпэрыялістычным інтэрвэнтам. Пытаньні **абароназдольнасьці Савецкай краіны і баяздольнасьці Чырвонай армії, падрыхтоўка Савецкай Беларусі, як прымежнай Савецкай Рэспублікі, да рашучай барацьбы супроць фашысцкіх армій у выпадку нападу з іх боку на СССР**—вось тыя практычныя задачы, вырашэньнем якіх павінны заняцца саветы ў адказ на інтэрвэнцкія імкненьні буржуазіі.

VI. Дзейнасьць саветаў—пад агонь самакрытыкі мас

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна праходзіць пад знакам самага шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі. Агонь самакрытыкі павінен быць накіраван на выяўленьне таго, у якой меры савет выконвае ўсе задачы сацыялістычнага будаўніцтва, што зроблена саветам у справе выкананьня прамфінплану, у справе калектывізацыі, абслугоўваньня рабочае клясы, абслугоўваньня батрацка-бядняцкіх груп і г. д.

Мы павінны выявіць таксама ўсе шкодніцкія, усе клясава-варожыя, чужыя элемэнты, якія прытаіліся ў саветах, якія дыскрэдытуюць саветы, для таго, каб, выявіўшы іх, выкінуць іх з саветаў, ачысьціць саветы ад клясава-варожых элемэнтаў.

Але, разгортваючы крытыку і самакрытыку, мы павінны ў той-жа самы час даць рашучы адпор спробам кулацкіх элемэнтаў выкарыстаць справаздачна-перавыбарчую кампанію ў мэтах дыскрэдытацыі саветаў. Мы ўсе добра ведаем, што кулацкія і іншыя варожыя элементы будуць імкнуцца да таго, каб падхапіць цэлы рад недахопаў, раздуць іх, праз гэта дыскрэдытаваць працаўнікоў саветаў, апаганіць у вачох шырокіх працоўных мас ідэю савецкай улады.

Таму—рашучы адпор гэтым кулацкім варожым элемэнтам у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

За апошні 1930 год мы маем вялізарны рост палітычнай актыўнасьці як рабочае клясы, так і ўсіх працоўных. Далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць замацаваньня і арганізацыі гэтай актыўнасьці ў саветах шляхам уцягненьня мас у практычную работу саветаў. У бягучую перавыбарчую кампанію саветаў трэба прыцягнуць, пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе авангарду—камуністычнае партыі, на справаздачна-выбарчыя **сходы 100 проц. працоўных.**

Мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку працы па перавыбарах **у нацыянальных раёнах.** Клясавая барацьба набывае асаблівую вострасьць сярод нацменшасьцяй. Клясава-варожыя элементы, кулакі, нэпманы і інш. імкнуцца ахапіць сваім уплывам бядняцка-серадняцкую частку вёскі нацраёнаў пад прыкрыцьцём «адзінства нацыянальных інтарэсаў». І вось у гэтых раёнах справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна быць так праведзена, каб яўрэйскі, польскі, латыскі, літоўскі пралетарыят, вядучы за сабой бядняцка-серадняцкую частку вёскі, даў рашучы адпор кулацкім, клерыкальным і нацманаўскім элемэнтам, замаскаваў у гэтых раёнах саветы, як сапраўдныя органы дыктатуры пралетарыяту.

Важным моментам у справе перавыбараў зьяўляецца складаньне сьпісаў пазбаўленых выбарчых правоў і **складаньне наказаў.** Агульная палітычная частка наказу павінна адбіваць асноўныя задачы генэральнай лініі партыі. Практычная частка наказу, якая зьвязана з непасрэднымі задачамі данага савету, павінна складацца ў адпаведнасьці з асноўнымі задачамі, практычнымі запатрабаваньнямі і рэальнымі магчымасьцямі саветаў.

На гэтым пытаньні кулак вельмі часта дае нам бой. Кулак імкнецца ўвесьці ў наказ яўна нерэальныя патрабаваньні, якія нельга выканаць, каб справакаваць саветы, каб на падставе гэтага дыскрэдытаваць саветы, паказваючы: «глядзеце, саветы шмат абяцаюць, але нічога ня выконваюць».

Таму больш увагі выпрацоўцы наказу!

Важнае значэньне ў справе выбараў будзе адыгрываць **ажыўленьне працы батрацка-бядняцкіх груп.** Недвацэнка гэтай працы кваліфікуецца партыяй, як апартунізм на практыцы.

Усямерна замацоўваючы кіруючую ролю рабочае клясы ў вёсцы і, у прыватнасьці, кіруючы ўплыў рабочых прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў, машына-трактарных станцый, трэба дабіцца узмацненьня працы з беднатой, арганізацыі груп беднаты пры ўсіх сельсаветах, каапэрацыйных органах, камітэтах сялянскай узаемадапамогі. Апіраючыся на калгаснікаў і беднату, трэба актыўнасьць выбарчыкаў вёскі накіраваць на ўзмацненьне саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту, на выкананьне бягучых гаспадарчых задач, на ўцягненьне ў калгасы новых атрадаў беднаты і сераднякоў, на рашучую барацьбу супроць кулацтва.

Пару слоў **аб ролі камсамолу** ў справе перавыбарчай кампаніі. Камсамол, як асноўны дапаможнік кампартыі і важнейшы прывадны пас партыі ў горадзе і вёсцы, заўсёды адыгрываў у перавыбарчай кампаніі надзвычай важную ролю. Актыўнасьць камсамолу будзе спрыяюча ўплываць на падрыхтоўку да перавыбарчай кампаніі, на правядзеньне самой кампаніі як праз удзел камсамольцаў на сходах, так і праз вылучэньне лепшых камсамольцаў на работу ў саветах. **100 проц. удзел камсамольцаў у перавыбарах саветаў, лепшых камсамольцаў на працу ў саветы**—вось тыя лёзунгі, з якімі камсамол павінен прымаць удзел у выбарчай кампаніі.

Сярод пытаньняў, на якіх, мне здаецца, трэба спыніцца, важнае месца займае пытаньне **аб уцягненьні працоўнай інтэлігенцыі** ў справаздачна-перавыбарчую кампанію. На гэтым пытаньні трэба спыніцца ў прыватнасьці ў сувязі з выкрыцьцём шкодніцкай, контр-рэвалюцыйнай арганізацыі буржуазных спэцыялістаў, а таксама ў сувязі з раскрыцьцём контр-рэвалюцыйнай групы беларускай нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыі.

Мы ўпэўнены ў тым, што асноўныя кадры працоўнай інтэлігенцыі БССР ідуць разам з рабочай клясай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, супро

Пастановы III сэсіі ЦВК БССР IX скліканьня

Аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі БССР на 1931 год

ПАСТАНОВА 3-й СЭСІІ ЦВК БССР ПА ДАКЛАДУ т. ГАЛАДЗЕДА

Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад старшыні Савету Народных Камісараў БССР тав. **ГАЛАДЗЕДА** аб кантрольных лічбах разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры Беларускай ССР на 1931 год, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Кантрольныя лічбы разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры на 1931 год прыняць Саветам Народных Камісараў Беларускай ССР, і яго пастанову на гэты пытаньні ад 13-га лістапада 1930 г. **ухваліць.**

2. Вынікі выкананьня другога году пяцігодкі (1929-30 гаспадарчы год) паказваюць, што рабочая клясa БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, апіраючыся на калгасьнае і батрацка-бядняцкія масы вёскі, у цесным саюзе з серадняцкім селяніствам, пры систэматычнай дапамозе пралетарыяту ўсяго савецкага Саюзу — насьпяхова пачынаюць сацыялістычнае наступленьне на ўсіх фронтах сацыялістычнага будаўніцтва і дасягнула вялізарных посьпехаў у індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі шляхам ле калектывізацыі.

3. Дзякуючы вялікаму творчаму энтузіязму, які быў праўлен з боку рабочае клясы ў адносінах выкананьня пляну народнай гаспадаркі, праўленьню новых сацыялістычных форм працы ў вытворчасьці (сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, арганізацыя сустрэчных прамфінпляну, пераход на сесьнерацыку і інш.),—другі год пяцігодкі па асноўных і рашаючых галінах значна перавыкананы, што зьяўляецца важнейшым фактарам выкананьня пяцігодкі за чатыры гады. Гэта таксама дае лаўную падставу прасківаць кантрольныя лічбы на трэці рашаючы год пяцігодкі ў павышаных разьмерах.

4. Насьпяховае сацыялістычнае наступленьне зьвязана з перамогай трудзящай сацыялістычнага будаўніцтва, якое разгортваецца на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы.

Насьпяховы рост сацыялістычнага будаўніцтва выклікае яраснае супраціўленьне адмаўваючых кляс. Капіталістычныя інтэрвенты-замежных дзяржаў і кулацтва ўнутры краіны, якое ліквідуецца як кляса, на базе суцэльнай калектывізацыі, імкнуцца затармазіць і сарваць ход пераможнага сацыялістычнага наступленьня.

Кулацтва і іншыя рэшткі капіталістычных элементаў унутры нашай краіны высоўваюць сваю агентуру з дробна-буржуазнай напаўнапал-дэмакратычнай інтэлігенцыі і з верхаўны старых спэцыялістаў праз якую арганізуюць шкодніцкую і контр-рэвалюцыйную дзейнасьць, накіраваную на зрыў насьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва і на зьвяржэньне пралетарскай дыктатуры.

Працэс так званай «прамысловай партыі» выявіў імкненьне замежных капіталістаў у саюзе з кулаком, ліквідаваць дыктатуру пралетарыяту, шляхам капіталістычнай інтэрвэнцыі, сарваць сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі першай ў сьвеце пралетарскай дзяржавы і ўзьняць новую імпэрыялістычную бойню.

Рабочая клясa, пры падтрыманьні пралетарыяту ўсяго сьвету, да канца выкрыла гэтыя імкненьні капіталістычных краін і вынесла свой пралетарскі прысуд над контр-рэвалюцыянэрамі і шкоднікамі.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР, від імя ўсіх працоўных мас, з **вялікім абурэньнем падае свой голас пратэсту** супроць імкненьня інтэрвентаў і іх агентуры—контр-рэвалюцыянэраў і шкоднікаў з «прамысловай партыі» ратаваць у крыўдзе рабочых і саюзу Савецкага Саюзу і запрадаць яго (Савецкі Саюз) замежным капіталістам. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт таксама пілкамандуючыца па судовага нагляду над шкоднікамі «прампартыі» і да настаўнікі Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР на гэтым пытаньні.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР ад імя рабочых мас, калгаснікаў і працоўнага селяніства заявляе, што ўсе працоўныя Беларускай ССР, якія пражываюць на рубяжы з капіталістычным сьветам, дадуць самы бязьлітасны адпор усім спробам замежных капіталістаў зрабіць напад на межы Савецкага Саюзу.

5. Выкрытая Дзяржаўнай Палітычнай Управай Беларускай ССР контр-рэвалюцыйная група беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якая зьяўляецца агентурай фашысцкіх інтэрвентаў, таксама накулася да рэстаўрацыі капіталізму у Беларускай ССР, зьвяржэньня пралетарскай дыктатуры і ўстанаўленьня дыктатуры памешчыкаў і капіталістаў.

Беларускія нацыянал - дэмакраты—пралетаўнікі беларускай сусьветнай буржуазіі, у часы Кастрычніцкае рэвалюцыі, як агенты буржуазіі, памешчыкаў і кулакоў, праводзілі адкрытую барацьбу з пяўстаўшым пралетарыятам, супроць Савецкай Беларусі, за буржуазную Беларускую Народную Рэспубліку, у саюзе з польскім фашызмам.

Пераможны ход Кастрычніцкай рэвалюцыі прывёў да разгрому контр-рэвалюцыйных арганізацый беларускіх нацыянал-дэмакратаў, ліквідаваўшы іх дзейнасьць на тэрыторыі Беларускай ССР, прывёў да ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту.

Рэшткі беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія яшчэ засталіся, а таксама былыя БНР-аўскія эмігранты, якія давалі абяцаньне савецкай уладзе сумленна дапамагаць сацыялістычнаму будаўніцтву, скарысталі гэтае давер'е савецкай улады і працоўных мас для працяту сваёй контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай дзейнасьці.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР з абурэньнем ганьбіць контр-рэвалюцыйную шкодніцкую дзейнасьць беларускіх нацыянал-дэмакратаў (Лёсікаў, Ластоўскіх, Некрашэвічаў, Цьвікевічаў, Смолічаў, Краскоўскіх і К°), заяўляючы, што ўсякім імкненьням фашысцкай агентуры будзе даны самы бязьлітасны і руйнуючы адпор.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР заклікае ўсіх рабочых, калгаснікаў, працоўнае селяніства і ўсю працоўную інтэлігенцыю, у адказ на шкодніцкую дзейнасьць контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, яшчэ больш узмацніць тэмпы індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі і на гэтай падставе ліквідаваць, як клясу, кулацтва—гэту апошнюю надзею сусьветнага імпэрыялізму.

6. Правільная палітыка камуністычнай партыі і савецкай улады ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня мабілізавала шырокія масы рабочых і працоўнага селяніства Беларускай ССР на разьвіцьцё культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

Працоўныя масы Беларусі, з якіх вялікая частка была няпісьменная да Кастрычніцкай рэвалюцыі, дабіліся ўзьвядзеньня і з посьпехам ажыцьцяўляюць усеагульнае абавязковае навучаньне. Рост індустрыялізацыі і калектывізацыі Беларускай ССР, рост вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, рост пралетарскай літаратуры і мастацтва стварылі значную базу для далейшага эканамічнага і культурнага ўзьдыму працоўных мас. Але контр-рэвалюцыйным і шкодніцкім элементам з асяродзьдзя беларускай нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыі не спадабалася насьпяховае ажыцьцяўленьне сацыялістычнай эканомікі і пралетарскай культуры, яны імкнуліся пашкодзіць гэтаму росту і навярнуць разьвіцьцё эканомікі і культуры на шлях нацыянал-дэмакратызму.

7. Кантрольныя лічбы, прынятыя Саветам Народных Камісараў Беларускай ССР, вызначаюць вялізарныя задачы ў галіне разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры на 1931 год. Іх насьпяховае выкананьне магчыма толькі пры яшчэ большым намаганьні ўсіх энэргетычных і матар'яльных рэсурсаў Савецкай Беларусі.

Адной з важнейшых умоў своячасовай падрыхтоўкі да насьпяховага выкананьня народна-гаспадарчага пляну на 1931 год зьяўляецца задача поўнага выкананьня пляну работ асобнага ўдарнага кварталу бягучага 1930 году. Таму Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР падкрэсьлівае перад усімі рабочымі, калгаснікамі, бядняцка-серадняцкімі масамі селяніства неабходнасьць абавязковага выкананьня ўсіх гаспадарчых пляноў ударнага кварталу. Не павінна быць ні аднаго заводу, фабрыкі, саўгасу і калгасу якія-б ня выканалі свайго квартальнага пляну.

8. Асаблівую ролю ў адносінах падрыхтоўкі і выкананьня кантрольных лічбаў на 1931 год адыгрывае скончаньне ў вызначаны ўрадам тэрмін ўсіх загатоўчых кампаній (збожжазагатовак, загатовак бульбы і асаблівa ільну).

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР абавязвае ўсе раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы максымальна мабілізаваць сваю ўвагу, а таксама і ўвагу працоўнага селяніства на выкананьне гэтых важнейшых эканамічных задач.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР адзначае, што дырэктывы ўраду па выкананьні фінансавага пляну, і асабліва пляну мабілізацыі сродкаў насьпіцтва да гэтага часу ажыцьцяўляліся зусім марудна, і што раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы ня ўжылі належных мер да выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Таму ўсім раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам даручаецца на бліжэйшы час у цэнтры сваёй увагі паставіць пытаньне мабілізацыі грашовых рэсурсаў, асабліва па зборы абавязковых і добраахвотных плацяжоў насьпіцтва, памятаючы, што своячасовае і поўнае выкананьне фінансавых пляноў зьяўляецца адным з асноўных элементаў ажыцьцяўленьня агульнага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Адначасова даручаецца ўсім раённым выканаўчым камітэтам увязаць работу па перавыбарчай кампаніі сельскіх саветаў з работай на выкананьні важнейшых гаспадарчых кампаній (загатоўкі, выкананьне прамфінпляну і мабілізацыя сродкаў) з тым, каб кампанія па перавыбарах саветаў адначасова зьявілася і масавай кампаніяй па выкананьні гаспадарчых задач.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

16 сьнежня 1930 г.

гор. Менск.

Зводны фінансавы плян і дзяржаўны бюджэт БССР на 1931 г.

(З ПАСТАНОВЫ ПА ДАКЛАДАХ т. т. МІКУЛІЧА і КАЛНІНА)

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР пастанаўляе:

I.

1. Ухваліць зводны фінансавы плян Беларускай ССР на 1931 г. па мерапрыемствах, якія непасрадна праводзяцца ўстановамі і арганізацыямі Беларускай ССР у агульнай суме **705,6 млн. руб.**, з якіх на народную гаспадарку—464,6 м. р., фінансаванае сацыяльна-культурных мерапрыемстваў—198,6 м. р., кіраўніцтва—28,9 м. р.

2. Вызначаючы аб'ём мерапрыемстваў, якія непасрадна праводзяцца ўстановамі і арганізацыямі Беларускай ССР, якія павінны фінансавацца за кошт агульна-саюзнага бюджэту і агульна-саюзных арганізацый у 1931 г. у суме 98,4 м. р., ухваліць меры, прынятыя Саветам Народных Камісараў па забесьпячэньні ўключэньня ў належачыя агульна-саюзныя пляны наказанага фінансаваньня.

II.

3. Зацьвердзіць справаздачу аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР за 1925-29 г. у наступных сумах:

а) па дзяржаўных даходах, што паступілі ў касы Дзяржаўнага Банку за час з 1-га кастрычніка 1928 г. да 30 верасьня 1929 г. уключна, 83.543.346 руб.;

б) па дзяржаўных выдатках за час з 1 кастрычніка 1928 г. да 30-га верасьня 1929 г. уключна 97.738.311 руб., у тым ліку па дзяржаўных выдатках праведзеных па бюджэце Беларускай ССР за кошт бюджэту Саюзу ССР—408.998 руб.

4. Зацьвердзіць зроблены Народным Камісарыятам Фінансаў за лік перавышэньня паступленьняў па даходах звышкапітарысны выдатак на перадачы мясцовым бюджэтам процантных адлічэньняў ад дзяржаўных даходаў у суме 2.342.156 руб.

5. Зацьвердзіць зроблены Народным Камісарыятам Фінансаў за лік астачы пескарыстаных крэдытаў па бюджэце звышкапітарысны выдатак на зварот даходаў, якія няправільна спягнаны ў мінулыя гады, у суме 235.722 руб.

Зацьвердзіць перавышэньне выдаткаў над даходамі ў суме 33.601 руб. у зьвязку з недапаступленьнем дагацыі з агульна-саюзнага бюджэту.

III.

6. Уносьлі ў зацьверджаны Саветам Народных Камісараў дзяржаўны бюджэт на 1931 г. наступныя зьмены:

Павялічыць даходы на 954.000 руб.
Паменшыць выдаткі на 225.550 руб.
(у тым ліку паменшыць на 10 проц. адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі цэнтр. устаноў).

З улікам вышэйпералічаных зьмен зацьвердзіць дзяржаўны бюджэт Беларускай ССР на 1931 г. у наступных сумах:

А. Па даходах: **У рублёх**

1. Плацяжы аграмаджанай гаспадаркі	92.823.000
2. Плацяжы неаграмаджанай гаспадаркі	16.602.000
Усяго па дзяржаўных даходах.	**109.225.000**

Б. Па выдатках:

1. Народная гаспадарка	121.992.730
2. Сацыяльна-культурныя мерапрыемствы	52.131.620
3. Кіраўніцтва	4.930.180
4. Запасныя і рэзэрвовыя фонды	1.500.000
5. Сродкі, якія перадаюцца ў інш. бюджэты	108.047.000
6. Расходы на аплату пазычкі, атрымай у 1928-1929 г.	800.000
Усяго дзяржаўных выдаткаў	**289.401.530**

7. Для абалянсаваньня дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР і папаўненьня тэй часткі рэспубліканскіх даходаў, якая перайшла ў агульна-саюзныя даходы, прасіць урад Саюзу ССР аб перадачы ў дзяржаўны бюджэт Беларускай ССР на 1931 год адлічэньняў ад падатку з абароту ў 180.176.530 р.

8. Даручыць Савету Народных Камісараў пасьля прахадженьня зводнага фінансавага пляну і дзяржаўнага бюджэту праз саюзныя органы ўдасканаліць лічбы фінпляну і бюджэту на 1931 г. у адпаведнасьці з пастановамі Саюзнага ўраду.

9. Адзначаючы напружанасьць фінансавага пляну і дзяржбюджэту Беларускай ССР на 1931 г. і выходзячы з неабходнасьці поўнасьцю забясьпечыць іх выкананьне, даручыць усім дзяржаўным установам і гаспадарчым арганізацыям, пры ажыцьцяўленьні паказаных па фінпляне і бюджэце мерапрыемстваў, выходзіць з бязумоўна поўнага выкананьня ўсіх колькасных і якасных паказальнікаў пляну адпаведных галін народнай гаспадаркі, захоўваць самую строгую эканомію у выдаткаваньні сродкаў і ўсімі спосабамі мабілізаваць класныя ўнутраныя рэсурсы гаспадарчых арганізацый.

Разам з тым, лічыць неабходным, каб усімі савецкімі, гаспадарчымі і грамадзкімі арганізацыямі была зьвернута максымальная ўвага на шырокае прыцягненьне грашовых сродкаў насельніцтва.

10. Надаючы аллізарнейшае значэньне ўдзелу шырокіх працоўных у фінансавай гаспадарцы, прапанаваць усім савецкім і гаспадарчым органам удзелам прафсаюзаў, шырока прыцягваць фінансавыя плянны на год сярод рабочых, а таксама калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас, прыцягваючы іх да абгаварэньня рацыйных фінансавых пляноў, шырэйшай адпаведных сыстэм, а таксама да сапраўднага ажыцьцяўленьня кантролю над выкананьнем фінансавых пляноў.

Аб мерапрыемствах па пераходзе ад акруговай сыстэмы кіраўніцтва на раённую і аб узмацненьні раённага і сельскага савецкага апарату

Пастанова 3-яй сэсіі ЦВК па дакладу тав. ХАЦКЕВІЧА

Заслухаўшы даклад тав. **Хацкевіча А. І.** аб мерапрыемствах па пераходзе ад акруговай сыстэмы кіраўніцтва на раённую і аб узмацненьні раённага і сельскага савецкага апарату, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР **адзначае:**

1. Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце і ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі за чатыры гады, у аснову якога пакладзена сацыялістычная індустрыялізацыя краіны, калектывізацыя сельскай гаспадаркі — пераход яе на шлях буйнога сацыялістычнага земляробства і ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі адбываюцца на падставе вялікага энтузіязму працоўных мас, што ўзварае нязуманы і ўсё ўзрастаючыя тэмпы работы. Шырокае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва і асабліва сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі перанесьлі центр цяжкасьці работы ў раён, што выклікала ліквідацыю округ, як лішняга зьвена ў савецкай сыстэме, і ўзмацненьне раёнаў як у сэнсе пашырэньня іх правоў і абавязкаў, перадачы ім функцый акруговых выканаўчых камітэтаў, так і узмацненьня іх больш моцнымі і кваліфікаванымі работнікамі.

Ліквідацыя округ і ўзмацненьне раёнаў значна наблізілі органы савецкай улады да шырокіх мас рабочых, батракоў, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства і садзейнічалі ўстанаўленьню непасрэднай сувязі раёнаў з цэнтральнымі органамі улады. Створаны лепшыя магчымасьці для насьпяховага вырашэньня і ажыцьцяўленьня на мясцох усіх задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Ліквідацыя округ дала магчымасьць узмацніць матар'яльную базу раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў, стварыць самастойныя бюджэты ва ўсіх сельскіх саветах, палепшыць матар'яльнае становішча раённых работнікаў і часткова сельскіх.

2. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР асабліва падкрэсьлівае, што пасьля ліквідацыі округ значна **павялічылася роля раёнаў і сельскіх саветаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.** Разгорнутае рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі выклікае шалёнае супраціўленьне клясавага ворага, абвастрэньне клясавай барацьбы. Кулацтва, якое ліквідуецца як кляса на базе суцэльнай калектывізацыі, імкнецца да зрыву ўсіх мерапрыемстваў савецкай улады ў вёсцы. Гэтае становішча патрабуе ад раённых органаў улады цьвёрдага правядзеньня палітыкі савецкай улады ў вёсцы, цьвёрдага кіраўніцтва ўсімі галінамі сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваньня калгаснага будаўніцтва на аснове добраахвотнасьці і рашучай ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі. Пры вырашэньні гэтых задач раёны павінны апірацца на рабочую прасловку ў вёсцы, на актыўнасьць калгаснікаў і батрацка-бядняцкіх мас вёскі, узмацняючы саюз з серадняком.

3. Вялізарныя задачы, якія стаяць перад раёнамі, патрабуюць ад іх поўнай перабудовы ўсёй работы, прычым асаблівай увагі патрабуюць да сябе **сельскія саветы.** Шырокі калгасны рух, які нябывалымі тэмпамі ўзьняўся ў пачатку гэтага году, выявіў, што значная частка сельскіх саветаў яшчэ не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія стаяць перад імі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, што выклікала нават частковыя перавыбары сельскіх саветаў і неабходнасьць узмацненьня іх лепшымі пралетарамі гораду і вёскі. Але і да гэтага часу некаторыя сельсаветы не перабудавалі сваёй работы, праявілі мала ініцыятывы і самадзейнасьці ў справе шырокай перабудовы народнай гаспадаркі. Прычынамі гэтага зьяўляюцца ня толькі недастатковае кіраўніцтва сельсаветамі з боку вышэйшых органаў улады, адсутнасьць з іх боку дапамогі ў наладжваньні работы, але і адсутнасьць у сельскіх саветах даволі падрыхтаваных кадраў. Арганізацыі цэнтральных і акруговых курсаў па перападрыхтоўцы работнікаў сельскіх саветаў, якая праводзілася дагэтуль, ахапіла пераважна пазначную колькасьць работнікаў сельсаветаў і дала невысокагульныя вынікі.

4. **Раённыя выканаўчыя камітэты** і саветы ў сваёй большасьці яшчэ да гэтага часу не скарыстоўваюць поўнасьцю даных ім правоў, слаба ажыцьцяўляюць новыя метады масавага ўцягненьня працоўных у работу саветаў, у сацыялістычнае будаўніцтва, як сэкцыі, камісіі і пры сельсаветах, сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, пасылка брыгад для паляпшэньня работы на асобных вучастках, абмен вопытам паміж раёнамі і саветамі і г. д.

Вырашэньне задач **узмацненьня раёнаў** шляхам накіраваньня ў іх 90 проц. акруговых работнікаў у асноўным выкананага, аднак, ёсьць выпадкі незадавальняючага, няроўнамернага разьмеркаваньня паміж раёнамі адказных работнікаў і спэцыялістаў. Раёны, якія знаходзяцца на далёкай адлегласьці ад чыгункі і ад буйных гарадоў, зусім слаба ўкамплектаваны работнікамі, асабліва спэцыялістамі.

Пытаньне **аб кадрах для раёнаў і сельсаветаў,** у сувязі з агульным недахватам работнікаў, патрабуе вялізарнай увагі ня толькі з боку цэнтру, але і абавязвае раёны больш шырока вылучаць савецкі актыў вёскі з ліку сельгасрабочых, батракоў, беднякоў і лепшых калгаснікаў на кіруючую работу ў сельсаветы і раённыя ўстановы. З лепшымі актывістамі павінна праводзіцца систэматычная работа па падрыхтоўцы іх да самастойнай кіруючай работы.

6. У сувязі з ліквідацыяй округ і ўсё больш узрастаючай вядучай роляй прамысловасьці ў сацыялістычнай перабудове народнай гаспадаркі павялічваецца значэньне **гарадзкіх саветаў,** іх арганізуючая роля ў справе паляпшэньня работы прамысловасьці і шырокага пралетарскага ўплыву на вёску. Гарадзкія саветы асноўнай сваёй задачай павінны паставіць мабілізацыю мас рабочых на выкананьне прамфінпляну і складаньне сустрэчнага прамфінпляну, на ўзмацненьне тэмпаў індустрыялізацыі краіны, садзейнасьць рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, разгортваньне новых форм масавай работы; бліжэй стаць да фабрык, да вытворчасьці, да прыгарадных сельскіх гаспадарак, як сродку лепшага забесьпячэньня рабочых.

Гарадзкія саветы ў пачатку 1930 году аказалі значную дапамогу ўзмацненьню нізавых органаў улады, калі яны паслалі лепшых сваіх членаў гарсаветаў — рабочых на сталую работу ў сельскія саветы. Гэта мерапрыемства, узмацніўшы кадры сельскіх саветаў, спрыяла дасягненьню буйных посьпехаў у галіне перабудовы сельскай гаспадаркі па сацыялістычных падставах. Вопыт пасылкі членаў гарсаветаў у вёску гарадзкія саветы павінны скарыстоўваць і ў далейшым для садзейнасьці пасьняхованым правядзеньню розных палітычна-гаспадарчых кампаній у вёсцы, для аказаньня дапамогі ў справе калектывізацыі, правядзеньня пасеўных і ўборачных кампаній, а таксама і асабліва для дапамогі вёсцы ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў.

6. **Пераход на раённую сыстэму кіраўніцтва** патрабаваў скарэйшага перакіраваньня работы цэнтральных устаноў і наладжаньня пастаяннай жывой і тэхнічнай сувязі іх са ўсімі раёнамі і раённымі ўстановамі.

Ня гледячы на гэта, ня ўсе яшчэ цэнтральныя ўстановы ўявілі сабе новае праўнае становішча раённых выканаўчых камітэтаў і неабходнасьць увязкі і ўзгадненьня з апошнімі мерапрыемстваў, якія праводзяцца імі ў межах раёнаў. Цэнтральныя органы яшчэ не наладзілі з раёнамі патрэбнай жывой сувязі. Некаторыя цэнтральныя ўстановы абмежаваліся наладжаньнем папяровай сувязі, пасылкаю шматлікіх абежнікаў і тэлеграм, якія не дапамагаюць узмацненьню працы раёнаў. Разам з гэтым наладжаюцца спробы з боку цэнтральных устаноў у адносінах да раёнаў дробнага рэгляментаваньня і апякунства.

Цэнтральныя ўстановы не зьвярнулі належнае ўвагі на камплектаваньне раёнаў спэцыялістамі, у выніку чаго, у радзе раёнаў зусім адсутнічаюць кваліфікаваныя работнікі. На мясцох мала ўвагі зварачаецца на паляпшэньне бытавых і жыцьлёвых умоў раённых работнікаў. З боку цэнтральных устаноў у кіраўніцтве раёнамі яшчэ няма патрэбнай дыферэнцыяцыі кіраўніцтва, пабудаванай на ўліку гаспадарчых асаблівасьцяй кожнага раёну.

Да гэтага яшчэ часу, ня гледзячы на ўжытыя меры па арганізацыі паштова-тэлефоннай, тэлеграфнай і радыё-сувязі раёнаў з цэнтрам і паасобнымі саветамі, справа гэта знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР, ухваляючы пастанову і мерапрыемствы прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР па ліквідацыі округ і па ўзмацненьні раёнаў, як асноўнага зьвяна сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, **пастанаўляе:**

1. Даручыць прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Беларускай ССР, у мэтах большага ўзмацненьня раёнаў, пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва, наближэньня савецкага апарату да працоўнага насельніцтва, паляпшэньня яго абслугоўваньня, ускіненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва працоўных мас, у бліжэйшы час перабудаваць цэнтральны апарат і мэтады яго кіраўніцтва раёнамі, перагледзець палажэньне аб цэнтральных і месцовых органах улады ў наступным напрамку:

а) цэнтральныя ўстановы і народныя камісарыяты павінны быць максымальна разгружаны ад апэрацыйных функцый; за імі ў асноўным павінны быць захаваны плянаваньне, кантроль, кіраўніцтва і інструктаж;

б) кіраўніцтва раёнамі павінна быць дыферэнцыявана ў дапасаваньні да поўных груп эканамічна-падобных раёнаў;

в) практыкаваць скліканьне рознага роду тэматычных нарад у плянавым парадку з прыцягненьнем асобных груп раёнаў на гэтыя нарады.

2. Прапанаваць усім народным камісарыятам і цэнтральным установам рашуча палепшыць систэму кіраўніцтва раённымі ўстановамі, наладзіць пастаянную жывую сувязь з імі і ўстанавіць пастаянае і систэматычнае інструктаваньне раёнаў шляхам пасылкі адказных інструктароў і інспэктароў, ажыцьцяўляючы праверку дыректыў і дапамагаючы ў рабоце раёнаў.

У мэтах зьніжэньня непрадукцыйных і шматлікіх абсьледваньняў, якія нэрвуюць нізавы апарат, забараніць усялякага роду абсьледваньні гарадзкіх, раённых і сельскіх устаноў без папярэдняга ўзгадненьня і дазволу з боку арганізацыйна-інструктарскага аддзелу прэзыдыуму ЦВК і Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі. Разам з гэтым пашырыць арганізацыю комплекснага абсьледваньня і вывучэньня раёну з адначасовым выездам у раёны ў форме аб'яднаных брыгад—прадстаўнікоў некалькіх народных камісарыятаў і іншых цэнтральных устаноў; пры гэтым мэтад комплекснага абсьледваньня павінен быць асноўным.

3. Даручыць прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, у мэтах стварэньня новых досыць падрыхтаваных кадраў работнікаў па савецкім будаўніцтве для раёнаў і саветаў, узмацніць работу існуючых пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце і Камуністычным Унівэрсытэце адпаведных курсаў па падрыхтоўцы савецкіх работнікаў. У гэтых-жа мэтах павінна быць папырана прыцягненьне нізавых савецкіх работнікаў у саўпартшколу.

У мэтах перакваліфікацыі існуючых кадраў нізавых работнікаў, арганізаваць у Менску пастаянныя цэнтральныя курсы па савецкім будаўніцтве, для раённых работнікаў, арганізаваць такія-ж пастаянныя міжраённыя курсы для работнікаў сельскіх саветаў, прыцягваючы на гэтыя курсы ў першую чаргу камсамольцаў, батракоў, лепшых калгаснікаў, беднякоў і рабочых-выдвуженцаў, аддаючы значную ўвагу падрыхтоўцы працоўных жанчын з гэтых сацыяльных груп. Прапанаваць райвыканкомам рашуча вылучаць на кіруючую работу лепшых актывістаў батракоў, беднякоў, калгаснікаў і сельгасрабочых, скарыстаўшы для гэтай мэты надыходзячую кампанію перавыбараў саветаў.

У мэтах паляпшэньня матар'яльнага становішча закіраваных у раёны работнікаў, лічыць неабходным захаваць за работнікамі, якія пераведзены з акруг у раёны, да 1-га чэрвеня 1931 году стаўкі зарплаты, якія яны атрымлівалі ў акруговых установах.

Даручыць раённым выканаўчым камітэтам наладзіць абмен вопытам сваёй работы з іншымі раёнамі як праз мясцовы і цэнтральны друк, так і шляхам непасрэднай між сабой сувязі, і больш шырока ўжываць ў сваёй практыцы мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

4. Прымаючы пад увагу асаблівае значэньне, якое з ліквідацыяй округ набывае сельсавет, неабходнасьць разгортваньня і ўзмацненьня яго дзейнасьці ў напрамку садзейнасьці і кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі: а) прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам зьвярнуць выключную ўвагу на работу сельскіх саветаў—паварот іх да калгаснага будаўніцтва, прыняць рашучыя меры да сапраўднага ажыўленьня дзейнасьці іх сэкцый, камісій, дапамагаючы сельскім саветам у штодзённай практычнай рабоце шляхам выезду для інструктаваньня і работы ў сельскіх саветах адказных работнікаў раёну; б) забясьпечыць упыў гораду на вёску як шляхам разгортваньня рабочага шэфства, так і прымацаваньня да сельскіх саветаў паасобных членаў гарсавету з рабочых і арганізацыі сыстэматычнага выезду рабочых брыгад у сельскія саветы; в) прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць арганізацыю і самастойнасьць сельскіх бюджэтаў, а таксама і наогул узмацненьне матар'яльнай базы саветаў.

5. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам, побач з агульным узмацненьнем дзейнасьці ўсіх саветаў, зьвярнуць асаблівую увагу на становішча і работу нацыянальных саветаў, улічваючы іх, параўнаўча з іншымі саветамі, нізначную тэрыторыю і таму слабасьць эканамічнай базы. Раённыя выканаўчыя камітэты павінны ўжыць усе захады да стварэньня ў нацыянальных саветах моцных самастойных бюджэтаў, каб праз узмацненьне матар'яльнай базы ўтварыць неабходныя ўмовы для ўдзьму палітычна-эканамічнага і культурнага ўзроўню нацменшасьцяй і лепшага іх абслугоўваньня. Забясьпечыць нацыянальныя саветы кіруючымі кадрамі, кваліфікаванымі работнікамі і сачыць за тым, каб уся работа нацсаветаў і абслугоўваньне імі насельніцтва праводзілася на яго роднай мове ў адпаведнасьці з дырэктывамі савецкай улады ў галіне нацыянальнай палітыкі.

6. Даручыць гарадзкім саветам, у зьвязку з пераходам на раённую сыстэму, зараз-жа перабудаваць формы і мэтады масавай работы ў адпаведнасьці з задачамі індустрыялізацыі краіны, выкананьня прамфінпляну, складаньня сустрэчных прамфінпляну і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, уцягваць пырокія пралетарскія масы ў работу гарадзкіх саветаў для ажыцьцяўленьня гэтых задач і належным чынам скарыстоўваць 7 сацыялістычным будаўніцтве творчы энтузіязм і ініцыятыву рабочых і працоўных мас гораду шляхам шырокага разьвіцьця сацспаборніцтва, стварэньня рабочых брыгад, выкарыстоўваньня ўдарніцтва, шэфства і г. д.

Прыняць рашучыя крокі да ўзмацненьня дзейнасьці сэкцый, паляпшэньня становішча матар'яльнай базы—бюджэтаў гарсаветаў, стварыць самастойны апарат гарсаветаў і дабіцца самастойнасьці ў рабоце ў вырашэньні задач сацыялістычнага будаўніцтва ў гарадох на падставе пастановы ўраду СССР і БССР. У мэтах паляпшэньня дзяржапарату, узмацненьня пралетарскага кантролю, пасьпяховай барацьбы з бюракратызмам і цяганінай мабілізаваць увагу рабочых на арганізацыю шэфства фабрык над паасобнымі ўстановамі, цесна ўвязваючы гэту справу з работай сэкцый гарсаветаў, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

7. Ухваліць прароблене Саветам Народных Камісараў Беларускай ССР пярэдняе эканамічнае раёнаваньне і разам з гэтым даручыць Дзяржпляну, з прыцягненьнем саміх раёнаў і адпаведных наркаматаў, працягнуць гэтае раёнаваньне і ўдасканаліць вывучэньне эканамічнага становішча раёнаў, напрамак разьвіцьця гаспадаркі і эканомікі ў мэтах паглыбленьня спэцыялізацыі гаспадарчага і эканамічнага разьвіцьця кожнага раёну.

8. Даручыць упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў у бліжэйшы час палепшыць абслугоўваньне тэлефоннай, тэлеграфнай, паштовай і радыё сувязьзю з гым, каб усе раёны і, у першую чаргу найбольш аддаленыя, абавязкова былі зьвязаны з цэнтрам праз тэлеграф і забясьпечаны радыё-ўстаноўкамі, а таксама прыняць меры, каб на працягу 1931 году была забясьпечана тэлефонная сувязь сельсаветаў з раёнамі.

9. Даручыць прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Беларускай ССР распрацаваць у бліжэйшы час рад канкрэтных мерапрыемстваў у выкананьне гэтае пастановы ў напрамку ўзмацненьня кіраўніцтва раёнамі і саветамі, паляпшэнь

НАЦ.-ДЭМАКРАТАЎ

Булак-Балаховіч—вось гаспадары контр-рэвалюцыянэраў—нацдэмаў

Сваёй контр-рэвалюцыйнай работай яны імкнуліся сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, імкнуліся абярнуць БССР у калёнію польскага фашызму, рыхтавалі для працоўных БССР—лёс Зах. Беларусі.

Школы разгромлены, вучыць дзяцей можна толькі на польской мове, усюды адноўлены царскія валасныя управы з гарадавымі і ўрадзікамі». (Ліст з Мазыршчыны. «Зьвязда», № 526/3).

«Установлен падатак з сялян — 5 пуд. жыта з кожных 10 пудоў ураджаю або запасу, па 3 руб. з дзесяціны і па 5 руб. з галавы жывёлы. Акрамя таго, сяляне павінны адшавіць аруйнаваныя маёнткі, калі нават гэтыя маёнткі зруйнаваны не сялянамі, а ў часе наступленьня немцаў або палякаў». (Ліст з Меншчыны. «Зьвязда», № 527/4).

«Сялян гоняць на 4-6 дзён у тыдзень з канём у падводы. Ад адсутнасьці корму коні падаюць. За работу ня плацяць. Усё насельніцтва гоняць капаць акопы, мыць падлогі ў казармах, убіраць вуліцы і г. д. Улады для забавы ўвялі мэдыцынскі агляд маладых дзяўчат, прычым «Арыштаваных колюць іголкамі, загаляюць іголкі над пазногці, б'юць гумамі, прутамі па голым целе... Інквізытар, нейкі Шыманскі, для «работы» якога ёсьць у менскай контрразьведцы асобны пакой, падвяргае арыштаваных самым жудасным катаваньням (упускае іголкі ў пяты і прымушае хадзіць, ушчамляе пальцы рук паміж дзьвярыма і г. д.). Нашы таварышы прыслалі з менскай турмы акрываўленыя хустачкі, сьведкі катаваньняў».

«Тав. Куляшынскі быў дастаўлен у больніцу апухшым ад пабояў. Твар нельга было разабраць: поздры і кончыкі вушэй былі праткнуты дротам. Праз некалькі дзён пашырыліся чуткі, што едзе чужаземная камісія: у тую-ж ноч Куляшынскага завялі і задушылі ў контрразьведцы»...

«У бабруйскім лягеры ваеннапалонных памірае штодзенна 40-50 т. т. ад недаяданьня, тыфусу і проснай колькасьці машыны, сукны, матораў, электрычныя прыборы, лямпы, мэдыкамэнты і г. д.» (№ 35. 9-1-20 году).

Вось чым жадалі пагандляваць радаўцы і вось сапраўдныя мэты іх барацьбы з рабочымі і сялянамі Беларусі. Як-жа, адбіралася тое, на чым так добра можна было «пагрэць рукі».

Вочы нац.-дэмакратаў разгараюцца. Ім ужо робіцца зайздрасьць, што так мала перападае з рук паноў у іх рукі. Сакрэтна ад Польшчы вядуцца перагаворы з францускім і амэрыканскім урадамі аб непасрэднай дапамозе войску Булак-Балаховіча і іншым атрадам БНР. Антанта абмяркоўвае гэта пытаньне на асобнай нарадзе ў Стакгольме, пасьля чаго глава францускага генэральнага штабу прыступае непасрэдна да справы і шукае шляхоў хутчэйшага выкананьня пляну барацьбы з бальшавікамі праз Раду БНР. Ён раіць прадстаўніком Рады БНР генэрал-лейтэнанту Корчак-Крыніцы-Васількоўскаму і палкоўніку Эльвэнірэну дагаварыцца спачатку з Эстоніяй і Латвіяй па гэтых пытаньнях.

Але наступленьне Чырвонай арміі спыняе на некаторы час гэту падрыхтоўку да новага наступленьня на Савецкія рэспублікі.

БССР зноў аднаўляецца. Белапольскія паны прымушаны «мірыцца». Доўга цягнуцца перагаворы ў Менску, пераносяцца ў Рыгу. Справа набліжаецца хоць-бы да часовага міру. Але гэта не дае спакою нац.-дэмакратам. Дзе толькі могуць, яны выступаюць супроць Савецкіх рэспублік, супроць заключэньня міру. Дасылаецца просьба Рады БНР да «мірнай канфэрэнцыі ў Парыжы». (15-IX-20 г. №434):

«3) Взять под французское командование или руководство, как существующие уже белорусские части, так и те, которые будут с'организованы в будущем...

4) Помочь Белорусскому Народу и его Правительству в его борьбе с большевистской оккупацией.

Ластовский — Председатель Совета Народных Министров Белорусской Республики, Ладнов —Министр Иностранных Дел, Валькевич — Министр Финансов, Езавитов — Государственный Секретарь».

Але ўсё-ж гэта патрабаваньне «асобнай» бээнэраўскай арміі — гэта толькі ўнутраная спрэчка паміж двума, не падзяліўшымі награбленага, капіталістамі: польскім і беларускім. Ці больш правільна сказаць, гэта піск пакрыўджанага беларускага капіталіста. Усё-ж гэта не разьбівала беларускага нац.-дэмакрата і польскага пана: пасьля заключэньня Рыскага міру — Польшча дае магчымасьць арганізаваць «глаўнакамандуючаму ўсімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Беларусі бацьку Булак-Балаховічу» узброеную сілу для новага нападу на БССР.

З усяго відаць, што клопаты Ластоўскіх, Цьвікевічаў і інш. праз Карчак-Крыніцу-Васількоўскага і Эльвэнірэна пры дапамозе Савінкава не прапада Рады Случчыны і як удзельнік Случкага паўстаньня... зазначыў, што паўстанцы ўвесь час атрымоўвалі аружную дапамогу ад палякаў...» (Архіў БНР, справа 114).

На гэтай нарадзе прысутнічаў Цьвікевіч «старшыня нарады», Ластоўскі і іншыя.

Такі крывавы шлях Ластоўскіх, Лёсікаў, Цьвікевічаў, Неграшэвічаў і іншых.

З гэтага агляду іх шляху выцякаюць наступныя тры вывады:

1) Нац.-дэмакраты ніколі і ня імкнуліся да ўстанаўленьня «самастойнай» Беларускай Рэспублікі. Яны думалі аб тым, «каб Расія была моцнай», вядома, буржуазная Расія. Беларускі нацыяналізм ім патрэбен быў для таго, каб прыкрыць свае контр-рэвалюцыйныя намеры ад мас, для апэканьня мас. А калі выстаўляўся лёзунг «Самастойнай Беларусі» ня толькі перад масамі, а і перад замежнымі дзяржавамі, то толькі для падрыхтоўкі «пляцдарму для барацьбы з бальшавікамі», бо «ад мяжы Беларусі ўсяго 250 кілёмэтраў да Масквы». Тут мы маем контр-рэвалюцыю пад маскай нацыяналізму.

2) Палітычны авантурызм нац.-дэмакратаў, якія кідаюцца ад лёзунгу «Беларускіх Саветаў» да манархіі, як «най больш падыходзячай формы праўленьня» (Мэморандум Аўстрыйскаму Імператару), паказаў свой твар у асобе **сваёй** ваеннай сілы, у асобе Булак-Балаховіча. Калі нац.-дэмакраты служылі толькі завесай і для немцаў і для палякаў пры іх акупацыях Беларусі, то, ў выступленьні Булак-Балаховіча мы бачым твар самых нац.-дэмакратаў. Які гэта твар — хай раскажуць тысячы ахвяр гэтага выступленьня.

3) Нац.-дэмакраты не адмовіліся ад сваіх мэтадаў 17-21 г. г. і тады, як прышлі ў БССР. Тут нельга забываці слоў Цьвікевіча:

«... Калі нельга правесьці свае праграму «ўдарам у лоб», то трэба праводзіць яе стараной. Важна, каб правільны быў прынцып. Калі прынцып справядлівы, дык рэшта становіцца толькі пытаньнем часу, дысцыпліны, тактыкі і натугі змаганьня». («Полымя» № 1 за 1926 г.).

Так што «тактыка» апошніх год — гэта правядзеньне стараной сваёй праграмы. А якая была «праграма» — добра вядома па 1917-21 г. г.

І яшчэ адзін вывад мы павінны зрабіць: гэта тое, што адзіна правільны шлях сапраўднага вызваленьня прыгнечаных нацый можа прынесьці толькі пралетарская рэвалюцыя, якою кіруе камуністычная партыя. Мы бачылі «вызваленьне» нацый з боку панскай Польшчы і «вызваленьне» з боку беларускіх нацыяналістаў праз іх генэрала — Булак-Балаховіча і іншыя «вызваленьні» на словах, а на справе ўсё гэта прыносіла толькі катаваньні і прыносіла яшчэ новыя закабаленьні для рабочых і сялян. І толькі камуністычная партыя паказала прыклад сапраўднага вызваленьня ўсіх народаў СССР!

А. Зюзькоў.

Грошай, гармат штыкоў—на задушэньне рэвалюцыі

(Пераклад з францускага)

ГЕНЭРАЛУ БАРТЗЛЮ
Гэпоўнакамандуючаму Саюзнымі арміямі на Поўдні Расіі

ГЕНЭРАЛ,

Я Вас вітаю ад імя Нацыянальнага Цэнтру Беларусі, як Галоўнакамандуючага Саюзнымі Сіламі на Поўдні Расіі, якія прыносяць нам ня толькі надзею, але, я-б сказаў, пэўнасьць хуткага вызваленьня ад гвалту бальшавікоў, якія ў працягу больш як 15 месяцаў зьнішчаюць наш край. Беларускі Нацыянальны Цэнтр, сфармаваны з большасьці грамадзянскіх і нацыянальных арганізацый Беларусі, узяў на сябе ў гэты цяжкі момант фармаваньне тутэйшага ўраду, таксама і арганізацыю беларускай арміі (заходняя армія), маючую на мэце, як і Ахвотніцкая Армія, змаганьне з бальшавікамі. Я лічу абсалютна патрэбным пазнаёміць вас з нашымі мэтамі і працай, з цьвёрдай пэўнасьцю, што вы не адмовіце ў Вашай дапамозе, гэтак каштоўнай у момант агульнага хаосу ў Расіі.

Беларусь складаецца з шасьці губэрань былой Расійскай Імперыі: Горадзенскай, Віленскай, Менскай, Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай (апошняй толькі частка). Гэтыя губэрні з насьленьнем каля 10.000.000 амаль што цалкам (каля 2/3) заняты бальшавікамі, якія ўсё захопліваюць нашы родныя землі ў надзеі аб'яднаньня з падобнымі сабе ў Нямеччыне.

Апрача рабункаў, зьдзекаў і іншых эксцэсаў, гэты рух нам здаецца яшчэ больш небясьпечным дзеля таго, што мы бачым фатальныя пасьледкі магчымага аб'яднаньня бальшавікоў расійскіх з бальшавікамі нямецкімі і, жадаючы папярэдзіць выкананьне гэтага адважнага праекту, мы як адзін кіруемся да прынцыпаў найхутчэйшых захадаў. Беларусь, адзеленая Украінай ад дружасных сіл Ахвотніцкай Арміі, ня можа ў сваім змаганьні з бальшавіцкімі бандамі, якія яе зьнішчаюць. Аднак, жменька людзей, каля 5-6 тысяч узброеных і арганізаваных Цэнтральным Горадзенскім Камітэтам грамадзянскіх арганізацый, яшчэ змагаецца з ворагам усіх правоў. Мы жадаем прыйсьці ім на дапамогу і вось дзеля чаго мы пачалі, пад высокім загадам Францускай Арміі, у Адэсе фармаваньне беларускіх збройных сіл, маючы на ўвазе прысутнасьць тутака некаторага ліку ўцекачоў з бацькаўшчыны. Галоўнакамандуючы Ахвотніцкай Арміяй, генэрал Дзянікін, назначыў камандуючым Заходняй арміяй генэрала Альфатэра, які прыехаў у Адэсу для фармаваньня сваёй армі. Ведаючы, што без магутнай дапамогі Францыі мы ня здолеем ніколі прысьці да канца гэтай цяжкай задачы, якая наложана на нас нашымі абавязкамі ў адносінах да будучай адбудаванай Расіі, цяпер-жа кіруемай незаконнай уладай і ў адносінах да Беларусі, як яе аўтаномнай часткі, я,ад імя Нацыянальнага Цэнтру Беларусі, зварачаюся да Вас, Генэрал, і выкладаю Вам тое, да чаго ён кіруецца ў сучасны момант:

1) Ваша дапамога, перад тым, як абыйсьці магчымыя перашкоды пры фармаваньні ў Адэсе Беларускай Арміі (заходняй);

2) безадкладны авансе патрэбных сродкаў на фармаваньне заходняй арміі згодна каштарысаў, якія Вам будуць прадстаўлены;

3) зброя і патрэбныя матэрыялы для заходняй арміі;

4) арганізацыя транспарту гэтых войск на Беларусь, дзе 40 тысяч чалавек будуць у гатоўнасьці ўстаць у рады;

5) дапамога Францыі ў тым, каб Польшча дазволіла нашым войскам арганізавацца на польскай тэрыторыі базу;

6) рэальная дапамога францускіх войск, якія ў невялікім ліку павінны быць размешчаны ў нашай армі, каб паказаць беларускаму народу сілу нашага аб'яднаньня.

За старшыню Нацыянальнага Беларускага Цэнтру, віцэ-старшыня С. НЕКРАШЭВІЧ
Агульны Сакратар Б. ІГНАЦЬЦЕЎ.

Адэса
13 студзеня, 1919 г.

Контр-рэвалюцыйныя генэралы—прыяцелі беларускіх нацдэмаў

Беларуская Народная Рэспубліка
НАРОДНЫ САКРАТАРЫЯТ
16 чэрвеня 1918 г.
№ 213
Места Менск

Часоваму Ураду Паўднёва-Усходняга Саюзу

Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар зьвярнуцца да Часовага Ураду Паўднёва-Усходняга Саюзу з ніжэй наступнай заявай.

Народны Сакратарыят мяркуе, што надзвычайна цяжкія ўмовы жыцьця беларускага народу і выключныя на труднасьці задачы, што ляжаць на яго ўрадзе, зусім зразумелы Ураду Паўднёва-Усходняга Саюзу і выклікаюць яго спачуваньне. Рада і Народны Сакратарыят БНР, якія выплі з нетрэў народу, ніколі ня здрадзяць народнай справе і, ня гледзячы на ўсе перашкоды, што стаяць на іх шляху, да канца выканаюць свой абавязак.

Народны Сакратарыят глыбока верыць, што беларускі народ, змучаны, эморавы і агалеўшы ад жорсткай вайны, якая на працягу трох год вялася на яго зямлі, сустране ў народах і ўрадах Паўднёва-Усходняга Саюзу сваіх прыяльнікаў, заўсёды гатовых прыйсьці яму на дапамогу.

Гэту заяву перадаць Ураду Паўднёва - Усходняга Саюзу даверяем надзвычайнаму нашаму пасланьніку Паўлю Віктаравічу **Трэмповічу.**

Старшыня Народнага Сакратарыяту і Сакратар Замежных Спраў ВАРОНКА.

За кіраўніка Справамі Народнага Сакратарыяту ЗАХАРКО.

Да панскай міласьці за дапамогай

№ 146
8-II-1920 г.
Рыга

Яго міласьці пану Галоўнакамандуючаму польскай арміяй

Пане Галоўнакамандуючы, як Вам, пэўна, вядома, у складзе Эстыйскай Арміі вёў барацьбу з бальшавікамі асобны атрад Беларускай Народнай Рэспублікі пад кіраўніцтвам генэрал-маёра Булак-Балаховіча. Замірэньне Эстыі з бальшавікамі прымушае Асобны Атрад знаходзіцца ў спакоі ў той момант, калі яшчэ ня ўся наша бацькаўшчына—Беларусь ачышчана ад бальшавікоў.

Каб не заставацца без баявой працы, Асобны Атрад зьвярнуўся да мяне з просьбай перавесьці яго на Беларусь.

Паведамляючы вас, пан Галоўнакамандуючы, аб гэтым, прашу, па моцы загаду Вашага аб фармаваньні беларускага войска на Беларусі, прадаставіць Асобнаму Атраду Беларускай Народнай Рэспублікі кавалак фронту на левым флянгу польскай арміі і ўзалежыць на Польскае Інтэндэнцтва павінасьць адпускаць для Асобнага Атраду ўсё яму патрэбнае.

Канчатковыя ўмовы па гэтым пытаньні маюць быць зроблены паміж Вамі, Галоўнакамандуючым Беларускімі войскамі палкоўнікам Капанацкім і ўрадам Беларускай Народнай Рэспублікі, якім я адначасна з гэтым пішу належныя рапарты, а таксама ў паразуменьні з Камандзірам Асобнага Атраду Беларускай Народнай Рэспублікі Генэрал-Маёрам Булак-Балаховічам.

Прымеце, Пане Галоўнакамандуючы, завярэньне ў вялікай да Вас пашане.

Шэф Місіі, палкоўнік К. ЕЗАВІТАЎ.
За сакратара Г. КАЗЯЧЫ.

аглядаюць не дактары» (Ліст з Барысаўшчыны. «Зьвязда», № 531/6).

А становішча рабочых?

У Менску было 75 процантаў беспрацоўных рабочых з тых, хто застаўся ў горадзе, на вестках менскіх буржуазных газэт. А большасьць пашла ў вёскі ці сядзела ў лягерах або турмах.

Толькі дарэмна А. Гарун выносіў ад імя «ўсіх беларусоў» падзяку пану. Рабочы і селяніи Беларусі сам за сабе гаварыў і гаварыў не салодкімі словамі, а **купімі партызан.**

Уся Беларусь пакрылася паўстанчымі вёрадамі. Вось барацьба аднаго з іх:

«Сяляне Рудабельскай воласьці (Бабруйскі павет) арганізавалі паўстанцкі атрад з 170 чал. пад кіраўніцтвам т. т. Салаўёва і Ляўкова. Атрад пастаянна зьнішчаў дробныя партыі назначаў ці браў іх у палон. Паляні, даведаўшыся аб гэтым, прыступілі да пометы: 1.500 штыхоў і 30 кулямётаў 16 студзеня акружылі в. Кавалі, запалілі яе і пачалі лоўлю. Гэта суправаджалася страляніпай. Дзесяткі два партызан адбіваліся: тав. Макавецкі забіў 10 легіянэраў раней, чым забілі яго. Былі акружаны і вёскі Лаватыкі, Карпілаўка, Новая і Старая Дуброва, Рудня, Смыковічы, Лёскі, Шкова і інш. На Дубовах крыла артылерыя, бо там заселі партызаны. Партызаны адбіваліся да апошняга і адышлі толькі тады, калі не засталося ні аднаго патрона. П'яная разбэшчанасьць легіянэраў суправаджалася рознымі жахамі: палілі дамы, нікога а іх не выпускаючы, кідалі ў дамы бомбы, ад чаго было забіта і згарэла шмат дзяцей і старых. Жанчын гвалцілі: так, у в. Карпілаўка **Сьліўчыну** (19 год) згвалціла 7 легіянэраў, прычым апошнія гвалцілі яе ўжо нябрытомную, **Параску Адынец** — 3 і г. д. Хто ня быў забіты — узялі заложнікамі каля 200 чал., з іх 12 чал. тут-жа расстралялі, а рэшту адправілі ў крэпасьць, у Бабруйск. Р-каў». («Зьвязда»).

Забілі, згвалцілі, спалілі, расстралялі... Добры паказальнік «слова» Пілсудскага, якое ён «трымае моцна». Добры паказальнік «вольнага і спакойнага жыцьця» А. Гаруна.

А калі і не забілі, **толькі арыштавалі**, ці лепш было?

та атручаныя газамі... У бараку на нарах ляжаць поўжывыя людзі, побач-жа і мёртвыя. Пад нарамі — пакой мёртвых, іх складваюць туды да таго часу, пакуль ня будуць заготаўлены ямы. Гэтым выігрываецца праца, бо пахаваньне оптам лягчэй, чым у розьніцу...» (з лістоў і расказаў абмеценых таварышоў. «Зьвязда» №№ 525-530).

Усе гэтыя жорсткія расправы з рабочымі і сялянамі Беларусі прыкрываюцца словамі нац.-дэмакратаў аб «вольным жыцьці», прыкрываюцца выдумкамі «аб зьверствах бальшавікоў». Газ. «Звон», «Беларусь» і г. д. ясна сьведчаць аб задачах нац.-дэмакратаў: **звонам аб вольнасьці прыкрыць жахі акупацыі.**

Але ні расправы белапалякаў, ні правалы камуністычных арганізацый і ў Бабруйску, і ў Слуцку, і ў Менску і г. д., ні салодзенькі «Звон», «братоў-беларусоў» ня спынялі барацьбы рабочых і сялян Беларусі супроць пана. Партызанскі рух мацнее, пашыраецца на ўсю акупаваную мясцовасьць.

У гэты час нац.-дэмакратам ці ёсьць час зьвярнуць увагу на гэтыя грабежніцтвы Беларусі. У іх больш пільныя справы: яны не павінны прапусьціць моманту пагрэбіць селяніна, а таму падаецца рапарт «Яго міласьці, пану Галоўнакамандуючаму польскай арміі», дзе вайскова-дыплёматычная місія Рады БНР просіць «не заставіць без баявой працы Асобны Атрад БНР» (Булак-Балаховіча) і «прадаставіць Асобнаму Атраду БНР кавалак фронту» (паслана 8-11-20 г.). Так просяць даць магчымасьць пажывіцца і «беларускаму» атраду Булак-Балаховіча. Але і самі радаўцы не заваюць: **прадаюць, дзе тольні мжона, па кавалках і гуртам Беларусь.** Нейкаму «г-ну майору Дирикусу» канцылярыя Рады народных міністраў рэкамэндуе наступных пасярэднікаў пры закупцы ільну ў сялян: **Душэўскі, Ластоўскі, Будзько, Гаворскі.** (Справы БНР, 11-VI-20 г. № 262). Так «міністры» робяцца «камівяжэрамі». Місія БНР, якая вышэй упамінаецца, прапануе сваім прадстаўніком праводзіць усюды наступныя палажэньні:

«Беларусь—лён, пянька, скіпідар, запалкі, шкло, скуры, лес, масла, гусі, сена, картошка, сьпірт і сахар.

Беларусь патрабуе ў неабмежаваю дарэмна. Ствараецца **«Добравольчая армія» пад камандай Булак-Балаховіча і «ідэёвым» кіраўніцтвам Б. В. Савінкава, якая пераходзіць з Польшчы мяжу БССР у пачатку лістапада 1920 г. і 10 лістапада забірае г. Мазыр.** На гэтым паходзе, арганізаваным сучаснымі нацдэмамі, неабходна спыніцца.

Добра памятаюць жыхары Пятрыкова, Калінкавіч, Мазыра і інш. мястэчак, забраных Булак-Балаховічам, што гэта банда прынесла з сабой. Разбой, гвалты, рэпінаваньні, аўрэйскія пагромы дайшлі да таго, што нават варшаўскія газэты пачалі выказваць супроць гэтага. Другога такога крывавага паходу цяжка адшукаць.

Савінкаў выдае адозву аб тым, што ён хутка забярэ Маскву і скліча ўсерасійскі Ўстаноўчы Збор.

Забраньне гораду Мазыра ўскружыла галаву «пераможцам». Ад імя беларускага палітычнага камітэту едзе ў Мазыр Адамовіч і Аляксюк. Яны заключылі з Булак-Балаховічам і Савінкавым наступную ўмову:

«§ 1. Беларускі палітычны камітэт і руская добравольчая народная армія, выходзячы з прызнаньня права на самавызначэньне народаў, прызнаюць факт незалежнасьці Беларускай дзяржавы. Канчатковая форма ўзаемадносін паміж Расіяй і Беларусіяй будзе апрэдзяляцца згодай паміж Устаноўчымі Зборамі рускім і беларускім ці ўрадамі, гэтымі ўстаноўчымі Зборамі назначанымі.

§ 2. Абодвы бакі выражаюць упэўненасьць, што формы гэтыя будуць дастойны абодвых вольных брацкіх народаў і будуць адказваць іх жыцьцёвым інтарэсам.

Наступныя пункты вайсковыя, не падлягаючыя разглашэньню».

(«Свобода», № 114).

Ня доўга ўдалося нацдэмам самастойна пакупацца ў крыві рабочых і сялян БССР: банды Булак-Балаховіча былі ў пачатку сьнежня 1920 г. выкінуты з меж Беларусі ў Польшчу.

Не давалі нац.-дэмакраты спакойна будаваць БССР, залечваць раны. Яны ў саюзе з фашыстамі Польшчы перакідваюць адну за аднэй банды на тэрыторыю БССР, арганізуюць кулацкія паўстаньні.

Адным з такіх кулацкіх паўстаньняў было Слуцкае, арганізаванае нац.-дэмакратамі пры падтрыманьні зброяй і з боку панскай Польшчы. Аб гэтым выразна сьведчыць «пратакол пасяджэньняў Беларускай нацыянальна-палітычнай нарады ў Празе». На трэцім пасяджэньні (28 верасьня 1921 г.) абгаворвалася пытаньне аб Слуцкім паўстаньні. Канфэрэнцыя выказала жаль з прычыны задушэньня паўстаньня, а доктар Паўлюкевіч — «прадстаўнік

ГЕНЭРАЛЬНЫ АГЛЯД ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

КАЛІ ВАРШТАТЫ КРУЦЯЦЦА У-ПУСТУЮ

Начны рэйд брыгад „Зьвязды“

НА МЕНСКІХ, ВІЦЕБСКІХ, БАРЫСАЎСКІХ І РЭЧЫЦКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ НАЧНЫЯ ЗЬМЕНЫ ЗАСТАЮЦЦА БЯЗ ТЭХНІЧНАГА КІРАЎНІЦТВА І КУЛЬТУРНА-БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ. ПРАСТОЙ МАШЫН І ВАРШТАТАЎ—ЗВЫЧАЙНАЕ ЗЬЯВІШЧА. НА БОЛЬШАСЬЦІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НЕ НАЛАДЖАНА ХАРЧАВАНЬНЕ НАЧНЫХ ЗЬМЕН

Гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пяцігодкі за чатыры гады—настойліва высоўвае задачу поўнай мабілізацыі ўсіх эканамічных рэсурсаў краіны і ў першую чаргу максымальнай загрузкі наяўнага прамысловага абсталяваньня.

У справе барацьбы за бальшавіцкія тэмпы разьвіцьця, за рацыянальнае і поўнае выкарыстаньне варштатаў і мэханізмаў адыгрываюць вельмі адказную ролю начныя зьмены, якія ўсё больш і больш уваходзяць у жыцьцё фабрык і заводаў.

Пытаньне аб усебаковым ахопе кіраўніцтвам начных зьмен, аб іх культурна-бытавым абслугоўваньні паўстае зараз, як неадлучная частка ўсяе работы партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый. Начныя зьмены высоўваюць перад «трыкутнікам» гэтых прадпрыемстваў рад асобных спэцыфічных задач, ад выкананьня якіх у вялікай ступені залежыць посьпех рэалізацыі гаспадарчых заданьняў як па кольнасных, так і па якасных паказальніках.

Якое-ж становішча з работай начных зьмен, са штодзенным кіраўніцтвам імі, з тэхнічным кантролем, з прыстасаваньнем заводзкіх арганізацый да запатрабаваньняў гэтых груп рабочых?

Мы вымушаны з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што ў гэтых адносінах становішча на большасьці прадпрыемстваў зусім нездавальняючае і патрабуе неадкладнага і карэннага паляпшэньня.

Абсьледваньне, праведзенае «Зьвяздой» у парадку генэральнага агляду на радзе фабрык і заводаў Менску, Віцебску, Барысава і Рэчыцы—з усёй відавочнасьцю гаворыць аб тым, што начныя зьмены яшчэ не набылі «права грамадзянства», і зьяўляюць самым паражальным месцам вытворчага арганізму, што ў адносінах кіраўніцтва работай начных зьмен паасобныя зьвяньні заводзкіх арганізацый скочваюцца на шлях простай апартуністычнай бязьдзейнасьці.

На радзе абсьледваных прадпрыемстваў начныя зьмены пакінуты бяз усякага кіраўніцтва з боку заводзкай адміністрацыі, партыйных і прафэсыянальных органаў. Як правіла, прадстаўнікі «трыкутнікаў» на начных зьменах—вельмі радкія госьці. Такое становішча ёсьць нават у тых выпадках, калі, як, напрыклад, на фабрыцы «Пралетарская перамога», у заўкоме 7 платных работнікаў. Ні дзяжурстваў, ні рэгулярных наведваньняў начных зьмен няма.

Тэхнічнае кіраўніцтва і кантроль над вытворчымі працэсамі—недапушчальна слабы. Цэхавая адміністрацыя, пакінутая сама сабе, скрозь і ўсюды зусім бязьдзейнічае. Факт-жа, што праверачная брыгада ў адным з цэхаў «Камунару» на працягу цэлай гадзіны ледзь адшукала майстра, а на «Пралетарскай перамозе» майстар у часе сваіх службовых абавязкаў проста палічыў магчымым спаць. Цэхавыя партыйныя і прафэсыянальныя органы адчуваюцца надзвычай слаба.

Недахопы адміністрацыйна-тэхнічнага кіраўніцтва, амаль поўная адсутнасьць палітыка-выхаваўчай работы сярод рабочых начных зьмен вядзе да вострага ўпадку працоўнай дысцыпліны, да наяўнасьці вялікай колькасьці прагулаў, нашай краіны.

спазьненьняў, уходу з работы раней тэрміну, да паніжэньня прадукцыйнасьці працы.

Арганізацыйныя непаладкі моцна б'юць па выкананьні прамфінпляну, нараджаюць у часе начных зьмен нічым не апраўданыя працяжныя прастоі варштатаў, работу на халастым ходу, павялічэньне браку і г. д. Непаладкі, неарганізаванасьць, выпадкі абураючых адносін да абсталяваньня, да падрыхтоўкі сырцу,—сапраўдны біч начных зьмен, які кладзецца цяжкім грузам на прамысловасьць.

Зусім дрэнна пастаўлена начная ахова прадпрыемстваў. «Налёт» паказаў, што на многія прадпрыемствы можна лёгка пранікнуць. Вельмі характэрна, што ў брыгад, якія правядзілі абсьледваньне, нідзе нават не патрабавалі пропуску. Міліцыя, якая нясе варту, часта згачынна адносіцца да сваёй работы. Чым інакш можна вытлумачыць той факт, што, напрыклад, на «Чырвоным мэталісьце» брыгадзіры, нікім незаўважаныя, маглі адкрыта вынесьці з прадпрыемства некалькі плугоў і піп. Злачынную нядбайнасьць міліцэйскіх пастоў у адзін голас пацьвярджаюць усе брыгады. Органы міліцыі павінны прыняць неадкладныя меры да ўзьняцьця дысцыпліны сярод работнікаў, якія нясуць адказную работу па начной ахове прадпрыемстваў.

Ня ў лепшым стаховішчы знаходзіцца і пытаньне процілапажарнай аховы.

Культурна - бытавое абслугоўваньне начных зьмен пастаўлена яўна нездавальняюча. Партарганізацыі і прафорганы яшчэ амаль нічога не зрабілі ў гэтых адносінах. Клюбы, культурныя ўстановы далёка не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі абслугоўваньня начных зьмен. Ня рэдка начныя зьмены застаюцца зусім у баку ад бягучага грамадзка - палітычнага жыцьця прадпрыемства. Так, на папяровай фабрыцы «Прафінтэрн» праводзяцца вытворчыя манэўры, але... гэта фактычна не датычыць начнае зьмены.

Харчаваньне начных зьмен у большасьці арганізавана значна горш, чым для дзенных. Ня рэдкі выпадкі, калі рабочыя застаюцца зусім без абеду. Моцна кульгае і работа буфэтаў.

«Налёт» выявіў, што начныя зьмены яшчэ далёка не занялі належнага месца ў рабоце многіх партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый.

З апартуністычнай недаэцэнкай ролі начных зьмен прамысловасьці, з бюракратызмам, з закасьцянеласьцю, няўменьнем перабудавацца ў адпаведнасьці з задачамі бягучага дня патрэбна жорсткая, бязьлітасная барацьба.

Імкненьням працаваць па-старому, пакіданьню прадпрыемстваў без палітычнага кіраўніцтва і тэхнічнага нагляду, спробам вытлумачыць усе недахопы «аб'ектыўнымі» труднасьцямі — трэба даваць самы рашучы адпор.

Партарганізацыі, прафсаюзы, адміністрацыйнае кіраўніцтва прамысловасьцю павінны неадкладна ўзяцца за адхіленьне прарываў, якія ёсьць у рабоце начных зьмен, давёўшы іх да адпаведнага ўзроўню з дзеннымі зьменамі. Гэтага патрабуюць інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва, ажыцьцяўленьне вызначаных партыяй тэмпаў разьвіцьця нашай краіны.

Начныя зьмены без кіраўніцтва

На фабрыкі Барысава ноччу можа прабрацца любы шкоднік

Брыгадай газэты «Зьвязда» сумесна з барысаўскім райпрафсаветам і лёгкай кавалерыяй фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» 23-га сьнежня быў зроблен налёт на начныя зьмены прадпрыемстваў Бярэзінскага камбінату і папяровай фабрыкі «Прафінтэрн».

Налёт быў зроблен з мэтай выявіць, як фабрычна-заводзкія арганізацыі і інжынэрна-тэхнічны персанал абслугоўваюць трэція зьмены, у якім становішчы знаходзіцца ахова фабрык.

Вось што выяўлена ў часе налёту.

На фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» ўжо некалькі дзён не даюцца гудкі перад сканчэньнем і перад пачаткам работы. Робіцца гэта з мэтай «эканоміі» пары.

У фанэрным цэху ў часе налёту за 20 хвілін да сканчэньня работы другой зьмены ўжо ня было ніводнага рабочага. Машыны круціліся ўпустую на працягу 20 хвілін да сканчэньня другой зьмены і 10 хвілін трэцяй зьмены, пакуль апошняя не прыступіла да работы.

80 чал. з упакавальнага цэху пайшлі з работы на 20-30 хвілін раней. У цэху застаўся загадчык і падмятальшчык.

На фабрыцы «Пралетарская перамога» з 7 платных работнікаў фабзаўкому ў трэцяй зьмене няма амаль ніводнага.

На фабрыцы ёсьць дырэктар і тры памочнікі, ня гледзячы на гэта, рэдка калі хто-небудзь з іх бывае на трэцяй зьмене.

Вытворчая парада ня раз прапанавала, каб у трэцяй зьмене на фабрыцы «Пралетарская перамога» быў дзяжурны мацнёр, **але прапановы вытворчай намісіі ня выконваюцца.** Між тым, бываюць выпадкі, калі ў трэцяй зьмене псуюцца машыны, **яны прастойваюць па 3-4 гадз.** да прыходу першай зьмены. У часе налёту ў скрынчаным цэху паламаўся вэнтылятар, які падае «шыбэр» у бункары. У выніку—**30 хвілін прастою** пакуль не зьявіўся мацнёр.

Некаторыя загадчыкі цэхаў па некалькі гадзін не паказваюцца ў цэху. Загадчык фанэрнага цэху т. Грандэ ў часе налёту спаў. Калі брыгада яго разбудзіла, Грандэ адказаў: «Што-ж, самарыўся, трэба адпачыць».

Ахова фабрык знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. У паасобных цэхах трансфэі завалены сьмецьцем і скрынкамі, што можа спрыяць пажару. Пажарнікі ніколі не знаходзяцца на сваім месцы. У фанэрным цэху, які асабліва зьяўляецца небясьпечным у пажарным становішчы, курыць. Пажарнікі не зварачаюць на гэта ніякай увагі.

Міліцыянэры вельмі нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў. Так, міліцэйскі пост, які стаіць ля насосная, працэсьцію брыгаду, не запытаўшы пропуску, а толькі напрасіў закурыць. Ні ў адным з цэхаў, за выключэньнем упакавальнага, у брыгадзіраў таксама не патрабавалі пропуску. Пры такім стане аховы на фабрыку можа прабрацца любы шкоднік.

Сталовая фабрыкі прыстасавалася да абслугоўваньня трэцяй зьмены. Абедзены перапынак — поўтадзіны. Сталовая спраўляецца за 20 хвілін выдаць усім абеды.

На фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» ўжо 5 дзён праводзіцца генэральны агляд прамысловасьці, але трэцяя зьмена аб гэтым нічога ня ведае.

* *

На папяровай фабрыцы «Прафінтэрн» брыгадай у часе налёту выяўлена, што трэцяя зьмена фактычна зусім не абслугоўваецца. Дырэктар фабрыкі і інжынэрна-тэхнічны персанал на трэцяй зьмене **ніколі ня бываюць.** На фабрыцы праводзяцца вытворчыя манэўры, але трэцяй зьмены яны, як быццам, не датычаць.

Ахова фабрыкі зусім дрэнная. Паваг каля варот міліцыянэр прапусьціў брыгаду, не патрабаваўшы пропуску, вакол фабрыкі зусім няма пастоў.

Забесьпячэньне рабочых у трэцяй зьмене не арганізавана, буфэт закрыты, ня гледзячы на тое, што трэцяя зьмена пачынае працу ў 10 гадз. вечара і можна было-б, каб буфэт да пачатку работы быў адкрыт.

На заводзе «Камінтэрн» па трэцяй зьм

ЗМАГАНЬНЕ ЗА КАЛГАСНЫ ПРЫЛІУ—

барацьба за посьпех другой бальшавіцкай сяўбы

Бязьлітасна біць па кулацкай агентуры, разгортваючы масавую работу за пашырэньне і рост калгаснага руху

Лоеўшчына

ПАКАЗВАЕ УЗОР БАЛЬШАВІЦКАЙ РАБОТЫ

У Лоеўскім раёне разгарнулася вялікая масавая работа па ўзмацненьні калгаснага прыліву. Лепшыя калгасы раёну выпусцілі спэцыяльныя брыгады вярбоўшчыкаў—ударнікаў на дапамогу іншым калгасам у разгортваньні масавай работы сярод адзінаасобнікаў.

КАЛГАСЬНІКІ-ВЯРБОЎШЧЫКІ Ў АПОШНІЯ ТЫДНІ СТВАРЫЛІ 12 ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП, ЯКІЯ ЯДНАЮЦЬ 158 ГАСПАДАРАК. АРГАНІЗАВАНА 7 НОВЫХ КАЛГАСАЎ І 2 ТАВАРЫСТВЫ ПА СУПОЛЬНАЙ АПРАЦОЎЦЫ ЗЯМЛІ. Новыя арганізаваныя калгасы яднаюць больш 200 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У ІСНУЮЧЫЯ КАЛГАСЫ ЎСТУПІЛА 225 ГАСПАДАРАК.

Разгортваецца работа па справаздачнасьці калгасаў перад адзінаасобнікамі. Там, дзе праведзены справаздачы калгасаў, адзначаецца вялікі рух сярод бядняцка-серадняцкіх мас, там беднякі і сераднякі становяцца на шлях калектывізацыі.

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА, напрыклад, які ў лістападзе налічваў 90 гаспадарак, пасьля праведзенай справаздачы аб'яднаў яшчэ 90 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калгас «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН» таксама па-бальшавіцку ўзяўся за ўцягваньне новых членаў. Колькасьць членаў гэтага калгасу за апошні месяц вырасла больш, як у тры разы (замест 20, цяпер ён налічвае каля 70 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак).

«ШЛЯХ ЛЕНІНА» з самага дробнага калгасу ў раёне ператварыўся ў буйны калгас, які налічвае цяпер больш 40 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Рэйкам партыі мабілізаваў партарганізацыю раёну на правядзеньне падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай весны. Пасобныя сельсаветы пад кіраўніцтвам парт'ячэек дабіліся вялікіх посьпехаў у справе калектывізацыі. Напрыклад, Пярэдзельскі сельсавет ужо калектывізаваны на 50 проц., Ручаўскі—на 39,3 проц., Уберкаўскі—на 31,1 проц.

На посьпехах, якія дасягнуты ў апошнія тыдні, мы ня спыняемся. Вядзецца ўпартая масавая работа па дасягненьні новых посьпехаў у справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

Райком КП(б)Б РУЗУМАЎ.
Райкалгассэкцыя САВОСТАЎ.

Зьняць праваапартуністычнае кіраўніцтва менск. райкалгассэкцыі

ПАСТАНОВА ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР АБ ПРАЦЫ МЕНСКАЙ РАЙКАЛГАССЭКЦЫІ І СТАНОВІШЧЫ КАЛГАСАЎ У РАЁНЕ

У выніку праваапартуністычнага кіраўніцтва калгасамі прыгараднага раёну з боку б. райсадкалгассэкцыі і бязьдзейнасьці райкалгассэкцыі арганізацыя на-вытворчае абслугоўваньне прыгараднага калгасаў настаўлена вельмі дрэнна.

Былым райсадкалгассэкцыям, а таксама райкалгассэкцыяй ня былі прыняты ніякія меры па ачысткі калгасаў і кіруючых органаў калгасаў ад сацыяльна-чужых элемэнтаў, якія разлагаюць калгасы (старшыня калгасу імя Варашылава—б. жандар, старшыня калгасу «Чырвоная зорка» — кулак, прыслужнік белапаляка).

Дапушчана грубейшае скажэньне важнейшых дырэктыў Калгасцэнтру. На загатоўках збожжа і бульбы плякы не даводзіліся да калгасаў. Ва ўсіх калгасах існуе цьвёрдая падзённая і намесячная зарплата. Ні ў адным калгасе не праведзена папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў. Сарваны плян парнікаводзтва і спэцыялізацыі калгасаў. Збыт прадукцыі арганізаван надзвычай дрэнна, з прычыны чаго калгасы панесьлі значныя матар'яльныя страты (пасьвана гародніны на суму да 10 тыс. руб.). Устаноўлена разбазраваньне б. райсадкалгассэкцыям сваіх сродкаў і безадказныя адносіны да іх спагнаньня, а таксама рад іншых фактаў безгаспадарчасьці.

1. За бязьдзейнасьць, няпрыняцьце мер для выпраўленьня праваапартуністычнай лініі, якая праводзілася на практыцы ў калгасным будаўніцтве былым райсадкалгассэкцыям, і нядольнасьць адыцыяніц кіраўніцтва калгасамі, **праўленьне менскай райкалгассэкцыі распусьціць.**

2. Даручыць т. **Балціну** 4-га студзеня 1931 г. склікаць раённую канфэрэнцыю калгаснікаў для абмеркаваньня пытаньняў замацаваньня прыгараднага калгасаў і выбараў новага праўленьня.

3. Выяўленыя матар'яны аб фактах безгаспадарчасьці ў калгасах і ў райкаапсаюзе перадаць судова - сьледчым органам для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці. Адначасова прасіць праўленьне Белсадсаюзу абгаварыць пытаньне аб прадаздольнасьці праўленьня райкаапсаюзу і прыняць належныя меры да лепшага абслугоўваньня калгасаў і рашучага выпраўленьня праваапартуністычнай лініі ў рабоце кіруючага складу райкаапсаюзу.

4. У сувязі з пашырэньнем Менскага прыгараднага раёну і павялічэньнем працанту калектывізацыі лічыць неабходным арганізаваць замест райкалгассэкцыі райкалгассаюз.

5. Прасіць гарсавет узмацніць штодзённае кіраўніцтва і кантроль за працай калгаснае сыстэмы ў прыгарадным раёне.

Старшыня Белкалгасцэнтру
МІЦЬКОЎ.

Клясавы вораг „кіруе“ калгасам

Гэтымі днямі адбыўся пашыраны пленум **Юравіцкага** райкалгассаюзу, на якім абмяркоўвалася пытаньне аб падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы і разгортваньні масавай работы, накіраванай на ўзмацненьне калгаснага прыліву. На гэтым пленуме выступіў старшыня калгасу **«Чырвоны араты» Бэнэнсон** з тыповай праваапартуністычнай тэорыяй. Бэнэнсон заявіў, што «плян сяўбы і калектывізацыі зьяўляецца контр-рэвалюцыйным пляном». Гэты апартуніст ня спыніўся на даных словах і выявіў свой кулацкі твар да канца, сказаўшы: «Заклікаю ўсіх удзельнікаў пленуму, якія разьехаліся па калгасах, пляну ня прытрымлівацца, а працаваць, як і раней».

«Як і раней»—гэта азначае нічога не рабіць, не кіраваць калгаснымі рукамі, не станоўшча на чале яго. На дзіва, што Бэнэнсон бязьдзейнічаў у справе арганізацыі новага прыліву да самага апошняга часу. Яго кулацкае выступленьне на пленуме паказала, што гэта бязьдзейнасьць не зьяўляецца выпадковай, а вынікае з яго праваапартуністычных поглядаў, поглядаў заядлага праціўніка лініі, якая праводзіцца партыяй.

Пленум выкрыў сапраўдны твар апартуніста Бэнэнсона і кваліфікаваў яго выступленьне, як вылазку кулацкага ідэолёга, аднагалосна прызнаўшы, што «плян сяўбы і памячэньне аб калектывізацыі 40 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў да пачатку весьнавой кампаніі рэальны».

Пленум знайшоў немагчымым палітпуць на кіруючай рабоце Бэнэнсона, які даказаў, што ён ня можа стаяць на чале калгаснага руху.

Даныя гаворацьць, што Бэнэнсон фактычна праводзіў лінію варожых элемэнтаў, якія пад яго крылкам працуюць у калгасе «Чырвоны араты». Гутарка ідзе аб некалькіх членах калгасу—былых гандляроў і спэкулянтах. Лінія гэтых антыкалгасных элемэнтаў невыпадкова часта супадала з лініяй старшыні праўленьня—Бэнэнсона. Яны разам з Бэнэнсонам не хацелі правесьці разьмеркаваньне ўраджаю так, як гэта вызначалася ў дырэктывах партыі і калгасных органаў.

Карыстаючыся падтрыманьнем старшыні калгасу, антыкалгасны элемэнт да таго абнаглеў, што на агульным сходзе калгаснікаў патрабаваў: «Калгаснікам-батраком вопраткі не даваць, бо яны гультаі. Пяцігодку за чатыры гады няхай выконвае рабочая кляса, а ня мы».

І да вылазкі Бэнэнсона на пленуме райкалгассаюзу Юравіцкаму райкому партыі было вядома сапраўднае становішча рэчаў у калгасе «Чырвоны араты», але ніякіх мер ня было прынята да аздараўленьня калектыву і зьняцьця з работы члена партыі Бэнэнсона, які даўно ўжо праводзіў праваапартуністычную практыку і быў на чале варожых элемэнтаў.

Ведаючы.

Балюк ня любіць крытыкі яго бязьдзейнасьці

Посьпехі калгасу **«Чырвоны пагранічнік» (Тураўскі раён)** былі-б значна большыя, калі-б яго кіраўніцтва адпавядала-б запатрабаваньням, якія прад'яўляе партыя для кіруючых работнікаў калгаснага будаўніцтва. **На чале калгасу стаіць тав. Балюк, які ня любіць самакрытыкі, крытыкі яго работы, правільней, яго бязьдзейнасьці з боку калгаснікаў.** З прычыны гэтай бязьдзейнасьці гаспадарка вядзецца так, што не ва ўсім можа служыць прыкладам для ваколічных адзінаасобнікаў. Даволі адначыць, што да гэтага часу ўраджай і прыбыткі не разьмеркаваны. Калгаснікі ня ведаюць, што яны атрымаюць у выніку першага году калектыўнае працы. Збожжа не абмалочана.

На віне кіраўніцтва засталося нескошанымі 50 гэкт. сенажаці. Інвэнтар не пастаўлены пад дах і псуецца.

Усе гэтыя факты зьяўляюцца таксама вынікам таго, што Балюк не прыслухоўваецца да парад лепшых калгаснікаў. Цікава адначыць наступны факт. Калі сакратар парт'ячэйкі зрабіў заўвагу старшыні, што трэчка гніе і трэба яе кутчэй малаціць, дык Балюк адказаў: «Не твая гэта справа. Не забывай, што ў цябе толькі 3-гадовы партстаж, а ў мяне пяцігадовы, і таму ня ўмешвайцеся ў мае справы, бо вы іх толькі псуеце сваёй самакрытыкай».

Неабходна пазбавіць калгас ад такога кіраўніцтва». Праца тав. Балюка не забясьпечвае належнага росту і разьвіцьцё «Чырвонага пагранічніка».

П.

„Адмовіць таму, што вышаў з калгасу“

Калектыўны рух акапіў шырокія бядняцка-серадняцкія масы сялянства Астрашыцка-Гарадзецкага раёну. За год калектывізаваны на 35 проц. сялянскіх гаспадарак, арганізаваны 52 калгасы. Аднак, необходна адзначыць, што скажэньне лініі партыі у пасобных месцах тармозіць разгортваньне калектывізацыі і ўмацаваньне існуючых калгасаў. Аб гэтым шмат гаварылі ўдзельнікі раённага зьезду калгаснікаў і груп беднаты, які адбыўся гэтымі днямі. Вось рад прыкладаў.

Калгас «Новы быт», Шапялоўскага сельсавету, ня хоча прымаць новых калгаснікаў. Калі адзін бядняк падаў заяву аб уступленьні ў калгас, старшыня калгасу напісаў на ёй такую рэзалюцыю: «Пасьля вышаньня зататовае збожжа і бульбы прыняць». У гэтым-жа калгасе моў месца і такі факт. Бядняк, які ў свой час вышаў з калгасу, зноў падаў заяву аб уступленьні. Але гэтаму бедняку ў прыёме адмовілі таму, што гэты грамадзянін выбыў з калгасу.

У калгас «Дружба» пралез такі «калгаснік», які раней моў 150 гэкт. зямлі.

Райкалгассаюз не спраўляецца са сваёй работай на абслугоўваньні ўсіх калгасаў. «Каб быў добры інструктаж, ня было-б зроблена столькі памылак» — сказаў адзін з дэлегатаў.

Зьезд, заслухаўшы даклад старшыні Калгасцэнтру тав. Міцькова аб задачах калектывізацыі, абвясьціў сябе ударным для далейшага правядзеньня калектывізацыі шляхам разгортваньня масавай работы сярод адзінаасобнікаў.

М. ФАРБЭРАЎ.

Поп... член калгасу

СЬМІЛАВІЧЫ. (Брыг. «Зьвязды»). Партыйна-камсамольская арганізацыя Драчкоўскага сельсавету нічога ня робіць на падрыхтоўцы да весьнавой сяўбнай кампаніі. Сем калгасаў і адзін саўгас стаяць у баку ад падрыхтоўкі да другой калгаснай весны.

Партыйная ячэйка нават не абмеркавала пляну падрыхтоўкі да пасяўнай кампаніі. У старых і новых калгасах пасяўныя фонды ня створаны. Не арганізаваны і сельска-гаспадарчы інвэнтар. Як быццам усё гэта мясцовых камуністаў не датычыць.

Масавая работа па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак адсутнічае. Арганізаваныя ў парадку сазанцёку самымі бядняцка-серадняцкімі масамі калгасы (пядаўна створаны два новых калгасы) засталіся без кіраўніцтва. **Парт'ячэйка не змагаецца па замацаваньні гэтых калгасаў,** праўляе ганебнейшую бязьдзейнасьць. **Парт'ячэйка дапусьціла прыём у калгас мясцовага попа, які разам з кулацтвам павёў работу па зрыве калектывізацыі і падрыхтоўкі да весьнавой кампаніі.** Зусім зразумела, што драчкоўскія гэрої праваапартуністычнай практыкі не даюць кулацтву адпору, а нават патураюць клясаваму ворагу. Аб гэтым сьведчыць наступны факт. У сельсавеце ёсьць шмат нявыкуленых кулакоў, якія індывідуальна не абкладзены.

Раённае кіраўніцтва зьяўляецца маўклівым гледачом гэтых агідных учынкаў, якія сталі магчымымі ў выніку адкрытай шкодніцкай дзейнасьці кулака і яго агентуры—правых апартуністаў з драчкоўскай парт'ячэйкі.

Фралоў.

Дзяржбанк пераходзіць у новы дом

Хутка скончыцца будаўніцтва новага дому Дзяржбанку. 3-га студзеня Дзяржбанк пяройдзе ў сваё новае памяшканьне. Прэзыдыум гарсавету пастанавіў разьмясьціць у старым памяшканьні Дзяржбанку—**Белкалгасцэнтр, гарадзкую ашчадкасу і Белдзяржсыдаведства.**

Усебеларускі зьезд Асоавіяхіму

У канцы студзеня 1931 году адбудзецца другі ўсебеларускі зьезд Асоавіяхіму. На парадку дня зьезду: даклад ЦС Асоавіяхіму СССР, справаздача цэнтральнага савету Асоавіяхіму БССР, даклад рэвізійнай камісіі, даклад вайсковага сэкцыі і інш. пытаньні.

Зьезд саюзу камунальнікаў

25-га сьнежня ў Беддзяржтэатры адкрыўся VIII усебеларускі зьезд саюзу камунальнікаў. На зьезд з усіх раёнаў БССР прыехала 70 дэлегатаў.

Зьезд заслухаў даклад ЦК саюзу камунальнікаў. З прывітаньнем зьезду выступіла дэлегацыя ад чырвонаармейцаў падшэфнага эскадрону №-га кавалерыйскага палка, — ударнікаў імя трэцяга году пяцігодкі.

Па Савецкай Беларусі

Сьвяткаваньне 13 гадавіны ВЧК-ДПУ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Сьвяткаваньне 13-гадзьдзя ВЧК-ДПУ і 10 гадзьдзя пагранвойска па Плешчаніцкім раёне прайшло з вялікім уздымам. Ва ўсе заставы і калгасы для правядзеньня сьвята выехалі прадстаўнікі раённых арганізацый. У м. Плешчаніцах адбылося ўрачыстае пасяджэньне, у якім прыняло ўдзел звыш 500 чалавек. На сьвята прыехалі дэлегаты ад калгасаў. Працоўныя м-ка Плешчаніцы пастанавілі ўзьняць хадайніцтва перад ЦВК БССР аб наданьні мястэчку імя тав. Менжынскага.

Па ўсім раёне сьвята адзначана новым прылівам у калгасы.

Залежы тавараў на 450.000 рублёў

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Спэцыяльная брыгада абсьледавала склады бабруйскага раённага спажывецкага таварыства. Выяўлены залежы тавараў на 450.000 руб. На складах ляжыць 500 мяхоў цукру, на 25.000 р. цукерак і інш. Работнікі спажывецкага таварыства ня прымаюць мер для рэалізацыі таварных залежаў. Звыш 2 месяцаў ляжаць тавары, вызначаныя для прэміраваньня здатчыкаў ільну. Характэрна, што сярод фондаў прэміраваньня ёсьць шмат тавараў, якія зусім няпрыгодны для гэтай мэты (дарагія польты і інш.).

Абутак, вызначаны для вясковых школ, ляжыць на складах і ня можа быць рэалізаваны з тае прычыны, што ЎВЕСЬ АБУТАК ПРЫГОДНЫ ТОЛЬКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ТРОХГАДОВАГА ЎЗРОСТУ.

Шмат тавараў ляжыць на складах у нераспакаваным выглядзе емаляванае начыньне, медныя катлы, вагі і г. д.).

Прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б) ЦВК і СНК БССР у сувязі з 13-гадавінай ВЧК-АДПУ і 10-ці годзьдзем пагранчасьцей

Урачысты сход супрацоўнікаў ДПУ БССР, прысьвечаны 13-годзьдзю ... ваньня органаў ВЧК-АДПУ і 10-дзьдзю пагранвойты, ШЛЕ ГАРАЧЭЙШЫЯ ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК КП(б)Б. Заклікаем ЦК КП(б)Б, што і надалей, ... з усёй рабочай клясай пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі будуць барацьбітамі за дыктатуру пралетарыяту і перамогу сацыялізму ва ўсім СССР.

Прэзыдыум сходу.

* * *

Ад №-скага УДАРНАГА ПАЛКУ НАТРАДУ ДПУ—ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР нашае чакісцкае прывітаньне.

Змычку пагранічніка з батраком, ... няком, калгаснікам і серадняком ... кіраўніцтвам ЦК мы ўзмоцнім на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі. ... ўзьняцьця якасьці аховы мяжы, ... гранічная пільнасьць з кожным днём ... новіцца ўсё больш непраходным ... ярам для нашых клясавых ворагаў. Зоркае вока рэзалюцыі—ВЧК-АДПУ ... на варце. На 14 годзе існаваньня ВЧК-АДПУ пад ленінскім кіраўніцтвам КП(б)Б яшчэ шчыльней згуртуем ... рады і вышэй узьнімем сьцяг ... жынскага.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б—правадыр працоўных мас Савецкай Беларусі!

* * *

Прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б) ... у сувязі з 13-ай гадавінай ВЧК-АДПУ і 10-ай гадавінай пагранчасьцей ... лалі таксама супрацоўнікі АДПУ ... бінскага раёну і Букцінскага ... частку.

Паведамленьні

— Дакладчыкамі па прапрадоўцы пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) па Кастрычніцкім раёне выпучаюцца: чыгунка—Каранеўскі, «Энэргія»—Рамановіч, «Бальшавік»—Гурло, абутк. ф-ка—Танхілевіч, зав. «Ударнік»—Капаплін, ЦІП — Ліпц, гута «Пралетары» — Міхайлаў, хэмфармазод — Цэнцыпэр, абутк. майст.—Пыжыкаў, пчацін. ф-ка—Пайбарэнка, Менхладабойня—Лойка, ф-ка імя Крупскай—Сахараў, «Чырв. Зорка» — філатаў, сьпіртазавод — Граноўскі, «Чырв. Хэмік»—Пракофева, пчотачн. ф-ка—Белашэўскі, лямц. ф-ка—Лінько, «Полыня рэвалюцыі» — Суворaў. Т. т. Нікольскі, Лабадаеў, Каменштэйн, Мар'ясіна, Эйдэльман, Хасьнін, Ракаў, Лампеў, Усьпенскі, Бялькоў, Губская, Клыс, Сякорская, Галанза—зьяўляюцца рэзэрвовымі дакладчыкамі.

СЕНЬНЯ:

— БДУ. У 18 гадз., у пам. чырвутку — агульны адкрыты сход яч. КП(б)Б тэхн. і навук. працаўнікоў БДУ.

— У 18 гадз., у аўд. № 1, прырод. корп., — партыйны сход калектыву КП(б)Б пэдфаку. У парадку дня—выніку апошняга пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

— ЦСПСБ. У 7 гадз. веч., у памяшк. ЦСПСБ (Дом Працы, пакой № 4) абудзецца нарада добраахвотнікаў арг.-інструкт. сэктару ЦСПСБ.

— Пэдгабінэт. У 19 гадз. — сход пастаўнікаў 2-х груп.

ЗАЎТРА:

— КУБ. У 19 з пал. гадз., у ленінск. аўд. (пак. № 25)—працяг спрэчак на дакладу т. Выдры аб чарговых задачах на філёзофскім фронце.

— Менскі Дом Чырвонай армії. У ... гада.—даклад т. Чапліна «Дзейнасьць Р. А. і дзейнасьць перадавых батальёнаў». 30-XII у 20 гадз.—даклад т. Пі... ка-Дзьмітрыева «Вайсковая падрыхтоўка за мяжой».

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, ... 2-га студзеня 1931 г., а 6½ гада. увечары (Савецкая, 55, пакой № 18) на пасяджэньні парткіўкі ЦКК КП(б)Б будуць разглядацца справы наступных таварышоў: **Мээровіч**, Сімы Абрамовны—Менск; **Хіліманава**, Платона Іванавіча—Пухавічы; **Гулько**, Антона Іванавіча—Вузда; Казей, Ганны Аляксеевны—Койданава; **Міціцко**, Яфіма Лаўрэнцьевіча—Менск; **Раева** Фрола Зьмітравіча—Менск; **Налецкага**, Васіля Пятрусёвіча—Менск; **Пікоўскага**, Міколы Сьцяпанавіча—Жыткавічы; **Вострыкава**, Янкі Пілавіча—Менск; **Сьмірнова**, Юркі Міхайлавіча—Масква; **Бароўскага**, Гіршы Шамавіча—Менск; **Зальцман**, Рахілі Цімавай—Менск; **Аляшкевіча**, Уладзімірскага Язэпавіча—Менск; **Мадорскага**, Якава Міхалёвіча—Менск; **Юдовіча**, Азроці Іцкавіча—Менск; **Флюксмана**, Міхаіла Кастэнтынавіча—Менск; **Чаквіна**, Міхаіла Кастусёвіча—Менск; **Кашчэва**, Васіля Андрэевіча—Менск; **Рыкава М. А.**—Койданава. Яўка паміненых т. т. абавязкова. Усе выдаткі на праезьдзе за свой кошт. На пасяджэньне павінны зьявіцца кратары ячэек КП(б)В г. Менску, ... знаходзяцца на вучоце выкліканыя ... варышы.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Тэатр імя Другі Дзяржаўны тэатр
СЕМЬЯ... сьнежня—для ПРАЛЕТСТУДУ
У. Вішнеўскі.
„ПЕРШАЯ КОННАЯ“
Трыумфальная Чырвонай арміі.
Пастаноўка Л. Тэзэраўскага. Мастак Е. Патрунін. Музыка Старжынскага. Фота для сьцэнавых дэкарацый Б. Свілінскі... Дырэктар І. Гітгарц. Хормэйстэр М. Ваўфэн. Гал. рэж. Л. Гурэвіч.
ТРК раніцы у 8 гадз. веч.

КІНО-ТЭАТР „КЫЗЫЛАЯ ЗОРКА“
ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР
ВАДЭВІЛЬНАЯ ПРАГРАМА
1. Лесныя замежны фільм СЯКЕРНІЦА і серыя ў 6 част.
2. Новы гукавы фільм у 2-х частках
Ста ўдым бальшавіцкім атрадам.
Пач. у 6 г., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. і 10 г. 30 м. веч. Касы з 5 ... веч

КІНО „КУЛЬТУРА“
Мастацкі фільм ТЕАР да ТВАРУ
Звыш праграмы Быт ... разгрузка фільм у праграмы 2-х част.
Гестроі Арага—сусьветны натаматыст і С. Бранкелі—аўтар-сатыры.
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.
КАСЫ—з 5 гадз.

КІНО „ПІОНЭРСКІ ПАЛАЦ“
Нар. арт. рэспублікі І. М. Масквін у карціне Нарадзіўся чалавек
драма ў 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.
Касы—з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары“
Новы мастацкі фільм Дачка сьвятога
драма ў 7 частках.
Звыш праграмы культур-фільм ЛЯТУН
Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. веч.
Касы адкрыты з 4 гадз. 30м.

Кіно „КІНЫ ПІЯНЭР“
Два фільмы ў адзін сэанс
1) БОГ ВАЙНЫ
2) ВАНЯ-ПІЯНЭР
Пачатак сэансаў у 1 г. дня і 3 г. дня
Касы адкрыты з 12 гадз. дня

КІНО „Спартак“
Выдатны фільм КРЫЖ І МАУЗЭР
драма ў 8 частках.
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. веч.
Касы—з 5 гадзін веч.

Азарыцкі РК КП(б)Б і РКК КП(б)Б
сьнежня 8 студзеня 1931 г.
НАРАДУ рабселькораў і насьценкораў раёну
у м. Азарычы, памяшк. гардому.
з парадкам дня: 1) Выніні асенняй і плян весьнавой с.-г. кампаніі і задачы рабселькораў. 2) Работа РСІ і ўдзел у ёй рабселькораў.
Пачатак нарады ў 12 гадз. дня.

ПРЫЁМ ЗАЎ на 4-месячныя КУРСЫ АРУ
па падрыхтоўцы БУХГАЛЬТАРОЎ для саўгасаў працягнуцца да 5 студзеня.
Прымаюцца бухгальтары, пом'ощнікі або рахункаводы з 3-гадовым стажам.
Курсантам выдаецца стыпендыя ў 85 р. у месяц.
Пасьля сканчэньня курсаў абавязковая праца ў саўгасах на менш 2-х год.
Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі АРУ (Савецкая, 55) штодзённа з 6 да 8 г. веч.
Прыём заяў на курсы рахункаводаў спынены.

СЕРАДА 31 СЬНЕЖНЯ
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Адкрыты спэктакль
Лепшая пастаноўка БДТ-2
ПЕРШАЯ КОННАЯ
У. Вішнеўскага.
Пастаноўка рэжысэра В. Тэзэраўскага.
Пралёт-расійская імпэрыялістычная армія,
ЦЫКЛЬ 1-шы—нямецкая вайна
„ 2-гі—рэвалюцыя
„ 3-ці—грамадзянская вайна.
„ 4-ты—і тут фронт.
Папярэдняя заўвага на білеты для фабкомаў, мясцкомаў і продаж для адзіночнапрацоўных праводзіцца ў канторы газэты „Зьвязда“, — Савецкая, 63,—3-ці паверх, тэл. 7-81.
Пачатак сэнсацыйнаю роўна ў 8 гадз. веч.

Для зьвяшчэньня чаргі і ўрэгуляваньні водпуску дроў пайшчыкам,
праўленьне МЦРК даводзіць да ведама, што з 27 сьнежня г. г.
ВОДПУСК ДРОЎ
будзе адпускацца выключна ПРАЗ УПАЎНАВАЖАНЫХ КААПКАМІСІЙ у наступным парадку:
упаўнаважаныя каапкамісій, выкліканыя ў першую чаргу, зьяўляюцца непасрэдна на склад МЦРК (па Бабруйскай вул.) і выплачваюць мэтавымі тавэнымі, крэдытам або гатоўкай за вызначаную колькасьць шурак дроў, якія адпускаюцца на кожным прадпрыемстве штодзённа. Атрымання ордэры на водпуск са складу дроў упаўнаважаныя раздаюць сваім пайшчыкам.
Для афармленьня трэба прыносіць каапкніжкі.
ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

28 сьнежня, у 8 гадз. веч., у залі пасьпаўжнільнай ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх, пак. № 40) адкрываецца
ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ БЕЛ. МБІТ
Парадак дня:
1) Вынікі пленуму УсеМБІТ і гарговыя задачы ІТС.
2) Папярэднія вынікі асобнага нарадцу і задачы 3-га году пяцігодкі.
3) Папярэднія вынікі перавыбараў ІТС.
4) Арганізацыйныя пытаньні.
Запрашаюцца члены пленуму Бел. МБІТ, члены бюро цэнтральных і мясцовых ІТС, старшыні вытворчых нарад, рабочы-ударнікі, гаспадарнікі і ўсе ініц.-тэхн. работнікі г. Менску.
Прэзыдыум Бел. МБІТ.

З 26 сьнежня пачынаюць да выдачы
НАБОРНЫХ КАРТАК
НАСТУПНЫЯ ЖАКТЫ:
3, 4, 11, 7, 15, 20.
Альфабэтны парадак выдачы ў жактах будзе вывешан па жактах
Праўленьне МЦРК

Уваравіцкаму райсельбанку (м. Уваравічы БССР. 3 клм. ад ст. чыг. 40 кв. вёрст да Гомелю) ПАТРЭБНЫ:
1 інспэктар-эканаміст з окладам 150 р. у м-ц.
1 бухгальтар (пам. сл. бухгальт.) — 120 р. у м-ц.
2 рахуноводы—75 р. у месяц.
Умовы пераезду, згодна арт. 82 КЗаП. Прапановы адрасаваць: м. Уваравічы, райсельбанк, або г. Менск Белкалгасбанк, аддзел кадраў.

КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.
29-га сьнежня працяг дыспуту „Рэлігія, навука і навуковыя прачытаўнікі“.
Для абмену думкамі запрошаны: Ярацунянц, Бистужэў, Бурстын, Бурак, Ванабрынскі, Вядра, Вергілін, Варшук, Гаўсман, Громар, Дыдырка, Змачынскі, Ленц, Лабэдзін, Мялях, Маўрыдзіядзі, Іксальскі, Пінкевіч, Чрыляжаеў, Розанаў, Сіроцін, Сітаркін, Цітоў, Царкін, Чарвакоў.
Заключнае слова праф. Бельфсона.
Пачатак у 6 гадз. веч. УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Аршанскі тэкстыльны тэхнікум абвяшчае, што
зімовы набор АДТЭРМІНОВАН.
Заняткі 1 студзеня не пачнуцца.
Аб часе набору будзе паведамлена дапаткова.
Дырэктар Арш. Тэкст. Тэхнікуму ГРЫКБЭРГ.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ“ прымаюцца да 2 гадз. дня

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ МОПР'у
пераносіцца на 30 сьнежня
АЎТОРАК 30 СЬНЕЖНЯ
З мэтай стварэньня адзінага гаркому МОПР'у ў г. Менску
Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР
склікае
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ МОПР'у
Клюб Гарсавету
Парадак дня:
1. Даклад аб выніках III-га Усебеларускага зьезду МОПР'у і чарговыя задачы—дакл. тав. ЦУДЗІН.
2. Выбары гаркому і рэвіз. камісіі.
Модус выбараў дэлегатаў:—на 10 членаў МОПР'у—1 дэлегат. Ячэйкі, якія налічваюць менш 50 членаў—выбіраюць 1-го дэлегата.
Для актывістаў-мопраўнаў ячэйкі МОПР'у могуць атрымаць запрашальныя білеты на канфэрэнцыю.
Мандаты і запрашальныя білеты будуць выдавацца ў ЦК МОПР'у штодзённа з 7-мі да 9-ці гадз. увеч.
ЦК МОПР'у просіць усе ячэйкі МОПР'у гор. Менску зараз-жа прыступіць да выбараў дэлегатаў на канфэрэнцыю, скарыстоўваючы для гэтай мэты ўсе сходы, прысьвечаныя перавыбарам саветаў, па лініі фабзаўмясцкомаў, а таксама і сходы, прысьвечаныя кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным.
ПАЧАТАК РОЎНА ў 7 гадз. увеч.
Пасьля дзелавой часткі—КІНО.
ЦК МОПР'у БССР.

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 50 к.

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЭДТЭХНІКУМ
з выкладаньнем на польскай мове
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО З 1-га ЛЮТАГА 1931 году
пры пэдтэхнікуме адкрываецца
6-МЕСЯЧНЫЯ ПЭДАГАГІЧНЫЯ КУРСЫ
з выкладаньнем на польскай мове.
На курсы прымаюцца асобы, якія скончылі 7-годкі ці школы сялянскай калектыўнай молазді (рабочыя, батракі і іх дзеці прымаюцца з асьветай 6-ці груп самадзейнасьці).
Заявы прымаюцца з 20 сьнежня 1930 да 15 студзеня 1931 г. у канцылярыі пэдтэхнікуму, Менск, Савецкая, 144.
Да заявы неабходна далучаць наступныя дакументы: аб сацыяльным і матар'яльным становішчы самога паступаючага і бацькоў у сучасным момант і да разьлікі, аб асьвеце, аб праве голасу, зацьверджаная анкета і аб стаўленьні ворагаў.
Рабочыя, батракі і іх дзеці атрымаюць агульнае памяшканьне і стыпендыю ў разьмеры 35 рублёў, таксама калгаснікі і іх дзеці і вясковая беднота. Стаўлоўка для студэнтаў знаходзіцца пры агульным памяшканьні. Пасьцельныя прыналежнасьці (сяннік, коўдру, падушку, прасьцірадла) павінны мець свае.
Нам. дырэктара пэдтэхнікуму СЯЛІЦКІ.

Менская кантора Саюзтрансу
даводзіць да ведама ўсіх грузаадпраўцоў, што
ДАСТАЎКА ГРУЗАЎ на тавары двор Саюзтрансу
ПАВІННА БЫЦЬ УЗГОДНЕНА
з менскай канторай Саюзтрансу.
Усе прывезеныя грузы без узгадненьня будуць адпраўляцца назад.
Менская кантора Саюзтрансу.

— ЛЕНІНГРАДСКАЕ АБЛАСНОЕ ВЫДАВЕЦТВА —
АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1931 год
„РЕЗЕЦ“
ДЗЕСЯЦІДЗЕННАЯ ЧАСОПІСЬ ПРАЛЕТАРСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.
Часопісь «РЕЗЕЦ» зьяўляецца майстэрняй для пачынаючага рабочага пісьменьніка.
Часопісь «РЕЗЕЦ» друкуе аповесьці, апавяданьні і вершы, напісаныя рабочымі заводаў і фабрык.
Часопісь «РЕЗЕЦ» рыхтуе кадры пісьменьнікаў з асяродзьдзя рабочай моладзі.
При часопісі «РЕЗЕЦ» ёсьць літаратурная кансультацыя, якая вядзе настаўную перапіску з пачынаючымі пісьменьнікамі, кіруе іх работай, вучобай і рэкамэндуе літаратуру.
Часопісь «РЕЗЕЦ» багата ілюструецца малюнкамі і фатаграфіямі.
Часопісь «Р